Тэма нумару: **Пратэстанты пратэстуюць.**

**№ 26 (336)** 18 ліпеня 2003 **www.nn.by**

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



# Новы профіль ураду

**Першай пастановай в.а. прэм'ера, гомельскага прамыслоўца Сяргея Сідорскага, стала вызначэньне канчатковых умоваў прыватызацыі «Белтрансгазу». «Газпрому», каб удзельнічаць у стварэньні сумеснага прадпрыемства, давядзецца цалкам забясьпечыць патрэбы краіны ў газе (у 2003 г. — 18,5 млрд куб.м, у 2004-м — 21,5, у 2005-м — 25 млрд куб.м, з 2010 г. — 33 млрд куб.м). Пры гэтым газ мусіць пастаўляцца па ўнутрырасейскай цане. Магчыма, якраз гэтая ідэя Сідорскага вывела яго ў в.а. прэм'ера. Калі так, дык галоўным сэнсам зьменаў ва ўрадзе выяўляецца захаваньне статус-кво ў адносінах з Расеяй і атрыманьне энэрганосьбітаў па льготных тарыфах. Задачы ж рэфармаваньня эканомікі і зьмяншэньня энэргетычнае залежнасьці ад Расеі перад міністрамі не стаяць. Зьмены ва ўрадзе аналізуе Віталь Сіліцкі і камэнтуе Пятро Краўчанка. Старонка 2.**



IREX-PROMEDIA

## Ліцэй дзеляць на чатыры

**Улады: калі будынку ліцэю да 25 жніўня не адрамантуюць, ліцэістаў выправяць вучыцца ў чатыры розныя навучальныя ўстановы. Бацькі: 1 верасьня навучэнцы разам з бацькамі прыйдуць да будынку ліцэю.**

9 ліпеня Менгарвыканкам прыняў пастанову пра ўтварэньне Менскага гарадзкога гуманітарнага ліцэю. Паводле словаў намесьніка міністра Казімера Фарыны, туды будзе прапанавана перайсьці ўсяму выкладчыцкаму калектыву. Аднак у тым разе, калі будынак на вул.Кірава, 21 не пасьпеюць адрамантаваць да 25 жніўня, ліцэісты пачнуць новы навучальны год «на іншых пляцоўках»: 4-ы курс — у ліцэі БДУ, 3-і — у гімназіі №9, 2-і — у гімназіі №23, 1-ы — у гімназіі №4.

Улада перасьледуе тры мэты. Па-першае, расьцярушваецца дзіцячы калектыў, зьнікае супольнасьць дзеяньняў, што так напалохала чыноўнікаў падчас вулічных акцыяў у чэрвені. Па-другое, цяперашні пэдкалектыў ліцэю застанецца «па-за гульнёй». Сапраўды, ці ж зручна будзе выкладчыку прачытаць першую лекцыю ў гімназіі №4 у Кунцаўшчыне і патрапіць на другую ў гімназію №23 на плошчы Якуба Коласа? Значыць, заняткі ў навучэнцаў будуць весьці іншыя выкладчыкі… Па-трэцяе, зьнішчаецца непаўторны «ліцэйскі дух».

Ані бацькі ліцэістаў, ані самі навучэнцы ня маюць намеру мірыцца з такім парушэньнем іхнага права на адукацыю. «Мы маем права выбіраць установу адукацыі. Калі нашых дзяцей бяз нашага ведама перавядуць у іншую школу і парушаць гэтым Закон, мы будзем падаваць у суд», — казалі бацькі на сходзе. Пакуль жа было вырашана, што 1 верасьня навучэнцы разам з бацькамі прыйдуць да будынку ліцэю.

**Аркадзь Шанскі**

## Піўное рэчышча для эўрапейскіх крэдытаў

**Лёс «Крыніцы» акрэсьліўся: 3 млн 123 тыс. 738 акцыяў менскага бровару перадалі на пяць гадоў у даверчае кіраваньне «Прыёрбанку». Ініцыятыва зыходзіла ад банку.**

Сказаць, што дзяржава аддала найбуйнейшаму прыватнаму банку краіны кантрольны пакет, значыць не сказаць нічога — цяпер «Прыёрбанк» трымае 80,75% акцыяў «Крыніцы». Разам з акцыямі «Крыніцы» ўрад перадаў «Прыёрбанку» непрыемны абавязак весьці перамовы з «Балтыкай» пра рэструктурызацыю крэдыторскай запазычанасьці менскага бровару. Ад 2001 г., ледзьве «Крыніца» зрабілася адкрытым акцыянэрным таварыствам, расейская кампанія «Балтыка» пачала «сватацца», спадзеючыся атрымаць кантроль над «Крыніцай», аднак атрымала нарэшце гарбуза. У бюджэце менскага бровару застаўся буйны расейскі крэдыт. Цяпер банк будзе дамаўляцца, каб сьпісаць цалкам ці хоць бы зьменшыць аб'ём таго крэдыту.

Але тут справа ня толькі ў няверхнутай пазыцыі. Цяпер штогод беларус выпівае 23,7 л піва. У 2005 г. кожны з нас будзе спажываць ужо 51 л бурштынавага напою ў год (прынамсі, так вырашылі «ўгары»). Пры гэтым імпартная прадукцыя мусіць складаць толькі 10% ад усяго піва, што прадаецца ў краіне. Урад марыць, што праз тры гады нашыя бровары будуць варыць 72,4 млн дэкалітраў піва штогод замест цяперашніх 31,1 млн. І сапраўды: сёлета ўпершыню ад 1998 г. назіраўся рост вытворчасьці беларускага піва. Але для буйнога зруху бровары павінны атрымаць 111 млн даляраў інвэстыцыяў. «Прыёрбанк» разам зь іншымі беларускімі банкамі мусіць уклясьці ў броварную вытворчасьць 75 млн цягам некалькіх гадоў. Абраныя бровары атрымаюць банкаўскія крэдыты на льготных умовах: рублёвыя — па стаўцы рэфінансаваньня Нацбанку (31% гадавых), валютныя — пад 10%. «Прыёрбанку», апроч «Крыніцы», аддадуць у даверчае кіраваньне 85% акцыяў бровару «Берасьцейскае піва», 75% — «Белсоладу» ды кантрольны пакет Полацкага бровару, які яшчэ не пасьпелі зрабіць акцыянэрным таварыствам. Іншыя бровары мусяць самі шукаць для сябе крэдытораў. А вось ААТ «Лідскае піва» ды «Аліварыя» ня маюць дзяржаўнай долі ў статутных фондах — не атрымаюць і крэдытаў. Малыя ж бровары калі не зачыняць, дык пераабсталююць на выраб газаваных напояў ды квасу.

Той факт, што лёс беларускага піва даверылі «Прыёрбанку», шмат пра што кажа. Яго кантрольны пакет належыць аўстрыйскай банкаўскай групе «Raiffeisen». Заходнеэўрапейскі капітал трывала бярэцца за беларускія прадпрыемствы. І робіць рынак бязь лішніх PR-акцыяў ды мэдыяскандалаў.

**Алесь Кудрыцкі**

### FM-станцыі на кручку ўладаў

**Кожны панядзелак міністар інфармацыі Міхаіл Падгайны зьбірае заснавальнікаў 13 FM-станцыяў на «планёрку» ды «рэкамэндуе» тэмы навінаў, якія варта асьвятляць.** Станцыі не пярэчаць. Толькі ў адным выпадку (тычыцца гэта радыё «Рокс») радыё існуе цалкам на прыватныя сродкі, усе астатнія маюць у статутным фондзе дзяржаўную долю. Міністэрства раіць браць інфармацыю з афіцыйных крыніцаў — БелТА, «Інтэрфаксу», паведамленьняў прэс-службаў.

### Новы арышт на МТЗ

**У сераду арыштаваны намесьнік дырэктара Менскага трактарнага заводу Іван Літошка.** Яму інкрымінуюць пастаўку 400 трактароў без папярэдняй аплаты праз падстаўную фірму. Чыноўніку пагражае да дзесяці гадоў турмы. На гэтай пасадзе І.Літошка адпрацаваў каля году.

### У Віцебску абвесткі па-беларуску

**Цяпер прыпынкі ў віцебскіх тралейбусах абʼяўляюць у запісе па-беларуску.** Начальнік трамвайна-тралейбуснага ўпраўленьня Васіль Паўлючкоў зьбіраецца ў хуткім часе «зьбеларусізаваць» і трамваі.

### Страты спэцслужбаў

**Кіраўнік расейскай разьведкі Валянцін Карабельнікаў у інтэрвію газэце «Известия» прызнаў,** што болей за 300 афіцэраў ГРУ загінулі ў Чачэніі за апошнія чатыры гады. Разам з расейскімі вайскоўцамі яны вядуць барацьбу з партызанамі-незалежнікамі.

**БТ**

# Антыкрызысны в.а.

Прэм’ер у беларускай вэртыкалі ўлады — гэта зусім не кіраўнік ураду. Казаць аб наяўнасьці ў Савету Міністраў урадавых паўнамоцтваў можна было б, калі б гэты орган хоць бы меў права вызначаць стратэгію эканамічнага разьвіцьця краіны ды калі б у прэм’ера было права падбіраць сабе кабінэт. Сёньня такіх правоў няма, а сам урад — калегія чыноўнікаў пры прэзыдэнту, дзе замена любога вінціка, нават прэм’ера, не выклікае нейкіх праблемаў. Таму і няма ніякай бяды, што перад жнівом здымаецца ўвесь сельскагаспадарчы блёк, — сельскай гаспадаркай і так ёсьць каму займацца, а жніво ў Беларусі — гэта хутчэй палітычная, а не эканамічная кампанія.

Але агульнае правіла безуладнасьці ўраду мае пэўныя выключэньні. Лукашэнка можа прызначыць адносна «моцнага» прэм’ера, калі самому яму сытуацыю ўтрымаць цяжка. «Слабы» Генадзь Навіцкі быў ідэальным прэм’ерам для пэрыяду палітычнага і эканамічнага застою, які, здавалася б, настаў пасьля выбараў-2001. У гэтым яго поствыбарнае (і, хутчэй за ўсё, дарэфэрэндумнае) прэм’ерства чымсьці нагадвала пострэфэрэндумнае і давыбарнае прэм’ерства Сяргея Лінга. Улада не зьбіралася што-небудзь мяняць у сваіх базавых падыходах да эканамічнай палітыкі. Патрабаваўся і адпаведны прэм’ер — без ініцыятывы, значных бізнэс-сувязяў і намёку на палітычныя амбіцыі. Прэм’ер, які б падтрымліваў статус-кво, вызначаны Лукашэнкам, настолькі доўга, наколькі гэта магчыма. А пасьля перайшоў бы ў катэгорыю «ахвярных авечак».

Лінг пратрымаўся даўжэй, бо яму пашчасьціла быць прэм’ерам «эканамічнага цуду», калі эканоміка за два гады вырасла (паводле афіцыйных зьвестак) ажно на 20%. Яго дабілі наступствы жнівеньскага крызысу, і перад марафонам выбарчых кампаній Лукашэнку спатрэбіўся чалавек, які б здолеў стабілізаваць эканоміку акурат да верасьня 2001 г., пры гэтым палітычная роля такога прэм’ера была б выключаная. Ярмошын быў ідэальнай фігурай. Нядрэнны бюракрат, ён здолеў выправіць найбольш абсурдныя памылкі ў эканамічнай сфэры. Да таго ж, родам з Расеі, ён паводле азначэньня ня мог канвэртаваць свой патэнцыял і сувязі ў палітычны капітал. Шлях да прэзыдэнцтва яму быў зачынены. Маўр зрабіў справу і пайшоў пасьля выбараў. Яго наступнік выканаў бы ўскладзеную на яго задачу кансэрвацыі становішча, калі б мог займацца чыста тэхнічнай працай. Аднак Навіцкі быў вымушаны адказваць як за наступствы перадвыбарчага папулізму, так і за пагаршэньне адносінаў Менску з Крамлём. Менавіта на яго прэм’ерства выпала разбурэньне апошніх ілюзіяў наконт беларускай эканамічнай мадэлі. Рост цэнаў на камунальныя паслугі, паўзучае зьнікненьне сацыяльных гарантыяў у галіне адукацыі і аховы здароўя, узьлёт колькасьці стратных прадпрыемстваў да адзнакі ў пяцьдзесят працэнтаў, відавочнае банкруцтва сельскай гаспадаркі, нарэшце, гандлёвыя войны з Расеяй. Ва ўсім гэтым Навіцкага наўрад ці можна абвінавачваць. Да гэтага давяла не яго палітыка. Вінавáціць Навіцкага можна хіба што ў тым, што ён згадзіўся стаць прэм’ерам у пэрыяд, калі ў яго не было ніякага шанцу вызначаць палітыку.

Калі Сідорскі ня будзе прызначаны прэм’ерам, могуць быць разыграныя больш складаныя палітычныя камбінацыі.

Аднак цяпер Беларусь уступае ў новы палітычны цыкл, і таму прэм’ера «застою» зноў зьменіць прэм’ер «антыкрызыснага кіраваньня». Задача новага кіраўніка ўраду — захаваць сытуацыю пад кантролем да пасьпяховага вырашэньня пытаньня аб трэцім тэрміне. Калі на пасаду будзе прызначаны цяперашні в.а.Сяргей Сідорскі, гэтая гіпотэза, як і прынцып «цыклічнасьці» ў прызначэньні кіраўнікоў ураду, спрацуе. Такі выбар быў бы для Лукашэнкі досыць лягічным: эканамічная бясьпека праекту «трэці тэрмін» залежыць ад тае галіны, зь якой Сідорскі і паходзіць. Нафтахімік з «Слаўнафты», ён мусіць прасачыць, каб у гэтую восень і зіму на Беларусь не абрынулася яшчэ адна «газавая атака», падобная да леташняй. Бо гэтага Лукашэнка хацеў бы найменш. Асабліва калі яму сапраўды прыйдзецца праводзіць рэфэрэндум у пэрыяд зімовага павелічэньня камунальных плацяжоў. Прызначыўшы Сідорскага, Лукашэнка зноў прызнае, што ключы да захаваньня яго ўлады знаходзяцца ў Расеі. Гэта, аднак, магло б зьдзівіць толькі тых, хто сапраўды паверыў, што маска нацыяналіста, якую цягам апошняга часу спрабаваў прымерыць прэзыдэнт, ужо зраслася зь яго скурай. Насамрэч канструкцыя палітычнага рэжыму — рэч больш трывалая, чым рыторыка яго гаспадароў.

Сідорскі — гэта чарговы прэм’ер-ратавальнік. Таму казаць аб яго прэзыдэнцкіх пэрспэктывах наўрад ці варта. Ад «ратавальнікаў» звычайна пазбаўляюцца да таго, як яны прыдбаюць значны палітычны капітал. Да таго ж, у беларускай палітыцы склалася правіла: калі хочаце спыніць кар’еру якогасьці бюракрата — «увядзіце» Лукашэнку ў вушы, што ён можа быць пераемнікам. Дый цяжка ўявіць, што Лукашэнка насамрэч пачаў думаць пра пераемніка. А нават калі і пачаў, дык, паводле законаў жанру, таго прызначаць значна пазьней, пасьпеўшы перад гэтым выкарыстаць некалькіх папярэднікаў як «ахвярных авечак».

Калі ж Сідорскі ня будзе прызначаны прэм’ерам, могуць быць разыграныя больш складаныя палітычныя камбінацыі. Напрыклад, інсцэніроўка доўгачаканага «бунту» ў парлямэнце з адхіленьнем прапанаванай кандыдатуры — каб прызначыць рэфэрэндум з датэрміновымі парлямэнцкімі выбарамі. Альбо прызначэньне «сілавіка» з рэклямнымі мэтамі. Аднак вэртыкаль улады ў Беларусі пабудавана такім чынам, што прызначэньне Шэймана ці Латыпава на пасаду прэм’ера было б для іх паніжэньнем. Таму чакайма Сідорскага.


IREX-PROMEDIA

**Сяргей Сідорскі мае шанец узьняцца вышэй.**

**Віталь Сіліцкі**

# «Сідорскі не прайшоў усіх прыступак»

**Адстаўку Навіцкага, зьяўленьне Сідорскага, падрыхтоўку ўлады да новай палітычнай кампаніі камэнтуе былы міністар замежных справаў Пятро Краўчанка.**

**«НН»: Што ж рыхтуе гэтая зьмена прэм’ера?**

**Пятро Краўчанка:** Рыхтуюцца сур’ёзныя палітычныя акцыі. Не выключаю, што гэта будзе рэфэрэндум. Я валодаю інфармацыяй пра падрыхтоўку закрыцьця практычна ўсіх апазыцыйных газэтаў. Лукашэнка, па сутнасьці, праводзіць тактыку «выпаленай зямлі».

**«НН»: Чаму ён так упэўнена пачуваецца ў сёньняшняй сытуацыі?**

**П.К.:** Лукашэнка ня зьвязаны нікімі маральнымі абавязкамі на Захадзе, а цяпер і на Ўсходзе. Беларусь пакінута сама сабе. Таму Лукашэнка вырашыў проста гуляць ва-банк: утрымаць уладу любым спосабам, нягледзячы ні на якія акалічнасьці і складанасьці.

**«НН»: Адстаўка прэм’ера Навіцкага і іншыя зьмены ва ўрадзе выкліканыя падрыхтоўкай палітычнай акцыі ці існуюць нейкія іншыя прычыны?**

**П.К.:** Тое, што адбываецца, — гэта чарговы палітычны спэктакль. Такіх прэм’ер-міністраў, якія ёсьць у нас, можна мяняць у любы час і на любым этапе. У Беларусі рэальны кіраўнік ураду — прэзыдэнт. Таму каманда прэм’ера — гэта хлопчыкі для біцьця, якія рэальна ні за што не адказваюць і нічога не вызначаюць. Пасьля выбараў 1994 г. Кебіч запытаўся ў Лукашэнкі: «Саша, як ты будзеш кіраваць? Ты ж ня зможаш кіраваць краінай!» Той адказаў: «Нічога, я штогод буду мяняць прэм’ера».


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Пятро Краўчанка ведае, як Сяргей Сідорскі распраўляўся зь людзьмі.**

Цяпер у Лукашэнкі няма часу для манэўру, ды ягоныя рэзэрвы не такія моцныя, як здаецца. Цэнтралізацыя дасягнула свайго апагею. І калі аб’ектыўна ацэньваць вынікі дзейнасьці ўраду Навіцкага, то яны не адпавядаюць надзеям людзей. Вось цяпер, перад важнымі палітычнымі акцыямі, Лукашэнка пойдзе на варыянт з чалавекам больш жорсткім, рашучым. На мой погляд, хутчэй за ўсё, прэм’ер-міністрам будзе Сяргей Сідорскі.

**«НН»: Як бы Вы ацанілі палітычныя пэрспэктывы Сідорскага?**

**П.К.:** Сідорскі — гэта чалавек, які ня мае ніякіх маральных падставаў узначальваць урад. У яго няма досьведу, ён не прайшоў усіх намэнклятурных прыступак, пакіраваў толькі Гомельскай свабоднай эканамічнай зонай. Гэта груба, жорсткі, бестактоўны чалавек, які ніколі ня будзе задумвацца над тым, выконваць пэўнае даручэньне ці не выконваць. Такім чынам, на зьмену дастаткова лібэральнаму і мяккаму Навіцкаму прыходзіць упраўленец, які стылем найбольш адпавядае поглядам, падыходам Лукашэнкі. Але «жорсткі і рашучы» зусім не азначае «больш кваліфікаваны і прафэсійны».

Я ведаю, як Сідорскі распраўляўся з многімі людзьмі ў апараце Савету міністраў. Аднаго вядучага кіраўніка ўпраўленьня ён выкінуў на пэнсію літаральна за месяц да таго, як яму споўнілася 60 гадоў. Менавіта з падачы Сідорскага здымаліся некалькі міністраў летась у красавіку, літаральна на паседжаньні прэзыдыюму ўраду. Але, колькі б ні ламаў лёсаў Сідорскі, у краіне нічога не мяняецца. Таму што трэба ламаць сыстэму. Трэба мяняць падыходы. Неабходна зрабіць так, каб людзі былі зацікаўленыя ў стваральнай працы.

З усіх прэм’ераў найбольш падрыхтаваным і кваліфікаваным быў Уладзімер Ярмошын. А тыя людзі, якія прыходзяць цяпер, — гэта нават не другі эшалён, а трэці.

**«НН»: Ці існуюць сёньня намэнклятурныя кланы, якія стаяць у прынцыповай апазыцыі?**

**П.К.:** Такія кланы, павязаныя сваяцкімі, рэгіянальнымі і іншымі сувязямі, існуюць. Але яны чакаюць разьвіцьця падзеяў і не прадпрымаюць актыўнай дзейнасьці.

**«НН»: Вельмі пэсымістычную карціну малюеце. Ці значыць гэта, што Вы ўжо расчараваліся ў магчымасьці палітычнай барацьбы за ўладу ў Беларусі?**

**П.К.:** Абсалютна не. Я добра ўсьведамляў, што ў 2003—2004 гадах будуць «закручвацца гайкі», што парлямэнт ня будзе адыгрываць ніякай значнай ролі. Урэшце, усё вызначае фінішная стадыя.

Пасьля выбараў 1994 г. Кебіч запытаўся ў Лукашэнкі: «Саша, як ты будзеш кіраваць? Ты ж ня зможаш кіраваць краінай!» Той адказаў: «Нічога, я штогод буду мяняць прэм’ера».

**«НН»: Варта чакаць новай хвалі рэпрэсіяў?**

**П.К.:** Калі рукі ў чалавека разьвязаныя і супрацьстаяць яму няма каму, вядома, тут могуць быць розныя абставіны. Але я спадзяюся, што на рэпрэсіўныя дзеяньні, якія былі ў 1999—2000 гадах, Лукашэнка ня пойдзе.

**«НН»: У апошні месяц зьявілася інфармацыя, што рэжым імкнецца знайсьці паразуменьне на Захадзе, у прыватнасьці ў ЗША…**

**П.К.:** Гэта піяраўская кампанія ўладных структураў, якія запусьцілі плётку ў друк. Яна ня мае нічога супольнага зь беларуска-амэрыканскімі адносінамі. Я ў гэтым перакананы. Пэўныя спробы весьці палітычны зандаж робіць Мартынаў. Але на Захадзе добра разумеюць, што адзіны міністар замежных справаў Беларусі — гэта Лукашэнка.

**Запісаў Сяргей Ёрш**

# Малітва пяці тысячаў

## Сяргей Хоміч: «Мы молімся за тое, каб Бог зьмяніў сэрцы кіраўнікоў, а калі гэтыя сэрцы ня зьменяцца — каб памяняў саміх кіраўнікоў».

Гады за Лукашэнкам — час унікальных трансфармацыяў. Якая сіла магла зьмяніць беларускіх эвангельскіх хрысьціянаў, што за саветамі існавалі ў напаўпадпольлі, ізалявана ад сьвецкага жыцьця, і прымусіць іх выйсьці на вуліцы, сказаць, што яны думаюць пра сёньняшнюю сытуацыю ў краіне? Яшчэ нядаўна такое здавалася немагчымым, цяпер жа — гэта новая рэальнасьць беларускага рэлігійнага жыцьця. Сіла, якая праводзіць глыбінныя трансфармацыі, сама таго ня хочучы, — сёньняшняя ўлада.

Першая супольная вулічная малітва прадстаўнікоў эвангельскіх дэнамінацыяў адбылася ў нядзелю 13 ліпеня на менскай плошчы Бангалор. На афіцыйным роўні ў сходзе ўдзельнічалі Аб’яднаньне суполак хрысьціянаў поўнага Эвангельля (г.зн. харызматычныя цэрквы) і Саюз хрысьціянаў веры эвангельскай (пяцідзясятніцкія цэрквы). Саюз Эвангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў і Канфэрэнцыя адвэнтыстаў сёмага дня таксама мелі сваіх прадстаўнікоў на плошчы.

Падставай для малітоўнага сходу сталася няспынная антыпратэстанцкая кампанія, што разгортваецца ў дзяржаўных СМІ — асабліва на БТ і ў «Народнай газеце». А «апошняй кропляй» стаўся выступ былога праваабаронцы Яўгена Новікава 21 чэрвеня ў праграме «Па сутнасьці». Ён назваў эвангелістаў «сатанінскай нечысьцю». Вось тады пратэстанты вырашылі запратэставаць. Да самага пачатку малітвы была залева, аднак на плошчы сабралася каля пяці тысячаў чалавек — колькасьць, якую (а тым больш без агітацыі і рэклямы) цяпер не зьбярэ на вуліцы ніводная грамадзка-палітычная структура. Сярод удзельнікаў было шмат моладзі.

Малітва праходзіла пад лёзунгам «Ісус Хрыстос, мы любім Беларусь!». Маліліся сапраўды за Беларусь: за нацыю, за свабоду, за ўлады. «Адчуваючы любоў да сваёй краіны, мы молімся за тое, каб Бог зьмяніў сэрцы кіраўнікоў, а калі гэтыя сэрцы ня зьменяцца — каб памяняў саміх кіраўнікоў», — сказаў біскуп пяцідзясятнікаў Сяргей Хоміч.

Перад сабранымі выступалі біскуп харызматаў Аляксандар Саковіч, пастары найбуйнейшых менскіх цэркваў, біскупы Саюзу ХВЭ ў Магілёўскай і Гарадзенскай абласьцях Аляксандар Гулько (Бабруйск) і Фёдар Цвор (Ліда). «У Беларусі складваецца сытуацыя, што нагадвае 1937-ы год. Пратэстантаў вінавацяць у забойствах і называюць «ворагамі народу», — сказаў намесьнік біскупа Саюзу ХВЭ Сяргей Цвор.

Побач з мною за акцыяй назіраў немалады мужчына. Я спытаўся ў яго, якое ён мае ўражаньне ад акцыі. Ён назваўся Іванам, праваслаўным, а галоўнай рэакцыяй было зьдзіўленьне: «Шмат людзей, і ўсе ўважліва слухаюць, горача моляцца. Гавораць адукавана», — сказаў ён. Міліцэйскі начальнік, які назіраў за парадкам правядзеньня гэтага масавага мерапрыемства, спачатку не хаваў свайго задавальненьня: «Столькі народу, а няма п’яных…» Аднак, пачуўшы словы пра 1937-ы год, адразу зьмяніў ацэнку: «Разьвялі тут дэмагогію».

Пры канцы малітоўнага служэньня ўдзельнікі сходу прынялі зварот да кіраўніка дзяржавы. У звароце гаворыцца: «Хтосьці дазваляе асобным журналістам, такім, як Яўген Новікаў, Ніна Яновіч і іншым, абвінавачваць хрысьціянаў у рытуальных забойствах, называць нас «сатанінскай нечысьцю» й ворагамі народу. Гэта ня што іншае, як распальваньне міжрэлігійнай варажнечы, якая ўжо прыводзіць да гвалту ў дачыненьні да хрысьціянаў і актаў вандалізму ў адносінах да нашых цэркваў». Эвангелісты прапанавалі стварыць пры прэзыдэнце адмысловую структуру для ўзаемадзеяньня з рэлігійнымі арганізацыямі. Камітэт у справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў пры Саўміне іх, відавочна, не задавальняе. Пратэстанты і надалей гатовыя разам з хрысьціянамі іншых канфэсіяў «змагацца біблійнымі мэтадамі» з алькагалізмам, наркаманіяй, амаральнасьцю, спаронамі і г.д. Яны зьбіраюцца «законнымі мэтадамі і сродкамі адстойваць сваю грамадзянскую годнасьць і канстытуцыйнае права на свабоду сумленьня дэ рэлігійных перакананьняў». «Мы любім Беларусь, мы — патрыёты сваёй краіны і многае робім для яе квітненьня», — гэткімі словамі сканчаецца зварот.

Некалькі тыдняў таму Саюз Эвангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў заявіў пра немагчымасьць выкананьня дыскрымінацыйных, на іх думку, нормаў новага закону аб рэлігіях. Цяпер сваё слова сказалі пяцідзясятнікі. Канфлікт больш не высьпявае. Ён ужо нарастае па сьпіралі.

**Аляксей Шэін**



IREX-PROMEDIA

Беларусь застаецца шматканфэсійнай краінай. У нас зарэгістравана 1265 праваслаўных грамадаў, 972 пратэстанцкія і 447 каталіцкіх.

### Эвангельскія хрысьціяне-баптысты

прызнаюць толькі Біблію (жыцій сьвятых і г.д. не прызнаюць), таму ў іх няма культу сьвятых, як у праваслаўных ці каталікоў. Апрача таго, баптысты ня маюць культу Маці Божай і апосталаў. Няма пакланеньня крыжу: баптысты лічаць яго толькі прыладай пакуты.

### Хрысьціяне веры эвангельскай (пяцідзясятнікі)

лічаць, што Сьвяты Дух можа сыходзіць на казаньнікаў і тыя пачынаюць прамаўляць на дагэтуль невядомых ім мовах. Гэтак, паводле Бібліі, сталася з апосталамі, якія на пяцідзясяты дзень пасьля ўваскрасеньня Хрыста панесьлі Слова Божае ўсім народам. Наагул, Сьвяты Дух надзвычай паважаны вернікамі гэтай плыні. Пяцідзясятнікі вераць у патрэбу непасрэдных зносінаў з Богам праз Сьвятога Духа, у блізкі канец сьвету, пасьля якога надыдзе тысячагадовае валадарства Хрыста. Яны моцна вераць у прароцтвы, сярод пяцідзясятнікаў і цяпер шмат прарокаў і прарочыцаў.

### Царква хрысьціянаў поўнага Эвангельля (харызматы)

вылучылася з пяцідзясятніцкага асяродзьдзя на пачатку 90-х. Харызматы розьняцца падыходамі да прапаганды Слова Божага. На сваіх малітоўных сходах яны выкарыстоўваюць сучасную музыку, танцы, іхныя казані менш патасныя, чым у тых жа пяцідзясятнікаў. Вельмі вялікім аўтарытэтам у харызматаў карыстаецца пастар.

# На калені? Толькі перад Богам

**Беларускія баптысты заявілі, што не падпарадкуюцца абмежаваньням «Закону аб свабодзе сумленьня», прынятага нядаўна ў інтарэсах Расейскае праваслаўнае царквы. Калі ўлічыць, што Саюз эвангельскіх хрысьціян-баптыстаў мае грамады, большыя за структуры любое палітычнае партыі, прычым практычна ва ўсіх гарадах Беларусі, — заява сур’ёзная.**

Баптысты (ад грэцкага «baptizo» — хрысьціць у вадзе) узьніклі на пачатку XVII ст. у Ангельшчыне. У параўнаньні, напрыклад, з каталіцтвам і праваслаўем, баптысты маюць спрошчаную абраднасьць, вызнаюць толькі два таемствы — хрышчэньне й хлебапераламленьне — ды лічаць, што прымаць хрост абавязкова трэба ў сьвядомым веку. У астатнім гэта вельмі набожныя хрысьціяне, абыякавыя да сьвецкіх забаваў і тэлевізіі. Баптысты — найбуйнейшая канфэсія ў ЗША. Біл Клінтан, напрыклад, прыхаджанін адной з тамтэйшых баптысцкіх цэркваў.

У Беларусі першыя баптысцкія суполкі зьявіліся пры канцы XIX ст., і ўжо ў 20-х гадох мінулага стагодзьдзя на Палесьсі існавала шматтысячнае аб’яднаньне вернікаў. Але пасьля вайны атэістычная дзяржава, што пільнавала сувязі баптыстаў з амэрыканскімі місіямі, справакавала раскол у Царкве ЭХБ на «ляяльных» і «непрымірымых», перасьледавала баптыстаў за малітвы на прыватных кватэрах, адмаўленьне ад службы ў савецкім войску й нават дабрачынныя вечарыны. Улады патрабавалі ад пастараў грамадаў, каб вернікі хадзілі ў кіно, тэатры ды клюбы. Хтосьці эміграваў, але большасьць заставалася. Ціхае, але прынцыповае й упартае непадпарадкаваньне і зрабіла зь іх знакамітых *«баптыстаўантысаветчыкаў»*.

Зразумела, што наяўнасьць шматлікіх і добра арганізаваных хрысьціянаў па ўсёй краіне нэрвуе рэжым: гэтая частка грамадзтва яўна некантрольная ані разнарадкам на галасаваньне, ані «дзяржаўнай ідэалёгіі», ані «праваслаўнаму атэізму». У 1995 г. менавіта дзякуючы падтрымцы баптыстаў у Вярхоўны Савет XIII скліканьня яшчэ ў першым туры па адной з палескіх акругаў з посьпехам абраўся Павал Знавец. Баптысты вераць, што стаўленьне хрысьціянаў да ўлады не вычэрпваецца словамі апостала Паўла: «Усякая душа няхай скараецца вышэйшым уладам, бо няма ўлады не ад Бога...» (глядзі Рым.13:1). Вернік падпарадкоўваецца ўладзе толькі да тае пары, пакуль яе загады не ўваходзяць у супярэчнасьць з запаветамі Божымі (глядзі ўсю Біблію цалкам).

Хрысьціяне — самая сур’ёзная праблема для дыктатараў. Той, хто верыць у Хрыста, становіцца на калені толькі перад Богам. Маўклівы, але масавы хрысьціянскі пратэст у Беларусі ўжо рэальна існуе. Дастаткова яшчэ аднаго рэзкага кроку рэжыму — і супраціў можа стаць публічным.

**Павал Севярынец**

Анатоль Сідарэвіч


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

# Яны не баяцца Страшнага Суду

Баптысты вабілі мяне ахвярнасьцю, пагардаю да кар'еры. Вера замінала ім стаць каму брыгадзірам, каму загадчыкам фэрмы, ня кажучы пра вышэйшыя пасады. Вера не давала магчымасьці паступіць у ВНУ (а чаму не камсамолец?). У войску юныя баптысты, як малодшы за мяне мой дзядзька Саша Данілаў, служылі ў будбатах, цягалі на БАМе рэйкі і шпалы. Баптысты вабілі салідарнасьцю. Згарэла ўдовіна хата? Паставілі новую. Хворы брат? Адведалі. Шмат дзяцей? Дапамаглі. І шматдзетнасьць, і выхаванасьць баптысцкіх дзяцей таксама вабілі. (Мая цётка Надзя выгадавала пяцёра дзяцей, цётка Зоня — як і баба Сьцепка — сямёра.) Вабіла працавітасьць. Нядаўна, калі гарэў Нясьвіскі замак, Алег Трусаў казаў на радыё «Свабода», што разумней было б знайсьці будаўнікоў-пратэстантаў. І я згадаў дзядзьку. Сьмешна было бачыць, як ён, былы «кліент» Калымы (сядзеў за пацыфізм), антыкамуніст, які прывучыў мяне слухаць «варожыя галасы» і давёў, што ўлада бальшавікоў трымаецца на хлусьні і гвалце, прыносіў з працы граматы з выявамі Леніна. Зь вясны да дзядзькі запісваліся ў чаргу людзі, якім трэ было класьці ці перакладаць печы. Работнік быў і кваліфікаваны, і выгадны: браў адно грошы, выпіўкі не патрабаваў. Затое прапаведаваў. Баптыстаў, якія б не прапаведавалі, я не сустракаў.

Дзядзька хацеў «улавіць» і маю душу. У яго першы раз я разгарнуў Біблію. У дзядзькі быў крыху шырэйшы кругагляд, чым у некаторых братоў па веры. Памятаю, як Вінцук Вячорка быў уражаны, убачыўшы дзядзькаву паштоўку, пісаную мне тарашкевіцаю. Не вучыўшыся гэтаму ў школе (і колькі было тае школы?!), ведаў мой дзядзька і лацінку. Убачыўшы ў мяне пераклад кнігаў Новага Запавету з камэнтарамі кс.Вінцэнта Гадлеўскага і пазнаёміўшыся зь ім, ён прапанаваў абмен: дай мне сваю кнігу, а я дам табе Біблію на старапольскай (у яго заставалася Біблія ў сучаснай польскай). Тая дзядзькава Біблія і сёньня стаіць у мяне на паліцы разам зь іншымі выданьнямі Сьвятога Пісьма. Чытаў ён, вылучваючы аб'ектыўную інфармацыю, і кнігі савецкіх гісторыкаў рэлігіі, і нават этымалягічны слоўнік Фасмэра купіў. Аднак я ня стаў ягоным братам.

Гадуючыся зь дзевяці гадоў у цёцічным доме, у атэізаваным асяродзьдзі, я да сваіх 16-ці ўжо быў каталіком, ужо цяміў, што Паўсюдная (Каталіцкая) Царква ня ёсьць Царквою толькі рыма-каталікоў. Калі пра сваё каталіцтва я казаў уголас, дык пра ўсходні абрад маўчаў. Нават Янку Брылю і яго Ніне Міхайлаўне, калі яна ў час першае сустрэчы (1964 г.) спыталася пра вызнаньне, я сказаў агульна: каталік.

...Я мог бы памерці, не шкадуючы пра жыцьцё, не баючыся сьмерці й Страшнага Суду, бо тады я быў, кажучы словам Самуіла Маршака, несьмяротны. Мне было недзе два з палавінаю гады, як я захварэў на не апошняе ў маім жыцьці запаленьне лёгкіх.

Што ў суседніх Забярэзьзі, Яловай і Задуб'і ў той час не было мэдыкаў, гэта дакладна; ці былі яны ў сельсаветах Хатынічах і Бобрыку, ня ведаю. Фактам ёсьць, што мая бабуля Ганна, сама хатыніцкая, з роду Куланоў, панесла мяне, падвязанага на сьпіне ўкручванкаю (вялікаю ваўняна-льняною хустаю), у Малкавічы — да Івана Карлавіча Ротэнбэрга. Панесла да калейкі, што ад Сьвятое Волі йшла праз Зябярэзьзе і паўз наш хутар Доўгі Лес на Малкавічы.

Хто ня даў мне памерці: баба Ганна, Іван Карлавіч Ротэнбэрг ці Провід? У бабулі, калі яна прынесла мяне ў малкаўскую больнічку, клопат быў ня толькі пра маё фізычнае ўратаваньне. Бабуля вельмі баялася, што я памру няхрышчаны. Таму яна папрасіла царскага яшчэ фэльчара Ротэнбэрга, якога ўвесь акалічны люд называў доктарам і шанаваў больш за прысланых і вельмі схільных да перамены месцаў дыплямаваных лекараў, стаць мне хрышчоным бацькам, а знаёмую ёй малкаўку Еву Велькую — быць мне хрышчонаю маткаю ды схадзіла да бацюшкі Леаніда Каменцава...

> Мяне не задавальняла непісьменнасьць і эстэтычная глухата баптысцкіх прапаведнікаў. Упэўнены ў кансэрватызьме нашых баптыстаў, я ня думаў, што калі-небудзь нешта памяняецца. Так было, пакуль у 90-х былы сьмяротнік і «аддзелены», пастар Эрнст Сабіла не паклікаў мяне на вялікі сход у кінатэатры «Масква».

Так доўга няхрышчаным я быў таму, што гэтак хацеў мой дзядзька Пятрук, баптысцкі дыякан, які з жонкаю сваёю і дачкою жыў у адным з намі доме. Спасылаючыся на Эвангельле, ён настойваў, што чалавек павінен хрысьціцца па веры, сьведама. І вось у крызысны момант, наводдаль ад сына, бабуля ня вытрывала і ўчыніла насуперак яго волі. А мо й па-сялянску проста дамаўляючыся з Богам: я яго ахрышчу, а Ты ня дай яму памерці.

Я ўсяго таго не памятаю. Памятаю людзей у нашым доме, якія сьпяваюць. Гэта ў нядзелі ў Доўгі Лес прыходзілі на «сабраньні» жанкі й мужчыны з Забярэзьзя ды Яловае. (Да царквы далёка, а духовая патрэба чуць слова Божае мелася.) Потым дазнáюся: прыходзілі праваслаўныя ці былыя праваслаўныя, а забярэскія каталікі былі верныя сваёй традыцыі. Дзядзьку Петрука ледзь-ледзь памятаю. Ясна ён згадваецца мне з 1954 г. Уцёкшы ад калгасаў з Доўгага Лесу, ён, да вайны вучань зачыненага бальшавікамі Біблійнага інстытуту недзе пад Пінскам, жыў і працаваў у Слуцку. У горад яго, бяспашпартнага вяскоўца, узялі таму, што меў патрэбную прафэсію: ад свайго бацькі, а майго дзеда Мітрапана пераняў мулярскае ды печнікоўскае ўмельства. Падарунак дзядзькі Петрука — Буквар — буду згадваць і перад сьмерцю. Па гэтым Буквары да Калядаў я — з дапамогаю стрыечных сясьцёр — навучыўся чытаць.

У Задуб'і сярод мужчынаў вылучаўся дзед Піліп Амэрыканец. (Потым я даведаюся, што ён ня дзед, а прадзед, брат мае прабабкі Зіноўі, год на дзвацаць ці больш маладзейшы за яе, а яго ня дужа старэйшыя за мяне сыны Даніла й Раман не дзядзькі мне, а дзяды. З тых бабрэцкіх Сідарэвічаў і дзяяч беларускае эміграцыі Леанід Сідарэвіч.) Памятаю дзеда Піліпа засёды паголенага, чыста апранутага, з газэтаю ці кніжкаю ў руках. А яшчэ ў нас, малых, быў вялікі сябар — дзядзька Антось, нябож майго дзеда Мітрапана, сын яго браціхі бабы Сьцепкі (Антосевага бацьку — дзеда Васіля — забілі бальшавікі). Антось малым і гойданкі рабіў, і сьвісьцёлкі...

І прадзед Піліп, і дзед Даніла, і баба Сьцепка, і яе дочкі Надзя й Зоня, і дзядзька Антось — усе яны ды іншыя родзічы былі, як казалі пра іх задубенцы і яны самі пра сябе, «верушчыя». А веру — баптызм — у Задуб'е прывёз дзед Піліп. Дзядзька Пятрук згадваў, што зь Піліпа Амэрыканца сьмяяліся: прывёз з-за акіяну скрыню, усе думалі, што ў ёй усякага дабра поўна, а тамака адны кніжкі...

З задубенскага маленства памятаецца, як да цёткі Зоні Сьцепчынай з Малкавіч прыяжджаў яе кавалер — каржакаваты, іранічны трактарыст Есіп Дзьмітровіч, таксама «верушчы». Я яшчэ не здагадваўся, што сярод «верушчых» ёсьць асаблівая плынь — пяцідзясятнікі. Мой новы дзядзька Есіп Малкавец быў зь іх. Калі я ў сталыя гады прыяжджаў у Задуб'е, ён заўжды пытаўся: «Хлебнай кніжкі яшчэ не завёў?» Хлебнаю кніжкаю дзядзька называў партбілет. А вось дзед Даніла быў спакойны за мяне: ад «праскае вясны» 1968 г. мы зь ім сталіся палітычнымі аднадумцамі.

Некаторыя ж «верушчыя» мяне пабойваліся. Адзін час — у пэрыяд з 1978 па 1981 г., калі я працаваў у Старыцы Капыльскага раёну і на выхадны прыяжджаў да дзядзькі ў Слуцак, — даваляся быць сьведкам нелегальных малітоўных сходаў тых, хто не хацеў жыць паводле савецкага заканадаўства аб рэлігіі і адышоў ад Усесаюзнага савету эвангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў. Памятаю і іх самвыдат. Асабліва ўразіла, як пасьля разгрому рэдакцыі іх бюлетэню неўзабаве выйшаў новы нумар з фатаздымкамі рэпрэсаваных. Дык вось, слуцкія «аддзеленыя», як іх называлі ў баптысцкім асяродзьдзі, зьбіраліся ў нядзелі ў дзядзькавым доме. А аднае нядзелі яны не прыйшлі. Я, адчуўшы нешта нядобрае, папытаўся: чаму? Пачуўшы, што я — настаўнік, казаў мне дзядзька, іхні старэйшы спытаўся, ці не камуніст я. Дзядзька сказаў, што не, але старэйшы ўсё адно засумняваўся ў маёй ляяльнасьці.

Калі б я тое ведаў, падышоў бы да прэсьвітэра і заспакоіў бы яго. Але чаму ён сам не падышоў да мяне? Мо калі б я дзеля прыліку сядзеў на тых сходах, ён і загаманіў бы са мною? Ды я не хацеў ім, братам і сёстрам майго дзядзькі, замінаць, ня мог далучыцца да іх шчыра, узяць удзел у іхнім малітоўным служэньні. У мяне былі свае перакананьні.

У Слуцку ці ў Забярэзьзі, усюды я значна лепш пачуваўся з каталікамі й баптыстамі, чым з праваслаўнымі. У праваслаўным асяродзьдзі цягам паваенных гадоў складвалася абыякавасьць да духовага, тое, што цяпер называюць праваслаўным атэізмам. Праваслаўная Царква, якая вабіла мяне грэцкім абрадам, адпужвала неглыбінёю казаньня, упартымі размовамі народу пра «папоў-камуністаў», русапяцтвам і паслушэнствам духавенства ўладзе. Як жа выгадна адрозьніваўся ад яго ўпарты ў веры і служэньні апошні на той час слуцкі ксёндз! (Ён памёр у 1969 ці ў 1970 г.)

**Працяг на старонцы 5.**

# Ня курацъ, ня п’юцъ, немаўлятаў ня хрысьцяць

**Баптызм — самая масавая ў Беларусі пратэстанцкая канфэсія, але не адзіная.**

Вытокі баптызму гісторыкі адносяць да пачатку XVII ст. і зьвязваюць зь імем ангельца Джона Сьміта. Магістар багаслоўя і сьвятар, ён у 1606 г. разышоўся ў поглядах з ангельскай царквой. Дж.Сьміт у сваіх развагах пра рэлігію прыйшоў да высновы: галоўнае не пераемнасьць сьвятароў ці бачных цэркваў, а пераемнасьць праўдзівае веры. Гэтая пераемнасьць веры, на думку Сьміта, была згубленая і ў каталіцтве, і ў англіканстве, вядомых яму. Значыць, трэба стварацъ праўдзівую царкву наноў. Асноўай новай царквы мусіць быць хрышчэньне, да якога дапускаюцца толькі тыя, хто пакаяўся і насамрэч верыць у Хрыста. Вернікі, якія аб’ядналіся пад ачольніцтвам Сьміта, прынялі другі хрост… Грамада Сьміта паклала пачатак баптызму.

У 1644 г. сем баптысцкіх цэркваў апублікавалі «Вызнаньне веры» з 15 пунктаў. Адзін з тых пунктаў вызначае, што хрост трэба праводзіць толькі «апусканьнем у ваду». Гэта адасобіла баптыстаў ад іншых пратэстанцкіх плыняў і дало назву самой канфэсіі.

У 1834 г. баптысцкія грамады ўзьніклі ў Нямеччыне. У Расейскую імпэрыю новую веру прынесьлі нямецкія каляністы-пратэстанты. Баптысцкія грамады (штунды) пачалі пашырацца ва Ўкраіне. Адтуль баптызм трапіў у Беларусь празь беларускіх сялянаў, якія выпраўляліся на заробкі.

## У што яны вераць

Генэральны сакратар Саюзу эвангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў Беларусі Віктар Крупько зазначае: «Нас часта абвінавачваюць, што мы зацягваем людзей да сябе. А насамрэч мы, наадварот, адгаворваем чалавека, калі ён вырашыў прыняць у нас хрост. Мы пераконваем яго яшчэ раз падумаць». У баптыстаў няма нейкай пэўнай мяжы: да гэтага веку ня хрысьцім, а потым ужо можна. «Галоўнае, каб новаахрышчаны прыняў Хрыста, — кажа В.Крупько і згадвае ўнікальны выпадак, калі хрысьцілі 9-гадовую дзяўчынку. Пры савецкай уладзе фармальна можна было хрысьціць толькі тых вернікаў, якім ужо споўнілася 18 гадоў. Зрэшты, нават тады на гэтыя забароны баптысты ня дужа зважалі: падпольна хрысьцілі й непаўналетніх.

Як і іншыя пратэстанцкія канфэсіі, баптысты не прызнаюць абразоў. Паводле словаў В.Круцька, абразы лічацца прыніжэньнем Бога: «Калі Вашае дзіця, седзячы побач з Вамі, пачне зьвяртацца не да Вас, а да Вашага фатаздымка, хіба гэта нармальна? Гэтак і Бог заўжды побач з намі…»

Важкія аргумэнты вылучаюцца і супраць традыцыйнага сьвятарства: «У Бібліі, у Першым пасланьні да Цімафея, сказана, што паміж Богам і чалавекам няма іншага пасярэдніка, апрача Хрыста». Што праўда, служкі царквы ў баптызьме ёсьць, але яны не выконваюць злучальнае ролі паміж вернікам і Богам. Прэсьвітэры — гэта найбольш абазнаныя ў пытаньнях веры людзі, выбраныя ўсёй грамадой.

## Быць дыяканам можа і жанчына

У баптыстаў жанчына можа стаць толькі дыяканкай: «Гэта не прэсьвітэр, ня пастар. Жанчыны могуць навучаць жанчынаў, у нядзельных школках яны наагул навучаюць усіх. Акрамя таго, ім ёсьць велізарнае поле для міласэрнасьці».

Баптысты не ўжываюць алькаголю й тытуню. «Мы не забараняем паліць: чалавек, які прыходзіць да нас, сам адмаўляецца ад гэтага. Я й сам да 22 гадоў выпіваў, граў у вакальным ансамблі, пакуль не прыйшоў да Бога», — згадвае В.Круцько.

Баптысты абавязкова адзначаюць сьвяты, зьвязаныя з Ісусам Хрыстом (Нараджэньне Хрыстова, Хрышчэньне, Спас, Вялікдзень), а таксама Тройцу і Сьвята жніва (Дзень ураджаю). «Сьвята жніва — гэта нашая падзяка Госпаду за ўраджай. Мы адзначаем яго штогод увосень: розныя суполкі сьвяткуюць у пэрыяд зь сярэдзіны кастрычніка да сярэдзіны лістапада», — зазначае В.Круцько. У некаторых грамадах адзначаюць і іншыя сьвяты, гэта вырашаюць самі грамады.

Ёсьць у баптыстаў і адрозьненьні ад іншых пратэстанцкіх плыняў. Так, адвэнтысты сёмага дня адпачываюць у суботы, а баптысты — у нядзелі. Прэсьвітэрыянцы хрысьцяць нават немаўлятаў (што праўда, потым дарослыя ўжо людзі мусяць прайсьці абрад канфірмацыі — пацьверджаньня сваёй веры). Адрозьненьні ад іншых цэркваў у царкоўнай арганізацыі (напрыклад, у баптыстаў толькі адзін пастар на грамаду), у абраднасьці (баптысты праводзяць хрост толькі акунаньнем, а не акрапленьнем). Ёсьць адрозьненьні і ў пытаньнях веры: баптысты вераць, што выратавацца ад пекла можа кожны, тады як кальвіністы — у прадвызначанасьць лёсу (Бог, маўляў, загадзя наканаваў, хто зь людзей трапіць у рай, а хто — у пекла).

## Трыста цэркваў за паўтара стагодзьдзя

Першая баптысцкая грамада ў Беларусі ўзьнікла ў 1855 г. на Гомельшчыне — у вёсцы Вуць. Першая баптысцкая грамада ў Менску ўзьнікла толькі ў 1905 г.

Другая хваля пашырэньня баптызму прыпала на часы першае сусьветнае вайны. Шмат хто з ваеннапалонных перайшоў у баптызм у нямецкім ды аўстрыйскім палоне (як палонны-місіянэр Л.Гладкі). Многія эмігранты зь Беларусі хрысьціліся ў баптысты пасьля выезду на заробкі ў ЗША.

У Савецкай Беларусі самая буйная баптысцкая грамада існавала ў Слуцку. Так, у 1925 г. там аднача сова былі ахрышчаныя 270 чалавек. Заходняя Беларусь магла пахваліцца актыўнымі суполкамі ў Берасьці, Пінску, Кобрыні, Зэльве, Валожыне, Гарадні, Ваўкавыску. Спаміж заходнебеларускіх дзеячоў вылучаецца постаць пастара Берасьцейскае грамады Лукаша Дзекуць-Малея. Разам з Антонам Луцкевічам ён зрабіў першы поўны пераклад Новага Запавету на сучасную беларускую мову. Выдадзены ў 1926 г. пераклад вытрымаў тры перавыданьні (1931, 1948 і 1985 г.) і цяпер выкарыстоўваецца ў багаслужбах найчасьцей з усіх існых беларускіх перакладаў.

Баптысты гераічна перапрывалі атэістычны перасьлед савецкай улады, хоць сотні вернікаў прайшлі праз турмы. «Вернікаў абвінавачвалі ў шпіянажы на карысьць Захаду, у непрызнаньні савецкай улады, у невыкананьні савецкіх законаў, але перасьледавалі ўсё ж за веру», — зазначае В.Круцько.

У 1988 г. у Беларусі было 177 баптысцкіх грамадаў. Новыя часы дазволілі царкве імкліва разьвівацца. У 1997 г. была заснаваная Менская багаслоўская сэмінарыя. Найбольш баптысцкіх грамадаў — на Берасьцейшчыне (у прыватнасьці, на Кобрыншчыне). У 2001 г. у склад Менскай сэмінарыі ўвайшоў Біблійны інстытут і Біблійная школа.

«Пад баптыстамі ў размовах найчасьцей разумеюць увогуле пратэстантаў. Калі ж казаць канкрэтна пра Саюз эвангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў, дык ён налічвае 300 цэркваў, плюс місіянэрскія пункты. Нашыя суполкі ёсьць у кожным раёне, хоць і ня ў кожным райцэнтры. Яшчэ ў нас з паўсотні незарэгістраваных грамадаў. Некаторыя трымаліся гэтай практыкі з савецкіх часоў, ня дужа давяраючы дзяржаве. Сёньня ж яны сьвядома адмаўляюцца ад рэгістрацыі, бо не прымаюць новага Закону аб рэлігійных арганізацыях», — кажа В.Круцько.

**Аркадзь Шанскі**







**Харызматы (хрысьціяне поўнага Эвангельля) маюць у Беларусі 61 суполку.**

# Яны не баяцца Страшнага Суду

Працяг са старонкі 5.

Ці, зноў жа, ксёндз Казімер Сьвёнтак... Рыма-Каталіцкая Царква вабіла мяне і глыбінёю казаньняў, і гожасьцю лацінскага абраду, але адпалохвала сваю польскасьцю. Хвораю польскасьцю, ад якое патыхала ксэнафобіяй.

«Які ты каталік?!» — абурана крычаў мне дзядзька. Ягоная прыродная рэзкасьць, мусіць, і паўплывала на тое, што я не прыняў веры маіх нелітушчых, працавітых і шматдзетных родзічаў. Мяне не задавальняла і непрыхільнасьць прапаведнікаў да беларускае мовы, і іхняя трасянка. «Цябе заела гардыня», — сказаў дзядзька, калі аднойчы на стале ў яго я ўбачыў друкаваны ліст ад прэсьвітэра Менскае вобласьці Букатага (такое, здаецца, было яго прозьвішча) і пакпіў зь непісьменнасьці аўтара. Яшчэ, бадай, нічога ня ведаючы пра ўладыку Іпацію Пацея, я разважаў як і ён: шавец няхай шые боты, а Сьвятое Пісьмо няхай тлумачаць людзі, на тое вучаныя. Мяне бянтэжыла варожасьць баптыстаў да сьвецкае культуры, літаратуры й мастацтва. Не забуду, як аднойчы дзядзька, дастаўшы раней за мяне з скрынкі «Маладосць», учыніў ёй цэнзуру: узяў ды выразаў мастацкую ўклейку з аголенаю фігураю дзяўчыны (гэта быў твор ці не Аляксея Глебава). Потым тую ўклейку ён з абурэньнем паказваў сваім аднадумцам. Уражвала эстэтычная глухата (хоць бы сьпяваньне псальмаў ды гімнаў на матывы «Арлёнка» ды іншых савецкіх песьняў). Але галоўнае, што ня ўкладвалася ў маёй галаве, — як гэта чалавек можа быць апраўданы адною вераю, калі ў Бібліі напісана, што вера бяз справаў мёртвая? Пераканальнага, дастатковага адказу на гэтае пытаньне мае знаёмыя баптысты не змаглі мне даць.

Так я і застаўся каталіком. З усімі ўласьцівымі каталікам і праваслаўным страхамі, згрызотамі сумленьня і сумневамі.

Пратэстанцкая (значыць, і баптысцкая) сьведамасьць аптымістычнейшая, або, як казаў мне бацюшка Павал з Олтушу Маларыцкага раёну, больш самаўпэўненая. Згадзіўшыся з а.Паўлам, я пазьней прыйшоў да высновы: таму пратэстанцкія народы й дасягнулі посьпехаў у гаспадарцы і наладжваньні дабрабыту.

Упэўнены ў кансэрватызьме нашых баптыстаў, я ня думаў, што калі-небудзь нешта памяняецца. Ды год дзесяць я асабліва не цікавіўся іхнімі справамі. І вось на пачатку 90-х былы сьмяротнік і «аддзелены», пастар Эрнст Сабіла паклікаў мяне на вялікі сход у кінатэатры «Масква». Першае, што мяне ўразіла, — хор, які сьпяваў «Ойча наш» і фрагмэнты Літургії на музыку Чайкоўскага (ці Грачанінава?). Прапаведнікі прамаўлялі ў добрай расейскай мове. Зьдзівіла прапаведніца, былая настаўніца (раней прапаведніц я ня чуў, а людзі з вышэйшаю адукацыяй, як Эрнст Сабіла, былі сярод баптыстаў выключна рэдкасьцю). Усьцешыла мноства маладых людзей зь нясьпітымі тварамі і адценьнем скуры, уласьцівым тым, хто ня паліць тытуню. І я падумаў: паступова, амаладжваючыся, прымаючы ў сваё ўлоньне адукаваных людзей, навучаючы прапаведнікаў і пастараў, гэтая Царква наблізіцца да заходніх стандартаў і пазбавіцца нелюбові да сьвецкае культуры. «А калі сустрэне перашкоды?» — спытаўся я мяне. Зноў, упэўнены, будуць «аддзеленыя», і для іх знойдзецца дом, як дом дзядзькі Петрука ў Слуцку. І зноў будуць прысуды. Але заўсёды знойдуцца цьвёрдыя ў веры людзі, якіх не спалохае й сьмяротны прысуд. Сваіх нябожчыкаў яны хаваюць з псальмамі радасьці, бо ж яны вераць выратаваныя.

# На месцы крокам руш!

**Сьпіс ліцэнзаваных відаў дзейнасьці зьменшыўся шляхам узбуйненьня.**

14 ліпеня выйшаў доўгаабяцаны прэзыдэнцкі дэкрэт №17, які нібыта скарачіў колькасьць відаў дзейнасьці, на якія патрабуюцца ліцэнзіі, са 165 да 49. Апошні раз падобнае рашэньне прымалася за два месяцы да выбараў 2001 г. Лібэральны на першы погляд дакумэнт насамрэч ня дужа аблегчыць жыцьцё прадпрымальнікам. За 1995—2000 г. толькі для аднаго віду дзейнасьці (лізінг) было адмененае ліцэнзаваньне, а сам сьпіс вырас з 77 пазыцыяў да 165. У сваёй перадвыбарчай праграме Лукашэнка абяцаў пакінуць толькі 10—12 відаў ліцэнзаванай дзейнасьці.

І вось колькасьць выпадкаў, калі патрабуецца ліцэнзія, зьменшылася. Але дасягнулі гэтага ў асноўным дзякуючы «ўзбуйненьню» пазыцыяў, якія зрабіліся амаль усеабдымнымі. Напрыклад, раней ліцэнзіі патрабаваліся для турапэратарскай ды турагенцкай дзейнасьці. Цяпер — «толькі» для турыстычнай. Апошнім часам шмат кажуць пра разьвіцьцё экалягічнага сельскага турызму. Атрымліваецца, што цяпер хутаранам, якія жадаюць падзарабіць на турыстах зь места, давядзецца клапаціцца і пра ліцэнзіі на сваю дзейнасьць. Гэтаксама ў новым пераліку замест усіх магчымых відаў адукацыйных паслугаў пазначана проста «адукацыйная дзейнасьць». Пад азначэньне «дзейнасьць, зьвязаная з выкарыстаньнем прыродных рэсурсаў», увогуле можна падвесьці што заўгодна.

Сярод пазытыўных зьменаў трэба адзначыць толькі, што ліцэнзаваньню аптовага гандлю ды кіна- і відэаздымкаў прыйшоў канец. Займацца рыэлтарскімі паслугамі, вытворчасьцю мясных ды малочных прадуктаў таксама можна будзе безь ліцэнзіяў. Аднак засталіся ліцэнзаванымі раздробавы гандаль, грамадзкае харчаваньне, выдавецкая, паліграфічная дзейнасьць, юрыдычныя паслугі. Колькасьць пазыцыяў зьменшылася, а поле ліцэнзаваньня пашырылася.

**Алесь Кудрыцкі**

ТЭМА

# Сьвятары з захаду



Хоць пратэстанты і трымаюцца паасобку, яны аднадушныя ў прыхільным стаўленьні да беларускай мовы.

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

На трыццаць тры тысячы насельніцтва Горак прыпадае тры пратэстанцкія прыходы. Іх вернікаў, разам узятых, ня больш за дзьве сотні — амаль стольки ж зьяўляецца ў мясцовую праваслаўную царкву Ўшэсьця на Вялікдзень ці Божае Нараджэньне. Горацкія пратэстанты — выкладчыкі сельскагаспадарчай акадэміі і пэдагагічнай вучэльні, экс-дырэктары буйных прадпрыемстваў, настаўнікі адзінай у горадзе гімназіі, студэнты, школьнікі. Наведваюцца й былыя шчырыя камуністы, якія ўсё жыцьцё аддалі служэньню бязглуздай ідэі, а цяпер шукаюць паратунку і сьвятла. На працы ні ў кога з гэтых людзей няма праблемаў: начальства любіць пратэстантаў за адданую працу, бо яны ўсё робяць як для Бога.

Першымі зьявіліся ў Горках баптысты. Пастар Пётра Кукурузяк зь сям'ёю прыехаў сюды ў 93-м. Да гэтага часу ў месьце былі асобныя вернікі-пратэстанты, якіх трэ было аб'яднаць. Прыход атрымаў афіцыйную рэгістрацыю ўжо налета. Сам Пётра Кукурузяк — украінец зь Віньніцы, які быў прымусова пераселены ў Латвію за актыўную царкоўную дзейнасьць на Радзіме. З Латвіі, пасьля здабыцьця гэтай краінай незалежнасьці, пераехаў у Менск, дзе пазнаёміўся зь Віктарам Немцавым, старшынём «Біблійнай лігі». Сп.Немцаў некалі вучыўся ў Горацкай акадэміі, менавіта ён параіў сям'і Кукурузякоў накіравацца зь місіяй ва Ўсходнюю Беларусь. Малельны дом у Горках дапамаглі пабудаваць нямецкія браты па веры. Баптысты маюць афіцыйную назву — Царква «Міласэрнасьць» і два прыходы ў раёне: уласна ў Горках і ў вёсцы Добрая. Ёсьць прыход і ў суседнім райцэнтры — Дрыбіне.

Горацкім прыходам хрысьціянаў веры эвангельскай "Ласка Божая" кіруе Мікалай Цэван — пяцідзясятнік у чацьвертым пакаленьні. Яшчэ ў 96-м ён прыехаў сюды з Баранавіч, бо ранейшы горацкі пастар пакінуў горад і перабраўся ў Расею. Акрамя Горак, пяцідзясятнікі ёсьць яшчэ ў мястэчку Раманава (цяпер Леніна), аднак там царквы ня зробіш, бо прыхаджан усяго дзесяць. Паводле новага закону «Аб свабодзе сумленьня і рэлігійных арганізацыях» гэткай колькасьці недастаткова. «Шмат якія моманты ў законе насьцярожваюць, — кажа пастар Мікалай. — Чаму, напрыклад, незаконна зьбірацца і чытаць Біблію ўпяцёх, а гарэлку піць упяцёх законна?» Зь ім згодны й Пётра Кукурузяк. Хоць іх прыходам закон нічым не пагражае: маюць і афіцыйнае нежылое памяшканьне, і дастатковую колькасьць вернікаў.

Чаго ня скажаш пра адвэнтыстаў сёмага дня, якіх у Горках усяго чацьвёра. Іх царква працуе толькі год, але пасьпела ўжо «нарвацца». Прыехаўшы з роднага Белаазерску, малады пастар Сяргей з сваёй жонкай раскідалі па Горках дзьве тысячы ўлётак, якія запрашалі мясьцічаў на сустрэчу. Акрамя дзевятнаццаці жыхароў, якія завіталі ў дом да сям'і мэдыкаў-пратэстантаў, сюды ж зьявіўся і ўчастковы. У райвыканкаме сп.Сяргея папярэдзілі, што такая «актыўнасьць» можа выклікаць «нэгатыўныя наступствы». Цяпер адвэнтысты працуюць паўлегальна: ня выйшла зарэгістраваць царкву, бо няма ні людзей, ні патрэбнага, паводле новых умоваў, памяшканьня. Яны пашыраюць літаратуру, чытаюць лекцыі супраць спаронаў, дашлюбных зносінаў і наркаманіі ды моляцца ў суботы.

Хаця горацкія пратэстанты і трымаюцца паасобку, усе яны аднадушныя ў стаўленьні да беларускай мовы. Баптысты сьпяваюць некаторыя малітвы па-беларуску, наведваюць музычны фэст «Магутны Божа» і спадзяюцца, што іхны хор таксама калі-небудзь возьме ў ім удзел. Адвэнтысцкі пастар Сяргей на рэфэрэндуме ў 95-м галасаваў супраць дзьвюхмоўя і мае надзею, што ягоныя дзеці будуць сьвядома размаўляць па-беларуску. А пяцідзясятнікі, ледзь атрымалі поўны пераклад Бібліі, зладзілі беларускамоўнае набажэнства. Прыйшло на яго больш за сорак вернікаў.

У нядзелю ў Горках гарадзкія аўтобусы і маршруткі перапоўненыя: людзі едуць на кірмаш, які разьмясьціўся на мясцовым стадыёне. Там можна штосьці набыць, перакінуцца парай словаў з знаёмымі — карацей, «добра пабавіць час». Толькі ня ўсе блукаюць між гандлёвых радоў. Нехта сьпяшаецца ў малельны дом, каб сустрэць сваіх братоў і разам зьвярнуцца да Бога, каб не згубіць сваіх праменьчыкаў выратаваньня.

«Беларусь чакае вялікае абуджэньне», — кажуць пратэстанты. І ім чамусьці хочацца верыць.

**Ільля Заранок**

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

## Дальнабойнікі пагражаюць выехаць на вуліцы

**У панядзелак папераджальны страйк правялі кіроўцы вялікагрузных аўтамабіляў, пратэстуючы супраць масавых звальненьняў.** Дзяржаўны мытны камітэт затрабаваў аплачваць дадатковае мыта за карыстаньне прычэпам замежнай рэгістрацыі — па 400 эўра ў месяц. Фірмы змушаныя вяртаць гаспадарам арандаваныя прычэпы, а кіроўцаў звальняць. На вуліцы могуць апынуцца да 6 тыс. чалавек. Дальнабойнікі накіравалі ліст пратэсту на адрас ураду і Адміністрацыі, пагражаюць выгнаць шматтонныя фуры на вуліцы Менску.

## Турбіны паставяць чэхі

**Гарадзенская ГЭС будзе круціць чэскія турбіны. Фірма «Alta» з Чэхіі перамагла ў тэндэры на пастаўку абсталяваньня для яшчэ не пабудаванай ГЭС на Нёмане.** Магутнасьць Гарадзенскай ГЭС будзе роўная 18 МВт, агульны кошт пабудовы складзе 28 млн даляраў.

## Задуха зьмяняе попыт

**Эўропа пакутуе ад катастрафічнае гарачыні.** У Францыі дэфармуюцца чыгуначныя рэйкі, у Гішпаніі гіне худоба, Італіі пагражаюць адлучэньні электрычнасьці (на электрастанцыях не стае вады). У той жа час продаж супрацьапёкавых крэмаў за тыя выходныя вырас на 1550%, кандыцыянэраў — у пяць разоў, а піва — у чатыры.

## Масяня ня вытрымала продажу

**Стваральнік расейскага мультфільму пра Масяню Алег Куваеў абвясьціў, што зачыняе свой праект.** Прычынаю называе крушэньня бізнэс-партнэраў. Кампанія «Альвінс», якой мастак перадаў абмежаваныя правы на вобраз, пачала гандляваць ім. Масяня трапіла на кніжкі, паштоўкі, у рэкляму. На ўкраінскіх каналах «Інтэр» ды «Enter» яна прамаўляе па-ўкраінску — і ўсё гэта бяз згоды аўтара. А Масяня ж задумвалася як некамэрцыйны праект.

Выкарыстаньне вобразу каштуе шалёных грошай. Між тым, за чэрвень Куваеў атрымаў ад пасярэднікаў толькі... сем рублёў. Кіраўнік «Альвінсу» Грыгоры Зорын не разьлічыўся і за выкарыстаньне «Масяні» ў праграме НТВ «Надоечы». Паводле словаў Куваева, ён тэлефанаваў і папросту прапаноўваў «кучу бабак» наяўнымі — за маўчаньне. Запазычанасьць пасярэдніка перад аўтарам, паводле падлікаў апошняга, складае некалькі дзясяткаў тысяч даляраў. Куваў думае пра новы праект — магчыма, мультсэрыял пра жыцьцё Ван Гога, хоць у сумленнасьць тых, хто будзе прадаваць прадукт, ня верыць.

## Вытворчасьць падземных камбайнаў

**Першы беларускі шахтапраходны камбайн прайшоў выпрабаваньні на руднiку ў Салігорску.** Яго пабудавалі ў Салігорскім інстытуце праблемаў рэсурсазьберажэньня. Камбайн апрацоўвае 180 тонаў руды ў гадзіну — больш, чым украінскія аналягі. У год інстытут мае зьбіраць 12 шахтапраходнікаў. Палову будзе набываць «Беларуськалій», рэшту — расейскія капальні на Ўрале.

## Нафтавых гульцоў паболела

**Расейская кампанія «Татнафта» з Татарстану заявіла, што мае намер удзельнічаць у прыватызацыі беларускай нафтахіміі.** «Татнафта» займае ў Расеі шостае месца па здабычы нафты. Расейскі нафтавы капітал актывізуецца ў чаканьні на новы аўкцыён па продажы «Нафтану», «Паліміру», «Азоту» ды «Хімвалакна» на больш выгадных умовах.

## У «Менску» можна разьлічвацца за валюту

**У адзіным у краіне чатырохзоркавым гатэлі «Менск» можна будзе разьлічвацца замежнай валютай.** Нацбанк выдаў гатэлю адпаведную ліцэнзію, каб той мог эканоміць грошы на пераводзе рублёў у валюту. Валюта ж патрэбная, каб вярнуць крэдыт, атрыманы на рэканструкцыю ад турэцкага «Турэксімбанку».

## Запрашае Гольфсбург

**Да выпуску новай мадыфікацыі знакамітага «Гольфу» канцэрн «Фальксваген» атрымаў незвычайны падарунак:** мястэчка Вольфсбург, дзе знаходзіцца галоўны завод фірмы, перайменавалі ў Гольфсбург. Праўда, толькі на шэсьць тыдняў. Адпаведны ўказ ужо падпісаў обэрбургмістар Вольфсбургу. Гэтак гарадзкія ўлады аддзячылі галоўнаму мясцоваму працадаўцу, зрабіўшы яму неблагую рэкляму.

**АК, БелаПАН, АФН**

# Гол без падатку на прыбытак

## Хто каго спансаруе ў хакеі і футболе

Спорт — нятанная забаўка. Рыштунак сучаснага хакеіста каштуе, бадай, столькі ж, колькі рыцарскія дасьпехі ў Сярэднявеччы. Цэны на добрыя хакейныя канькі, напрыклад, пачынаюцца ад трох сотняў даляраў. Каб спорт не прайграў змаганьня з рахункамі, яму далі істотную падатковую палёгку. Свой кавалак торту з ільготнай начынкай могуць адхапіць і спартовыя спонсары.

7 ліпеня А.Лукашэнка падпісаў указы-блізьняты №290 і 291. Першы тычыцца дадатковай падтрымкі хакейных клюбаў, другі — футбольных. Абодва прадугледжваюць аднолькавыя падатковыя льготы для спартоўцаў і іх спонсараў. У лік апошніх трапіць нялёгка. Карыстацца падатковымі льготамі змогуць толькі тыя арганізацыі, якія сыстэматычна дапамагаюць хакею ды футболу: штомесяц і ў памеры ня менш як 5% ад усіх фінансавых паступленьняў адпаведнага клюбу. Дапамагаць можна ня толькі грашыма, але і паслугамі, проста дарыць маёмасьць.

### Спонсарства

На падтрымку клюбаў спонсары выдаткоўваюць частку сваіх прыбыткаў. Указ дазваляе ўключаць гэтыя грошы ў сабекошт — значыцца, зь іх ня трэба плаціць падатак на прыбытак (ад 15% да 24%). Выгадна гэта перш за ўсё спартоўцам: спонсары змогуць даваць ім больш грошай.

Спонсараў зацікавіць магчымасьць рэклямавацца праз спартовыя клюбы. Звычайна фірмам дазваляецца ўключаць у сабекошт выдаткі на рэкляму, якія не перавышаюць 7,5% іх выручкі. «Залішняя» рэкляма абкладаецца падаткам на прыбытак. Аднак новыя ўказы дазваляюць фірме, не зважаючы на ліміты, уключаць у сабекошт усе выдаткі на сваю рэкляму, калі рабіць яе праз футбольныя ды хакейныя клюбы. Створаныя ўмовы для таго, каб клюбы ператварыліся ў рэклямныя агентцвы, якія прапануюць кліентам паслугі з значнай зьніжкай, роўнай стаўцы падатку на прыбытак.

### Клюбныя льготы

Але сапраўдны падатковы рай прадугледжаны для саміх хакейных ды футбольных клюбаў. Усе грошы, якія яны атрымліваюць у якасьці дапамогі, незалежна ад таго, хто іх дае (акрамя замежных фірмаў), пазбаўляюцца ад падатку на прыбытак. Адзіная ўмова — спонсарская дапамога павінна быць выкарыстаная на спартовыя мэты. Грошы, якія зарабляюць клюбы, калі разьмяшчаюць рэкляму (напрыклад, на футболках ці шлемах), таксама ня лічацца прыбыткам. Мала таго, мясцовым уладам «прапанавана» даць футбольным ды хакейным клюбам ільготы на мясцовыя падаткі.

### Кавалак для спартоўцаў

Калі спартоўцы ды трэнэры атрымліваюць грошы за перамогу ў спаборніцтвах, яны мусяць запаўняць дэкларацыю аб сукупным гадавым прыбытку, бо ганарары лічацца дадатковым заробкам. Прыбытак гэты можа быць немалы: напрыклад, за залаты мэдаль на алімпіядзе ў Солт-Лэйк-Сыты дзяржава абяцала 60 тыс. даляраў. Ганарары на спаборніцтвах мясцовага ўзроўню маюць больш празаічныя памеры. Калі яны не перавышаюць заробку спартоўца ці трэнэра на асноўным месцы працы, зь іх, паводле новых указаў, ня трэба плаціць падатку на прыбытак для фізычных асобаў. Даплаты на харчаваньне падчас спаборніцтваў таксама падаткам не абкладаюцца: еж — не хачу.

«Спартовыя льготы» будуць дзейнічаць тры гады — да 1 чэрвеня 2005 г. Незразумела толькі, чаму яны тычацца адно футбольных ды хакейных клюбаў і не закранаюць, напрыклад, тэатраў, якія таксама робяць гонар нашай краіне.

### Хто каму дапамагае

У хакеістаў больш спонсараў. Калі футбольныя клюбы маюць па 2-3, дык хакейныя — па 6-7. Бо льготы для хакейных спонсараў існуюць ужо даўно, дый сярод 15 футбольных клюбаў большая канкурэнцыя за спонсарскія грошы, чым сярод 9 хакейных.

У назвах многіх клюбаў адлюстраваны іх мэцэнат. Напрыклад, адразу ясна, хто спансаруе «Хімвалакно-Магілёў» ці футбольны клюб «Дарыда».

Многія клюбы зьбіраюць датацыі ад поўнага спэктру рэгіянальнай прамысловасьці, як, напрыклад, хакейны «Віцебск». Яму дапамагаюць і «Віцязь», і «Віцьба», і «Віцебскаблнафтапрадукт», і «Белвест», і «Марка», і «Віцебскія дываны». Клюб нават адбіў завод «Нафтазаводмантаж» у наваполацкага «Хіміка». На апошні, дарэчы, раскашэльваецца ледзь ня ўся беларуская нафтахімія.

Ёсьць і спонсары-неспадзяванкі. Гэтак, бабруйскую «Белшыну», акрамя іншых, спансаруе «Інфабанк», а салігорскага «Шахцёра» — Беларускі народны страхавы пэнсійны фонд. «Дынама-Менск» вядзе палітыку «сямейнага спонсарства». Яму дапамагаюць тры спонсары-браты: «Трайпл», «Акватрайпл» ды «Трайпл-тэхна». Рэкардсмэнам выявіўся хакейны клюб «Юнацтва-Менск». Ён мае ажно 13 спонсараў — ад «Атлянту» і Менскхлебпраму да гандлёвага цэнтру «Паркінг» і Камароўскага рынку. З кожнага па шэлегу — і хакеісты «Юнацтва» адточваюць тэхніку кідкоў на полі аднаўленага лядовага палацу ў менскім парку імя Горкага.

**Алесь Кудрыцкі**



**У красавіку сёлета ААТ «Брэсцкае піва» выпусьціла новы гатунак сваёй прадукцыі — «Чэмпіён-82». Частку выручкі ад яго рэалізацыі плянавалася накіраваць на разьвіцьцё беларускага футболу. У прэзэнтацыі піва браў удзел вэтэран «залатога складу» менскага «Дынама» Людас Румбуціс (на здымку).**

# Барбара Дэсьпіні: Беларусь мае шанцы на харчовым рынку

**Эўразьвяз крочыць на Ўсход. Ці зробіцца Беларусь усходнім фарпостам ЭЗ? Як будзе разьвівацца яе гаспадарка, уліваючыся ў агульнаэўрапейскую? Пра гэта карэспандэнт «НН» запытаў у Барбары Дэсьпіні, экспэрткі Дасьледчыцкага цэнтру пераходнай эканомікі ROSES (Парыж).**

**«НН»: Існуюць два погляды на эканамічную будучыню Беларусі: захаваць буйную індустрыю з дапамогай замежных інвэстараў ці адмовіцца ад яе на карысьць малога ды сярэдняга бізнэсу. Які зь іх слушны?**

**Барбара Дэсьпіні:** Нельга ўзводзіць мур паміж малымі і буйнымі прадпрыемствамі — яны ў рынкавых умовах працуюць разам. Вельмі часта малыя бізнэсы падтрымліваюць вялікія. І найлепшая вэрсія — рэструктурызацыя вялікіх прадпрыемстваў. Яны павінны экстэрналізаваць некаторыя свае функцыі, якія, магчыма, будзе таньней перадаць малым і сярэднім прадпрыемствам. Так дзейнічае заходняя гаспадарка. У Польшчы, якую часта ставяць у прыклад разьвіцьця прыватнага бізнэсу, тры мільёны малых і сярэдніх прадпрыемстваў. Тут сапраўды давялося зьліквідаваць шэраг буйных прадпрыемстваў, у першую чаргу вуглездабыўных ды мэталюргічных — гэтыя галіны ў Польшчы паволі зьнікаюць. Заходняя Эўропа вырабляе зашмат сталі, а вугаль з Амэрыкі таньнейшы за польскі. Але ўсё-такі многія прадпрыемствы здолелі экстэрналізаваць свае функцыі. Нельга казаць, што Беларусь павінна абраць той ці іншы шлях — гэтыя два напрамкі разьвіцьця ідуць паралельна. Трэба, вядома, зьліквідаваць цалкам неканкурэнтаздольныя прадпрыемствы, але прынцыпова адмовіцца ад буйной індустрыі немагчыма.

**«НН»: Якое месца можа заняць Беларусь у Эўразьвязе?**

**Б.Д.:** Нельга сказаць, што кожная краіна ў ЭЗ мае нейкую спэцыялізацыю, — апошняя не залежыць ад дзяржаўных межаў. Беларусь, як і Польшча, мае больш шанцаў на аграрна-спажывецкім рынку. Але тут для Беларусі будзе адыгрываць найважнейшую ролю экалягічнасьць гаспадаркі — наколькі фэрмэры здолеюць адмовіцца ад ужываньня «хіміі». На Захадзе існуе перавытворчасьць харчовых прадуктаў, выробленых на буйных сканцэнтраваных аграпрадпрыемствах з дапамогай нездаровых, ненатуральных мэтадаў. У Польшчы, ва Ўсходняй Эўропе яшчэ ёсьць магчымасьці вырошчваць бydла ў здаровых умовах. Таму Польшча мае пляны зрабіцца буйным вытворцам экалягічна чыстай і смачнай ежы.

**«НН»: Дзе палягае ўмоўная мяжа пашырэньня ЭЗ?**

**Б.Д.:** Эўропа яшчэ будзе крочыць на Ўсход — на чарзе Беларусь, Украіна, тая ж Турцыя. Эўропа магла б дайсьці і да Ўралу — з геаграфічнага пункту гледжаньня гэта таксама Эўропа, але ўся Расея — абсалютна не. Гэта занадта вялікі кавалак. Далёкі Ўсход хутчэй злучыўся б зь Японіяй. У наступныя пару гадоў будзе весьціся гаворка пра ўваходжаньне ў Эўразьвяз дзьвюх былых постсацыялістычных краінаў — Баўгарыі ды Румыніі. Уваходжаньне ў ЭЗ Беларусі ды Ўкраіны можа быць пытаньнем не раней чым 2010 году.

**«НН»: Уявім, што палітычная сытуацыя ў Беларусі раптоўна зьмянілася. Ці прымуць яе ў ЭЗ паскоранымі тэмпамі, ня дужа зважаючы на ўзровень разьвіцьця гаспадаркі?**

**Б.Д.:** Гэта будзе залежаць ад сытуацыі ня толькі ў самой Беларусі, але і ва ўсім сьвеце — я маю на ўвазе адносіны ЭЗ з ЗША ды Кітаем, падзеі на Блізкім Усходзе, эканамічную дэпрэсію і г.д. Геапалітычная сытуацыя моцна зьмянілася пасьля вайны з Іракам, і цяжка нешта прадказваць. Можа стацца, Эўропа будзе палітычна змушаная прыняць Беларусь ды Ўкраіну. Што да ўзроўню гаспадаркі, дык большасьць польскіх рэгіёнаў мусіць атрымліваць субсыдыі з структурных фондаў ЭЗ. У Румыніі — тыя ж цяжкасьці. Праблему неадпаведнасьці беларускай эканомікі эўрапейскаму ўзроўню маглі б вырашыць структурныя даплаты зь бюджэту ЭЗ. Але і тут сытуацыя можа зьмяніцца, бо такі датацыйны спосаб гаспадараньня, асабліва ў сельскай гаспадарцы, задарагі для Эўразьвязу. Рэгіянальная ды сельскагаспадарчая палітыка складае палову бюджэту ЭЗ, а гэта шалёныя грошы.

**«НН»: Ці ня можа здарыцца так, што Эўропа ўвогуле забудзецца на існаваньне Беларусі?**

**Б.Д.:** Я жыву на Захадзе і бачу, што Беларусь ужо трактуецца як пустэльня. Маўляў, краіны няма, але ёсьць дыктатура. Для Беларусі першая праблема — дэмакратызацыя палітычнай сыстэмы. Інакш сур'ёзнай размовы пра ўступленьне ў ЭЗ ня будзе.

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі**

# 18 ліпеня пятніца

## ● БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 «Добрай раніцы, Беларусь!» на «Славянскім базары ў Віцебску-2003».
8.10, 18.15 «Агенцтва НЛС». Сэрыял.
9.10, 17.15 «Псі-фактар». Сэрыял.
10.00 Сад мары. Перадача для дачнікаў.
10.30 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
10.55 Падарожжа дылетанта. «Баруны. З гісторыі мястэчка і касьцёлу».
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15 «Добры дзень, Беларусь!» на «Славянскім базары ў Віцебску-2003».
13.15 «Плач перапёлкі». Сэрыял («Беларусьфільм»).
14.25 «Піянеры эгіптазнаўства». Дак. сэрыял. Заключная сэрыя.
14.50 «Алень і воўк». Мультфільм.
15.15 «Далікатны ўзрост». Сэрыял.
15.45 «Танюшка, Цяўка, Топ і Нюша». Мультфільм.
16.00 Музычная казка «Не пакідай...» («Беларусьфільм»). 2-я сэрыя.
19.05 У.Снайпс і П.Фальк у спартыўнай драме «Абмеркаваньню не падлягае» (ЗША — Германія).
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 Чэмпіянат сьвету па водных відах спорту. Трамплін 3 мэтры. Жанчыны. Фінал. Відэаагляд.
23.55 Д.Мур у містычнай мэлядраме «Два жыцьці» (ЗША).

## ● СТВ

6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Гаджэт і Гаджэціны». Мультсэрыял.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.05, 18.20 «Менск і менчукі».
8.10, 23.10 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: Арнольд Шварцэнэгер у камэдыі «Геркулес у Нью-Ёрку» (ЗША).
9.55 «Турпаход».
10.05, 20.30 «Аўтапанарама».
10.20, 23.40 «Не спыняйся. Гісторыя папулярнай музыкі». Дак. фільм.
11.10 «Тэатральныя гісторыі».
11.25 «Шалёны сьвет». Дак. фільм.
12.00 «Віно каханьня».
12.55 «Народ супраць». Тэлегульня.
13.50, 18.35 «Каханьне імпэратара». Тэлесэрыял.
14.40 Мультфільм.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.20 Кіно: «У пошуках капітана Гранта», 4-я сэрыя.
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.25 «Тэма дня».
20.05 «Рэактыўны бокс».
20.20 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: Багуслаў Лінда, Агнешка Ўладарчык у гангстэрскім баевіку «Ахоўнік для дачкі» (Польшча).
23.20 «Навіны СНД».
0.30 Кіно: Эрык Робэртс і Лэнс Хенрыксэн у псыхалягічным трылеры «Ў кампаніі з забойцам» (ЗША).

## ● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.30 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 «Каралева Марго». Сэрыял.
10.45 Гумарыстычная праграма «Самі з вусамі».
11.10 Сэрыял «Твінісы».
15.10 Сэрыял «Ваш ход, інспэктар».
16.00 Прэм'ера. «Рыгор Гладкоў. Недзіцячыя песьні».
16.25 Жэрар Дэпард'ё ў камэдыі «Мой тата — герой». ЗША—Францыя, 1994 г.
18.10 Дак. дэтэктыў. «7 год у чаканьні расстрэлу». Справа 1994 году.
18.35 «Жарт за жартам». Гумарыстычная праграма.
19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
21.00 «Поле цудаў» зь Леанідам Якубовічам.
22.05 Леў Лешчанка, Алег Газманаў, «Любэ» і іншыя ў гала-канцэрце «Ўлюбёныя песьні».
23.40 Камэдыя «Паліцэйская акадэмія: Зноў вучоба». ЗША,1986 г.

## ● РТР

7.45 Тэлесэрыял «Па імені Барон...».
8.40 Алег Даль, Ларыса Ўдавічэнка, Любоў Палішчук, Міхаіл Глускі і Яўген Кіндзінаў у тэлефільме «Залатая міна».
10.00, 19.00 Весткі.
17.50 «Аншляг».
18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
19.55 Ганна Назар'ева, Сяргей Габрыэлян, Валеры Барынаў і Аляксей Пятрэнка ў камэдыі «Гульня на мільёны». 1991 г.
22.00 Урачыстая цырымонія закрыцьця XII Міжнароднага фэстывалю «Славянскі базар у Віцебску».
23.30 Дзёньнік фэстывалю «Славянскі базар-2003».

## ● Культура

15.10 «Гісторыя Зямлі». Дак. сэрыял (Вялікабрытанія, 1998). 4-я сэрыя.
16.00 «Слова і справа». Дак. сэрыял. Фільм 2-і. М.Шчарбатаў.
16.25 «У сьвеце танцу». «Песьні вандроўнікаў». Фільм-балет.
17.30 Навіны культуры.
17.50 Крэмль музычны.
18.30 «Трынаццаць плюс...». Акадэмік Леў Ландаў.
19.10 «Эндзі Пендзі». Мультсэрыял.
19.20 «Казка пра карасёў, зайца і бублікі». Мультфільм.
19.30 Рэтраспэктыва фільмаў Аляксея Германа. «Праверка на дарогах» («Ленфільм», 1985). Рэжысэр А.Герман.
21.05 70 год Яўгену Еўтушэнку. «Лінія жыцьця».
22.00 Блеф-клюб.
22.35 «Абрабаваньне па...». Мультфільм для дарослых.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Хто там...».

## ● НТВ

9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Без рэцэпту». Доктар Бранд.
10.00 «Кватэрнае пытаньне. Ружовае на белым».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога-2».
17.25 Залаты фонд НТВ. «Мікалай II. Кола жыцьця», 5-я сэрыя, заключная.
18.00 «Сёньня» зь Міхаілам Асокіным.
18.35 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў. Кашмар на вуліцы С.».
19.55 Шон Конэры і Мішэль Пфайфэр у дэтэктыве «Расейскі дом».
22.25 Супэрбокс. Луі Саварыз супраць Дэвіда Айзана.

## ● Эўраспорт

14.45 Вэляспорт. Тур дэ Франс. Дванаццаты этап. Жывая трансьляцыя.
19.00 Плаваньне. Чэмпіянат сьвету. Барсэлёна. Паўтор.
19.30 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. U-19. Францыя — Англія. Ліхтэнштэйн. Жывая трансьляцыя.
21.30 «Формула». Аўтачасопіс.
22.00 Самы дужы чалавек. Гран-пры. Нідэрлянды.
23.00 Вэляспорт. Тур дэ Франс. Дванаццаты этап. Агляд.
0.45 «Сэрыі». Аўтамотаспартыўны часопіс.
1.15, 1.45 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.

# 19 ліпеня субота

## ● БТ

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.10 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 «Не зявай!».
8.15 Існасьць. Духоўная праграма.
8.45 Уступныя іспыты па беларускай і расейскай мовах у вышэйшых навучальных установах.
9.00 «Усё нармальна, мама!». Забаўляльная праграма.
9.45 Экран індыйскага кіно. «Сьлед шакала». 1-я сэрыя.
11.05 Здароўе. Тэлечасопіс.
11.35 «Сьпявай, душа!» «Зорны дождж».
12.15 Вясёлая сямейка. Гумарыстычная праграма.
12.45 Падарожжа дылетанта. «З гісторыі Жупранскага графства».
13.00 Сола для дэбютанта. Віктар Бабарыкін (эфоніюм).
13.10 Плянэта АРТ.
13.35 «Ёсьць толькі міг...». Герман Бокун.
14.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства» (Англія).
15.15 «Гаспадары зямлі». Відэафільм АТН.
15.35 Маст. фільм «Шыньён Вольгі».
17.20 Музычная камэдыя рэжысэра К.Шахназарава «Мы з джазу».
18.45 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
19.15 Прэм'ера. С.Сталоне ў камэдыйным баевіку рэжысэра М.Бэрка «Анёл помсты» (ЗША).
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 М.Эспазыта і Б.Гардэн у псыхалягічным трылеры «Сьмяротная пяшчота» (ЗША).
24.00 Чэмпіянат сьвету па водных відах спорту. Вышка 10 мэтраў. Мужчыны. Фінал. Відэаагляд.

## ● СТВ

7.25 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
7.50 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
8.15 Кіно — дзецям: Павал Кадачнікаў, Надзея Румянцава, Барыс Брандукоў у казцы «Прададзены сьмех». 1-я сэрыя. СССР, 1981.
9.30 «СТВ-спорт».
9.40 «Рэактыўны бокс».
9.55 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
10.25 «Анфас». Ваенна-патрыятычная праграма.
10.40 «Разам».
11.15 «Патрэт у інтэр'еры».
11.30, 20.15 Кіно: Барыс Токараў, Юры Багатыроў у кінарамане «Два капітаны», 4-я сэрыя.
12.45 «Рамонт».
13.05 Кіно: Валеры Шальных, Натальля Ягорава, Леанід Маркаў у лірычнай камэдыі «Палёт з касманаўтам».
14.55 Праект «Адлюстраваньне»: «Жоўтыя каралі». Дак. фільм.
16.00 «Клюб «Белы папугай». Найлепшае.
16.55 «Вовачка-2». Камэдыйны сэрыял.
17.30 «Найлепшыя шоў сьвету з Урмасам Отам».
18.25 Кіно: Барыс Шчарбакоў, Міхаіл Кокшанаў, Аляксандар Панкратаў-Чорны ў лірычнай камэдыі Анатоля Эйрамджана «Дзень Сьвятога Валянціна».
19.30 «24 гадзіны».
19.55 «СТВ-спорт».
21.30 Кіно: Марк Уолбэрг, Лу Дайманд Філіпс, Антоніё Сабата-мал. у баевіку «Вялікі ўдар» (ЗША).
23.05 «Навіны СНД».
23.10 Кіно: Бэнуа Вэрэр у фантастычным фільме П'ер-Поля Рэндэра «Заканы Тама» (Францыя — Бэльгія).

## ● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Мультфільм.
8.30 Грай, гармонік любы!
9.00 Слова пастыра.
9.15 Здароўе.
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак» з Андрэем Макарэвічам.
10.30 «Сьмехапанарама» Яўгена Петрасяна.
11.10 Павал Любімцаў у праграме «Падарожжы натураліста».
11.40 «Тайны стагодзьдзя». Уладзімер Маякоўскі.
12.20 «Новы дзень». Ударная сіла. «Зброя XXI стагодзьдзя».
12.45 Яўген Еўтушэнка. Юбілей у Політэхнічным.
14.15 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.35 Выратавальнікі. Экстранны выклік.
15.00 Чэмпіянат сьвету па водных відах спорту. Перадача з Гішпаніі.
15.30 Сэрыял «Цёмны анёл». ЗША.
16.15 Леанід Кураўлёў у камэдыі «Афоня». СССР, 1975 год.
17.50 Ала Пугачова. «Казкі пра каханьне».
18.25 Лэсьлі Нільсан у камэдыі «Голы пісталет 33 1/3». ЗША, 1994 г.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?» з Максімам Галкіным.
22.00 «Крывое люстэрка». Яўген Петрасян прадстаўляе...
23.45 Джоні Мілер у баевіку «Мсьцівец». Вялікабрытанія, 2001 г.

## ● РТР

8.45 «Ранішняя пошта».
9.20 «Сам сабе рэжысэр».
10.20 Леанід Харытонаў, Усевалад Ларыёнаў, Яўген Лявонаў і Сяргей Філіпаў у камэдыі «Вуліца поўная нечаканасьцяў». 1957 г.
11.40 «Ха». Маленькія камэдыі.
11.55 «У пошуках прыгод».
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Барыс Шчарбакоў і Яўгенія Сіманава ў мэлядраме «Дзень вясельля давядзецца ўдакладніць». 1979 г.
15.00 Футбол. Чэмпіянат Расеі. «Тарпэда» (Масква) — ЦСКА. Жывая трансьляцыя са стадыёну «Лужнікі».
17.00 «Мая сям'я».
18.00 «Аншляг».
19.00 Весткі.
19.20 Эдзі Мэрфі ў камэдыйным баевіку «Паліцэйскі з Бэвэрлі Хілз» (ЗША). 1984 г.
21.25 Мэл Гібсан у драме «Галіполі».

## ● Культура

11.30 «Яўген Весьнік. Кур'ёзы, тэатар, кіно, жыцьцё». Перадача 5-я.
11.55 Дзіцячы сэанс. «Садко». Маст. фільм («Масфільм», 1952). Рэжысэр А.Птушко.
13.20 «Прыстасаваны да жыцьця ў прыродзе». «Акіян».
13.45 «Партытуры не гараць». Аўтарская праграма А.Варгафціка.
14.15 «Знакамітыя арыі». Арыя з опэры Б.Брытэна «Пітэр Граймз».
14.25 Зорныя гады «Ленфільму».
15.05 «Чапаеў». Маст. фільм («Ленфільм», 1934). Рэжысэры браты Васільевы.
16.40 110 год з дня нараджэньня паэта. «Вясёлы год Маякоўскага».
17.20 «Пра ўсіх на сьвеце». Мультфільм.
17.30 «Рамантыка рамансу». Вядучы Л.Сярэбранікаў.
18.10 «Сфэры».
18.50 «Страсьці па Бумбарашу». Тэлевэрсія спэктаклю Маскоўскага тэатру-студыі п/к А.Табакова. Рэжысэр У.Машкоў.
20.30 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя». Мікалай і Аляксандра.
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Выбар зброі». Маст. фільм (Францыя, 1981). Рэжысэр А.Карно.
23.30 «Цяп-ляп», «Востраў». Мультфільмы для дарослых.

## ● НТВ

9.00 «Кулінарны паядынак. Расея — Марока».
10.00 «Кватэрнае пытаньне. Ілюмінатары ў гасьцёўні».
10.50 Спорт «Лято 6 з 49».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.15 Экстрэмальнае шоў «Фактар страху».
12.00 «Служба выратаваньня».
12.35 Ларыса Ўдавічэнка ў камэдыі «На каго бог пашле».
14.10 Свая гульня.
15.20 Ала Сурыкава. «Жаночы погляд» Аксаны Пушкінай.
16.00 Джулія Робэртс у фільме «Фантастычная піца».
18.00 «Зусім сакрэтна. Ліхаманка жаху».
18.45 Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі-2. Расан».
20.00 «Асабісты ўнёсак».
21.00 Майкл Парэ ў вострасюжэтным баевіку «Хуткі суд».
23.10 «Усё адразу!».

## ● Эўраспорт

19.00 Формула-3000. Сыльвэрстоўн.
20.00 Плаваньне. Чэмпіянат сьвету. Барсэлёна.
21.00 Футбол. Таварыскі матч. Капэнгаген — Ольбарг — Галатасарай. Жывая трансьляцыя.
23.00 Вэляспорт. Тур дэ Франс. Трынаццаты этап. Агляд.
0.15 «WATTS». Часопіс.
0.45 Экстрэмальныя віды спорту.
2.15 Плаваньне. Чэмпіянат сьвету. Барсэлёна. Паўтор.

# 20 ліпеня нядзеля

## ● БТ

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.30 Арсэнал. Праграма пра армію.
9.00 Альхімія слова.
9.05 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.35 Экран індыйскага кіно. «Сьлед шакала». 2-я сэрыя.
11.15 Сад мары. Перадача для дачнікаў.
11.40 Зоркі Канскага кінафэстывалю ў праграме «Новая калекцыя».
12.20 «Усё нармальна, мама!». Забаўляльная праграма.
13.00 «Ваша лята».
13.40 Сьвятыні Беларусі. Храм Сьвятога Спаса ў Полацку.
14.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства» (Вялікабрытанія).
15.15 Лёс чалавека. «Званар Аляксандар Маліноўскі». Частка 2-я.
15.40 Сэрыял «Барацьба за выжываньне» (Вялікабрытанія).
16.35 «Дару табе зорку», «Здароўе пачынаецца дома». Мультфільмы для дарослых.
16.55 Чэмпіянат сьвету па водных відах спорту. Трамплін 3 мэтры. Сынхрон. Жанчыны. Фінал. Відэаагляд.
17.30 Чэмпіянат сьвету па водных відах спорту. Вышка 10 мэтраў. Сынхрон. Мужчыны. Фінал. Трансьляцыя з Гішпаніі.
18.15 «Славянскі базар у Віцебску-2003». Выбранае.
18.55 А.Дэлён у клясычнай крымінальнай драме «На яркім сонцы» (Францыя — Італія).
21.00 Панарама. Падзеі тыдня.
21.55 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.20 Бокс. Баі найдужэйшых прафэсіяналаў сьвету. Майкл Гранд — Дамэнік Гуін. Трансьляцыя з ЗША.
23.10 А.Равіковіч і А.Хасьцікоеў у авантурнай камэдыі «Выкуп» (Украіна).
0.45 Чэмпіянат сьвету па водных відах спорту. Плаваньне. Відэаагляд.

## ● СТВ

7.25 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
7.50 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
8.15 Кіно — дзецям: Павал Кадачнікаў, Надзея Румянцава, Барыс Брандукоў у казцы «Прададзены сьмех». 2-я сэрыя. СССР, 1981.
9.30 «СТВ-спорт».
9.45, 19.35 «Аўтапанарама».
10.05 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
10.30 «Менск і менчукі».
10.40 «Сьвецкая хроніка».
10.50 Арт-экспрэс. Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.05 «Запрашаем паскардзіцца».
11.15 «Філярманічны тыдзень».
11.20 «Плянэта людзей».
11.30, 20.40 Кіно: Барыс Токараў, Юры Багатыроў у кінарамане «Два капітаны», 5-я сэрыя.
12.45 «Добры дзень, доктар!».
13.05 Кіно: Алег Відаў, Людміла Савельева ў прыгодніцкім фільме «Вершнік без галавы».
15.15 Праект «Адлюстраваньне»: «Маўчаньне шчанят». Дак. фільм.
16.20 «Клясыка гумару».
17.15 «Залатая дзясятка Беларускай опэры».
17.45 «Метафізыка Пецярбургу». Тэлевізійны фільм.
18.15 «168 гадзін».
19.05 «Пакуль гарыць сьвечка...».
19.55 «Асабісты інтэрас».
22.00 «Турпаход».
22.10 Кіно: Дольф Лундгрэн у фантастычным баевіку «Апошні патруль» (ЗША).
23.45 «Навіны СНД».
0.05 Кіно: камэдыйная мэлядрама «Прывідны сьвет» (ЗША — Вялікабрытанія — Германія).

## ● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Мультфільм.
8.30 Служу Айчыне!.
8.50 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Падарожныя нататкі».
10.30 Пакуль усе дома.
11.10 Дог-шоў.
11.55 Прэм'ера. «Аляксей Герман — Львінае Сэрца».
12.20 «Новы дзень». «Скачок з космасу».
12.45 Шукальнікі. «Ламаносаў. Зьніклая «Гісторыя».
13.15 Ералаш.
13.25 «Клюб падарожнікаў».
14.15 Дыснэй-клюб: «Мышыны дом».
14.40 Ток-шоў «Выбар».
15.20 Майкл Джордан у камэдыйным баевіку «Фінт вушамі». ЗША, 1996 г.
16.50 Жывая прырода. «Тайны тысячы астравоў».
17.45 Ала Пугачова, Міхаіл Баярскі, Ларыса Доліна ў канцэрце «Паміж мінулым і будучыняй».
20.30 Контуры.
21.10 Трылер Дж.Кемэрана «Бездань». ЗША, 1989 г.
23.30 Вудзі Ален у камэдыі «Сьцены ў магазыне». ЗША, 1991 г..

## ● РТР

9.15 «Гарадок». Дайджэст.
9.45 Луі дэ Фюнэс у фільме «Оскар» (Францыя). 1967 г.
11.15 «Вакол сьвету».
12.05 «Дыялёгі пра жывёл».
13.00 Весткі.
13.20 «Сьвет на мяжы».
13.50 «Пакой сьмеху».
14.55 Чэмпіянат сьвету па аўтагонках у клясе «Формула-1». Гран-пры Вялікабрытаніі. Жывая трансьляцыя з Сыльвэрстоўну.
16.55 «Х». Маленькія камэдыі.
17.10 Кемэран Дыяс, Харві Кейтэл і Білі Зэйн у дэтэктыве «Галава над вадой» (ЗША). 1996 г.
19.00 Весткі.
19.20 Дольф Лундгрэн у баевіку «Чысьцільшчыкі» (ЗША). 1999 г.
21.20 Маст. фільм «Шызафрэнія», Расея, 1997 г.

## ● Культура

11.30 «Яўген Весьнік. Кур'ёзы, тэатар, кіно, жыцьцё». Перадача 6-я.
12.00 ГЭГ.
12.15 Дзіцячы сэанс. «Ключ». Мультфільм.
13.10 «Прыстасаваны да жыцьця ў прыродзе». «Падземны сьвет».
13.35 Ізноў пласьцінка пяе.
14.05 «Астравы». Уладзімер Суцееў.
14.45 «Шэдэўры сусьветнага музычнага тэатру». Ш.Гуно. Опэра «Рамэо і Джульета».
18.00 Сьмеханастальгія.
18.30 Вечары ў тэатры «Школа сучаснай п'есы». Бэнэфіс Ўладзімера Сьцяклова.
19.10 «Посьпех». Маст. фільм («Масфільм», 1984). Рэжысэр К.Худзякоў.
20.40 «Былое ў асобах». «Шпіён, які гуляе сам сабой». Частка 2-я.
21.20 «Культ кіно» з Кірылам Разлогавым. Упершыню на экране фільм Аляксея Германа «Хрусталёў, машыну!»

## ● НТВ

9.20 Сэрыял «Каханьне ўдаўца».
10.15 Леанід Ярмольнік у праграме Паўла Лабкова «Расьліннае жыцьцё».
10.50 Гуляем у «Кено».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.15 Экстрэмальнае шоў «Фактар страху».
12.05 Людміла Зайцава і Алег Яфрэмаў у камэдыі «Добры дзень і бывай!».
13.55 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 Макалей Калкін. «Жаночы погляд» Аксаны Пушкінай.
15.55 Мультфільм «Кот у ботах».
16.05 «Гісторыі паляўнічага на кракадзілаў. Няшчасьце на капытах».
16.30 Элан Аркін і Джэймз Каан у баевіку Рычарда Раша «Ўберагчы да панядзелка».
18.45 Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі-2. Гардзееў вузел».
20.00 «Надоечы». Найлепшыя рэпартажы.
21.30 Майкл Дуглас, Робэрт Дзювал і Барбара Хершы ў фільме «Зь мяне досыць!».

## ● Эўраспорт

18.30 Плаваньне. Чэмпіянат сьвету. Барсэлёна. Паўтор.
21.00 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. U-19. Англія — Чэхія. Ліхтэнштэйн.
22.00 Бокс. Чэмпіянат Эўропы. Паўтор.
23.00 Вэляспорт. Тур дэ Франс. Чатырнаццаты этап. Агляд.
0.5 Матакрос. Чэмпіянат сьвету. Бэльгія.
1.5 Плаваньне. Чэмпіянат сьвету. Барсэлёна.


## Найхарашэйшая кніга году



Пытайцеся кнігу
Ўладзімера Арлова і Зьмітра Герасімовіча
«Краіна Беларусь. Ілюстраваная гісторыя»
ў кнігарнях і незалежных распаўсюднікаў.





Кнігу можна набыць у кнігарнях: у Менску — АКАДЭМКНІГА (пр. Ф.Скарыны, 72), ПАДПІСНЫЯ ВЫДАНЬНІ (пр. Ф.Скарыны, 14), СЬВЕТАЧ (пр. Машэрава, 11), ЦЭНТРАЛЬНАЯ (пр. Ф.Скарыны, 19), ПАЎЛІНКА (пр. Ф.Скарыны, 19) і іншых; у Вільні — AKADEMINE KNIGA (Universiteto g. 4); у Варшаве — GLOWNA KSIEGARNIA NAUKOWA IM. B.PRUSA (Krakowskie Przedmescie, 7).



## 25 ліпеня пятніца

**● БТ**
7.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
7.10, 15.35 Драма «Сын Поля».
8.45 Уступныя іспыты па беларускай і расейскай мовах у вышэйшых навучальных установах.
9.10, 17.10 «Псі-фактар». Сэрыял.
10.05 Сад мары.
10.30 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
10.55 Падарожжа дылетанта. «З гісторыі Жупранскага графства».
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 18.10 «Далікатны ўзрост». Сэрыял.
13.10 Камэдыя «Дзелавыя людзі».
14.35 Пажарнай службе Рэспублікі Беларусі — 150 гадоў. Дак. фільм «Гатоўнасьць 01».
15.20 «Му-му». Мультфільм.
19.05 Камэдыя «Супэрмозг».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 Чэмпіянат сьвету па водных відах спорту. Плаваньне.
23.55 Сэрыял «Экстрэмальныя гісторыі» (ЗША). 5-я сэрыя «Аматары рызыкі».

**● СТВ**
6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Гаджэт і Гаджэціны». Мультсэрыял.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.05, 18.20 «Менск і менчукі».
8.10, 22.50 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: маст. фільм «Атыла, правадыр гунаў», 2-я сэрыя. ЗША.
9.55 «Турпаход».
10.05, 20.30 «Аўтапанарама».
10.20 «Спэцатрад. Тэрміновы выклік». Дак. фільм.
10.35, 14.40 Хіт-момант. Вынікі месяцу.
10.50 «Дыялёг з усім сьветам»: «Шукальнікі золата». Дзёньнік экспэдыцыі ў рэальным часе. 7-я сэрыя.
11.10 «Тэатральныя гісторыі».
11.25 «Шалёны сьвет». Дак. фільм.
12.00 «Віно каханьня».
12.55 «Народ супраць».
13.50, 18.35 «Што сказаў нябожчык». Тэлесэрыял.
15.00 «Кібэр-9». Мультсэрыял.
16.20 Кіно: дэтэктыў «Кальве Шарлоты», 2-я сэрыя.
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.20 «Менск і менчукі».
18.25 «Тэма дня».
20.05 «Рэактыўны бокс».
20.20 «Добры вечар, маленькі».
20.45 Кіно: баявік «Дрэва Джошуа».
23.00 «Навіны СНД».
23.15 Хіт-момант. Прэм'ер-выпуск.
23.40 Кіно: камэдыя «Палоннікі шацунку».

**● АНТ**
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.45 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 «Каралева Марго». Сэрыял.
10.45 «Самі з вусамі».
11.10 Сэрыял «Твінісы».
15.15 Сэрыял «Ваш ход, інспэктар».
16.05 Дак. дэтэктыў. «Скралі маму».
16.30 Маст. фільм «Вецер надзеі».
18.10 Тайны забытых перамог. «Засакрэчаны рэкорд».
18.40 Сэрыял «Герой нашага плямені». 7-я сэрыя.
20.00 Час.
21.00 «Поле цудаў».
22.05 Песьня году. Лета.
23.55 Камэдыя «Паліцэйская акадэмія: Дружынькі на вуліцах». ЗША.

**● РТР**
7.45 Тэлесэрыял «Па імені Барон...».
8.40 Маст. фільм «Ізноў Аніскін». 2-я сэрыя.
10.00, 19.00 Весткі.
17.50 «Аншляг».
18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
19.55 Гала-канцэрт, прысьвечаны 30-годзьдзю Дзяржаўнай цэнтральнай канцэртнай залі «Расея».

**● Культура**
15.00 «Гісторыя Зямлі». Дак. сэрыял. 8-я сэрыя, заключная.
15.50 «Слова і справа». Дак. сэрыял.
16.15 «У сьвеце танцу». «Нарцыс». Фільм-балет.
17.00 «Па дэ дэ — extreme». Дак. фільм.
17.30 Навіны культуры.
17.50 «Бывайце, хлопчыкі!». Канцэрт з твораў Мікаэла Тарывердзіева.
18.40 «Эндзі Пэндзі». Мультсэрыял.
18.50 «Качаня Цім». Мультфільм.
19.00 «Небясьпечныя гастролі». Маст. фільм.
20.25 Блеф-клюб.
21.05 «Лінія жыцьця».
22.00 «Дама ў акулярах, са стрэльбай і ў аўтамабілі». Тэлесэрыял.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Мой лёс». Дак. сэрыял.

**● НТВ**
9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Без рэцэпту».
10.00 «Кватэрнае пытаньне».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Пазьдняковым.
14.35 «Сямнаццаць імгненьняў вясны», 2-я сэрыя.
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога-2».
17.25 «Каманда.ru».
18.00 «Сёньня» зь Міхаілам Асокіным.
18.35 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў. Інфэрна».
19.45 Залатая калекцыя. Камэдыя «Шпіёны як мы».
22.00 Супэрбокс. Артура Гаці супраць Трэйсі Патэрсана.

**● Эўраспорт**
9.30, 14.00 Ралі. Нямеччына. Паўтор ад 24 ліпеня.
10.00, 19.00 Плаваньне. Чэмпіянат сьвету. Барсэлёна. Жывая трансьляцыя.
11.30, 13.15 Каноэ. Аўгзбург. Чэмпіянат сьвету. Жывая трансьляцыя.
12.15 Каноэ. Чэмпіянат сьвету. Слалам. Аўгзбург.
14.45 Вэляспорт. Тур дэ Франс. 18-ы этап. Жывая трансьляцыя.
21.00 Бокс К-1. Гран-пры. Фукуока.
23.00 Вэляспорт. Тур дэ Франс. 18-ы этап. Агляд.
0.15 Ралі рэйд. Гішпанія.
0.45 «Формула». Часопіс.
1.00 Ралі. Нямеччына.
1.30 Аўтагонкі.
2.00 «Спартыўныя машыны». Часопіс.

## 26 ліпеня субота

**● БТ**
7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 «Не зявай!».
8.15 Існасьць. Духоўная праграма.
8.50 «Усё нармальна, мама!».
9.30 Экран індыйскага кіно. «Зводнік». 1-я сэрыя.
11.05 Здароўе. Тэлечасопіс.
11.35 Тэлевізійны Дом кіно.
12.15 Вясёлая сямейка.
12.45 Падарожжа дылетанта. «Жодзіскія храмы».
13.00 Сола для дэбютанта. Сяргей Фалевіч (трамбон).
13.10 Плянэта АРТ.
13.35 «Ёсьць толькі міг...».
14.10 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства».
15.15 «Тайны залатога дракона».
15.35 Камэдыя «Зімні вечар у Гаграх».
17.05 КВК. 1/4 фіналу Эўраліг і.
18.40 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
19.10 Прэм'ера. Мэлядрама «Гатэль «Шанхай».
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Камэдыя «Натуральная бляндынка» (ЗША).
23.20 Чэмпіянат сьвету па водных відах спорту. Плаваньне.

**● СТВ**
7.25 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
7.50 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
8.15 Кіно — дзецям: Інакенці Смактуноўскі і Леў Дураў у фантастычнай камэдыі «Масква—Касыяпэя».
9.40, 19.55 «СТВ-спорт».
9.50 «Рэактыўны бокс».
10.05 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
10.30 «Анфас».
10.45 «Разам».
11.15 «Партрэт у інтэр'еры».
11.30, 20.15 Кіно: маст. фільм «Два капітаны», 6-я сэрыя.
12.45 «Рамонт».
13.05 Кіно: дэтэктыў «Зьнікненьне сьведкі».
15.00 Праект «Адлюстраваньне»: «Япі». Дак. фільм.
16.05 Клюб «Белы папугай». Найлепшае.
17.00 Кіно: камэдыя «Жандар і іншапляняне».
19.30 «24 гадзіны».
21.35 Кіно: драма «Салемскія ведзьмы» (ЗША).
23.40 «Навіны СНД».
0.00 Кіно: драма «Адрас невядомы».

**● АНТ**
8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20, 14.35 Ералаш.
8.25 Грай, гармонік любы!
9.00 Слова пастыра.
9.15 Дзядуля.
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак».
10.30 «Вяртаньне дадому. Аляксандар Абдулаў. Фэргана».
11.15 «Жарт за жартам».
12.10 У.Высоцкі. «Гісторыя каханьня, гісторыя хваробы».
13.40 Прэм'ера. «Забойца авіяносцаў». Дак. фільм.
14.10 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.45 Сэрыял «Цёмны анёл».
15.30 «Усьміхайцеся, панове!». Канцэрт Максіма Галкіна.
16.50 Камэдыя «Дайце кнігу скаргаў».
18.25 Прэм'ера. Камэдыя «Спэцагент Коркі Рамана». ЗША, 2001 г.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
22.00 Баявік «Харлей Дэвідсан і каўбой Мальбара».
23.50 Мэлядрама «Піяніна».

**● РТР**
9.00 «Сам сабе рэжысэр».
9.55 Маст. фільм «Лясны воін» (ЗША). 1996 г.
11.55 «У пошуках прыгод».
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Камэдыя «Шчыра Ваш...». 1985 г.
15.00 Футбол. Чэмпіянат Расеі. «Лякаматыў» (Масква) — «Ротар» (Валгаград). Жывая трансьляцыя са стадыёну «Лякаматыў».
17.00 «Мая сям'я».
18.00 «Аншляг».
19.20 Баявік «Паліцэйскі з Бэвэрлі Хілз-2» (США). 1987 г.
21.25 Маст. фільм «Выратуй і захавай» (США). 2000 г.

**● Культура**
11.30 «Яўген Весьнік. Кур'ёзы, тэатар, кіно, жыцьцё». Перадача 7-я.
12.00 Дзіцячы сэанс. «Дзе ты, Багіра?». Маст. фільм.
13.15 «Прыстасаваны да жыцьця ў прыродзе». «Лес».
13.40 «Партытуры не гараць».
14.10 Да 100-годзьдзя з дня нараджэньня артыста. «Мікалай Чаркасаў».
14.35 «Іван Грозны». Маст. фільм. 1-я і 2-я сэрыі.
17.35 «Рамантыка рамансу».
18.15 «Сфэры».
19.00 «Шчасьліўцаў-нешчасьліўцаў». Тэлевэрсія спэктаклю Тэатру сатыры.
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.50 «Любоўныя прыгоды лэдзі Гамільтан». Маст. фільм.
23.25 Вечары з Аляксандрам Гарадніцкім.

**● НТВ**
9.00 «Кулінарны паядынак».
10.00 «Кватэрнае пытаньне».
10.50 Спорт «Лято 6 з 49».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня» з Кірылам Пазьдняковым.
11.15 Экстрэмальнае шоў «Фактар страху»
12.10 «Выступленьні і пакараньне». Юбілей А.Арканава.
14.10 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
16.00 Камэдыя «Навічок».
18.00 «Зусім сакрэтна. Расейскі легіён».
18.50 Сэрыял у выхадныя. Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі-2. Сьмяротнік».
20.00 «Асабісты ўнёсак».
21.00 Баявік «Пяты элемэнт».
23.35 «Усё адразу!».

**● Эўраспорт**
9.00 Супэргоначны ўік-энд. Часопіс. Паўтор ад 4 ліпеня.
10.00, 19.00 Плаваньне. Чэмпіянат сьвету. Барсэлёна. Жывая трансьляцыя.
11.30 Каноэ. Аўгзбург. Чэмпіянат сьвету. Жывая трансьляцыя.
12.00 Ралі. Нямеччына. Паўтор ад 25 ліпеня.
12.30 Супэргоначны ўік-энд. Чэмпіянат. Спа. Жывая трансьляцыя.
13.30 Каноэ. Чэмпіянат сьвету. Слалам. Аўгзбург.
14.45, 17.00 Вэляспорт. Тур дэ Франс. 19-ы этап. Жывая трансьляцыя.
16.45, 18.30, 20.45, 23.00 Супэргоначны ўік-энд. Жывая трансьляцыя.
21.00 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. U-19. Фінал. Ліхтэнштэйн. Жывая трансьляцыя.
23.30 Тэніс. WTA. Паўфінал. Стэнфард. Жывая трансьляцыя.
1.15 Ралі. Нямеччына.
1.45 Мота Гран-пры. Нямеччына. Спэцыяльны агляд.

## 27 ліпеня нядзеля

**● БТ**
7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.35 Альхімія слова.
8.40 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.05 Экран індыйскага кіно. «Зводнік». 2-я сэрыя.
10.45 Сад мары.
11.15 «Новая калекцыя».
11.35 Лёс чалавека.
12.20 «Усё нармальна, мама!».
13.00 «Ваша лята».
13.40 Сэрыял «Містэр Бін».
14.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства».
15.15 Сьвятыні Беларусі. «Фрэскі Спаса-Праабражэнскага храму ў Полацку».
15.40 Сэрыял «Барацьба за выжываньне».
16.35 Мэлядрама «Кропачка і Антон».
18.25 «Славянскі базар у Віцебску-2003». Вынікі.
19.05 Трылер «Кола» (ЗША).
21.00 Панарама. Падзеі тыдня.
21.45 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.05 Бокс. Бат наймацнейшых прафэсіяналаў сьвету. Пол Спадафора — Леанард Дорын. Трансьляцыя з ЗША.
23.10 Навэла «Анёльскія вочкі» (Ізраіль).
24.00 Чэмпіянат сьвету па водных відах спорту. Плаваньне.

**● СТВ**
7.25 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
7.50 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
8.15 Музычная камэдыя «Аўтамабіль, скрыпка і сабака Клякса».
9.55 «СТВ-спорт».
10.10, 19.35 «Аўтапанарама».
10.30 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
10.55 «Менск і менчукі».
11.00 «Сьвецкая хроніка».
11.10 Арт-экспрэс. Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.25 «Запрашаем паскардзіцца».
11.35 «Філярманічны тыдзень».
11.40 «Плянэта людзей».
11.55, 20.40 «Граф Монтэ-Крыста». Сэрыял (Францыя).
12.45 «Добры дзень, доктар!».
13.05 Кіно: камэдыя «Калі б я быў начальнікам».
15.00 Праект «Адлюстраваньне»: «Камікадзэ». Дак. фільм.
16.05 «Клясыка гумару».
17.10 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
17.40 «Мэтафізіка Пецярбургу».
18.15 «168 гадзін».
19.05 «Пакуль гарыць сьвечка».
19.55 «Асабісты інтэрас».
21.35 «Турпаход».
21.45 «Навіны СНД».
22.05 Кіно: маст. фільм «Валадары стыхій» (Ганконг).

**● АНТ**
8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Ералаш.
8.25 Армейскі магазын.
8.50 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Падарожныя нататкі».
10.30 Пакуль усе дома.
11.10 Дог-шоў.
12.10 Камэдыя «Я крочу па Маскве».
13.40 Ударная сіла. «Марскі разбуральнік».
14.10 Дыснэй-клюб: «Мышыны дом».
14.40 Ток-шоў «Выбар».
15.20 Камэдыя «Адчайны тата».
17.05 Нядзельны «Ералаш».
17.30 Жывая прырода. «Таямнічы кантынэнт».
18.25, 21.10 Творчы вечар Ігара Нікалаева «Мільён прыгожых жанчын».
20.30 Контуры.
22.05 Камэдыя «Паездка ў Амэрыку».
0.15 Рэальная музыка.

**РТР**
9.15 «Гарадок». Дайджэст.
9.45 Маст. фільм «Чалавек, які замала ведаў» (ЗША). 1997 г.
11.15 «Вакол сьвету».
12.05 «Дыялёгі пра жывёл».
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 «Аляксандар Марынэска. Атака стагодзьдзя». Фільм.
14.20 «Пакой сьмеху».
15.20 Канцэрт групы «Любэ».
16.50 Камэдыя «Бінга Бонга» (Італія). 1982 г.
19.20 Праграма «Кубак гумару».
21.05 Маст. фільм «Гангстэры ў акіяне». 1991 г.

**● Культура**
11.30 «Яўген Весьнік. Кур'ёзы, тэатар, кіно, жыцьцё». Перадача 8-я, заключная.
12.00 ГЭГ.
12.15 «Ну, пачакай!». Мультфільмы.
13.15 «Прыстасаваны да жыцьця ў прыродзе». «Жыцьцё ў рыфах».
13.45 Ізноў пласьцінка пяе.
14.10 «Астравы».
14.50 Шэдэўры сусьветнага музычнага тэатру. Опэра Ф.Чылео «Адрыена Лекуўрэр».
17.25 «Алі-Баба і сорак разбойнікаў». Мультфільм.
17.55 Сьмеханастальгія.
18.25 Вечары ў тэатры «Школа сучаснай п'есы».
19.05 «Жыві, жыві, зачараваньне...». Маст. фільм.
20.30 «Былое ў асобах». «Салодкая жанчына смутнага часу».
21.10 «Замкі жахаў». Дак. сэрыял.
21.35 «Культ кіно». «Камень у роце». Маст. фільм.
23.25 «Джэм-5». «Вялікія гітары».

**● НТВ**
9.20 Сэрыял у выхадныя. «Каханьне здаўца», 17-я сэрыя.
10.15 «Расьліннае жыцьцё».
10.50 Гуляем у «Кено».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня» з Кірылам Пазьдняковым.
11.15 Экстрэмальнае шоў «Фактар страху».
12.05 Камэдыя «Больш, чым жыцьцё».
13.55 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
15.55 «Гісторыі паляўнічага на кракадзілаў. Атрутныя зьмеі Аўстраліі».
16.25 Маст. фільм «Чорныя барэты».
18.00 «Сёньня» з Кірылам Пазьдняковым.
18.35 Сэрыял у выхадныя. Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі-2. Нобэлеўскі ляўрэат».
19.45 Фільм тыдня. Драма «Бэн Гур».

**● Эўраспорт**
9.30 Ралі. Нямеччына. Паўтор ад 26 ліпеня.
10.00 Супэргоначны ўік-энд. Чэмпіянат. Спа. Жывая трансьляцыя.
11.00 Мота Гран-пры. Нямеччына. Жывая трансьляцыя.
16.15, 17.00 Вэляспорт. Тур дэ Франс. 20-ы этап. Жывая трансьляцыя.
16.45 Супэргоначны ўік-энд. Жывая трансьляцыя.
19.00 Плаваньне. Чэмпіянат сьвету. Барсэлёна. Жывая трансьляцыя.
21.00 Супэргоначны ўік-энд. Чэмпіянат. Спа.
22.00 Супэргоначны ўік-энд. Чэмпіянат. Спа. Спэцыяльны агляд.
23.00 Аўтагонкі сэрыі КАРТ. Сусьветныя сэрыі. Ванкувэр. Жывая трансьляцыя.
1.00 Ралі. Нямеччына.
1.45 Супэрспорт. Эўропа. Спэцыяльны агляд.
2.15 Супэрбайк. Чэмпіянат сьвету. Эўропа. Спэцыяльны агляд.


# Працягваецца падпіска

**на газэту «Наша Ніва». Падпіску прымаюць ва ўсіх аддзяленьнях пошты, у шапіках «Белсаюздруку».**

Падпісны індэкс 63125



# Беларусізацыя расейскай эканомікі

**Расейскія ўлады абʼявілі вайну вялікаму бізнэсу. Прынамсі, яго частцы. Гэта не абяцае палёгкі Беларусі.**

Днямі быў праведзены дэманстрацыйныператрус галоўнай рэзыдэнцыі нафтавай карпарацыі «Юкас», што належыць найбагацейшаму расейцу Міхаілу Хадаркоўскаму. Пад удар трапіла таксама «Сібнафта». Яе ўладальнік, мільярдэр Раман Абрамовіч, хоча пакінуць Расею. Алігархі наракаюць. Раней такое было ім неўласьціва. Расея «пераадольвае перажыткі» эры Ельцына.

У мінулую пятніцу апоўдні ў штаб-кватэры «Юкасу» ў цэнтры Масквы адбылося тое, што расейцы называюць «маскі-шоў». У офіс уварвалася каля 20 узброеных чалавек у масках. Ператрус доўжыўся некалькі гадзінаў. Прадстаўнікі пракуратуры і міліцыі наведалі таксама рэзыдэнцыю зьвязанага зь «Юкасам» банку «Мэнатэп» і офісы іншага падразьдзяленьня холдынгу — Юрыдычнай фінансавай кампаніі.

Калі асобы ў масках перакульвалі ўсё дагары нагамі ў архівах «Юкасу», у Крамлі прадстаўнікі вялікага бізнэсу выступілі зь вельмі сурʼёзным папярэджаньнем Уладзімеру Пуціну. Наш зямляк Аркадзь Вольскі, старшыня Расейскага саюзу прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў, перадаў гаспадару Крамля ліст, падпісаны кіраўнікамі найбуйнейшых расейскіх холдынгаў. Тыя просяць кіраўніка дзяржавы «стрымаць самавольства сілавых структур». Алігархі папярэдзілі прэзыдэнта, што дзеяньні «бандытаў у пагонах» вядуць да «дэстабілізацыі ў краіне». Алігархі таксама выказалі занепакоенасьць магчымым пераглядам вынікаў прыватызацыі і тым, што «прадпрымальнікі робяцца ў вачах грамадзкасьці галоўным ворагам».




У лісьце няма ніякіх канкрэтных прозьвішчаў, але назіральнікі ў адзін голас сьцьвярджаюць, што прадстаўнікі вялікага бізнэсу выступаюць у першую чаргу супраць вельмі блізкіх да Пуціна асобаў — Ігара Сечына, шэфа пуцінскай канцылярыі, і Віктара Іванова, намесьніка кіраўніка прэзыдэнцкай адміністрацыі, які адказвае ў Крамлі за кадравую палітыку, а таксама супраць старшыні ФСБ Мікалая Патрушава.

Як выявілася, пракуратура і падатковыя службы распачалі шырокую праверку дзейнасьці нафтавай кампаніі Рамана Абрамовіча «Сібнафта», якая ўвосень меркавала зьліцца з «Юкасам», утварыўшы велізарны мэгахолдынг. Пасьля яе Абрамовіч выказаў гатоўнасьць прадаць свае акцыі ў алюміневай кампаніі «Русал» агульным коштам каля 3 млрд даляраў і пакінуць бізнэс, а магчыма, і Расею. Ён дэманстрацыйна набыў сабе футбольны клюб у Брытаніі.

Пуцін на сустрэчы з алігархамі прызнаў, што «ўжываньне занадта рэпрэсійных мэтадаў пры вырашэньні праблем бізнэсу няслушнае». Гэтак Іван Жахлівы запэўніваў баяраў у сваёй падтрымцы, тады як апрычнікі рабавалі іх маёнткі. Тое, што сёньня адбываецца ў Маскве, нагадвае падзеі трохгадовае даўніны, калі Крэмль распраўляўся з уладальнікамі агульнанацыянальных каналаў Уладзімерам Гусінскім і Барысам Беразоўскім. Абодва «мэдыяалігархі» страцілі свае імпэрыі і ўцяклі за мяжу. Тады Крэмль тлумачыў, што толькі спрабуе стрымаць палітычныя амбіцыі алігархаў, якія надта разбэсьціліся за Ельцыным. І грамадзтва ўхваліла дзеяньні Крамля.

Сёньня цэльлю атак зрабіліся кіраўнікі нафтавых кампаній. Але і гэтым разам, відаць, справа ў палітыцы.

Хадаркоўскі некалькі месяцаў таму зьдзівіў маскоўскіх аналітыкаў публічным прызнаньнем, што перад сьнежаньскімі выбарамі ў парлямэнт падтрымае грашыма крытычна настроеную да Крамля партыю «Яблык». Адзін зь яго намесьнікаў паабяцаў не пашкадаваць сваіх мільярдаў на падтрымку камуністычнай партыі, таксама апазыцыйнай. Расейскі вялікі бізнэс заўсёды фінансаваў перадвыбарныя кампаніі розных партый, у тым ліку і апазыцыйных, але звычайна даваў ім сродкі зь «левых касаў» і ціхком. Ніхто не асьмельваўся гаварыць пра гэта публічна, кідаючы адкрыты выклік Крамлю. Адказ Пуціна быў імгненны. Некалькі дзён таму пад арыштам апынуўся адзін з найбліжэйшых паплечнікаў Хадаркоўскага Платон Лебедзеў, які падазраецца ў тым, што дзевяць гадоў таму незаконна прысвоіў акцыі фірмы «Апатыт» на суму звыш 280 млн даляраў.

Акцыя пракуратуры дэманструе пэўную марнасьць укладаньняў у легалізацыю бізнэсу і павышэньне яго празрыстасьці. Менавіта Хадаркоўскі зрабіў максымальныя ўкладаньні такога роду і меркаваў, што будзе адчуваць сябе найбольш абароненa. Аднак пракуратура біла гэтыя намаганьні традыцыйным козырам — абвінавачаньнямі ў падзеях амаль дзесяцігадовай даўніны. За тыдзень «буры і націску» «Юкас», не панёсшы пакуль «ніякіх фактычных страт», згубіў больш за 13% свайго кошту на рынку.

Уяўляецца, што ў Расеі перамагае новая канцэпцыя сацыяльна-эканамічнага ўкладу, імя якой — дзяржаўны капіталізм. Нешта падобнае, толькі пад менш шчырай назвай «рынкавы сацыялізм», даўно выбудоўваецца ў Беларусі, дзе ніякі буйны бізнэс немагчымы без «падтрымкі» таго ці іншага сілавога ведамства. Ідэі дзяржкапіталістычнага пераўладкаваньня Расеі і раней былі не чужыя частцы кіроўнай эліты (Яўген Прымакоў). Яны найлепш рэалізаваліся ў сыстэме кіраваньня электроннымі СМІ: апэратыўнае кіраваньне актывамі і прыбыткамі знаходзіцца ў камэрцыйнай манапольнай структуры («Відэа інтэрнэшнл»), а заснавальнікамі СМІ зьяўляецца дзяржава ці афіляваныя зь ёю структуры. Гарантамі дзяржаўнага кантролю выступаюць дзяржбанкі, якія даюць тэлеканалам крэдыты на нярынкавых умовах. Дзяржкапіталістычная мадэль увесь час прапрацоўваецца і ў сфэры кіраваньня вытворчасьцю ды экспартам узбраеньняў. Нарэшце, у сыравіннай галіне пляцдармам дзяржкапіталізму зьяўляюцца манаполія «Газпрам» і кампанія «Раснафта». А далейшую экспансію дзяржавы павінен забясьпечыць мэханізм канцэсіяў.

А што ж ад гэтых зьменаў Беларусі? Перахоп расейскім урадам кантролю над усімі буйнымі прыватнымі кампаніямі наўрад ці зьменіць шмат у беларускай палітыцы Расеі. Толькі там, дзе раней дзяржапарат дзейнічаў у інтарэсах «прыватных імпэрый», цяпер ён будзе цалкам падпарадкаваны паддзяржаўным холдынгам. Што савою аб пень, што пнём аб саву.

**Франц Субель**

• НАВІНЫ •

## Кучма з Квасьнеўскім у знак прымірэньня

**11 ліпеня 1943 году ў вёсцы Паўлiўцы ўкраінскія нацыяналісты спалілі ў касьцёле каля сотні палякаў.** Столькі ж было забіта ў ваколіцах. Тады АУН-УПА паставіла мэту ачысьціць Валынь ад палякаў. Агулам загінула пад 60 тыс. палякаў, у польскіх акцыях у адказ былі забітыя тысячы ўкраінцаў. Праз 60 гадоў пасьля тых падзей прэзыдэнты Ўкраіны і Польшчы сустрэліся на месцы трагедыі, каб аддаць даніну памяці ахвярам. Лідэры дзьвюх краін узялі ўдзел у каталіцкай імшы, зачыталі сумесную дэклярацыю і адкрылі мэмарыял яднаньня з надпісам: «Памяць, жалоба, еднасьць».

## 9 траўня — сьвята ЭЗ

**Праект эўраканстытуцыі нарэшце прайшоў усе ўзгадненьні.** Эўразьвяз будзе цэнтралізаваны, калі справа датычыцца эканомікі, але яго ўдзельнікі захаваюць вялікую ступень самастойнасьці ў пытаньнях замежнай палітыкі, абароны і падаткаў. У праект канстытуцыі таксама ўключаны палажэньні наконт дзяржаўнай сымболікі Эўразьвязу — сьцягу ды гімну, яго валюты, дзяржаўнага сьвята (9 траўня) і дэвізу («Зьяднаныя ў разнароднасьці»).

## Амэрыка выведзе войскі з ФРГ

**Амаль усе вайсковыя базы ЗША ў Нямеччыне могуць быць ліквідаваныя ці перанесены ў іншыя краіны падчас вайсковай рэформы,** сьцьвярджае генэрал Джэймз Гоўнз, камандуючы амэрыканскімі войскамі ў Эўропе. Выключэньне магло б быць зроблена толькі для авіябазы «Рамштайн», якая выконвае важныя функцыі ў забесьпячэньні апэрацый у Аўганістане і Іраку. Частка салдатаў магла б быць перамешчаная ў Польшчу, Румынію і Баўгарыю.

**ФС**


МАСКОЎСКАЯ ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА САЦЫЯЛЬНЫХ І ЭКАНАМІЧНЫХ НАВУК
(расейска-брытанскі постдыплёмны ўнівэрсытэт)
абʼяўляе шосты конкурс для грамадзян Беларусі на атрыманьне стыпэндыі для навучаньня ў Маскоўскай Школе ў 2003/2004 навучальным годзе
[illegible]
[illegible]

[illegible] Правазнаўства, Сацыялёгія, Сацыяльны мэнаджмэнт і сацыяльная праца, Практычная псыхалёгія, Палітычныя навукі, Мэнаджмэнт у сфэры культуры.
[illegible]
Тэрмін навучаньня ў Маскоўскай Школе 1 год. Выкладаньне вядзецца па-расейску.
Выпускнікі, якія пасьпяхова засвоілі праграму навучаньня, атрымліваюць:
- расейскія дзяржаўныя дыплёмы аб прафэсійнай перападрыхтоўцы па ўсіх праграмах;
- ступені і дыплёмы магістраў Манчэстарскага ўнівэрсытэту (Вялікабрытанія): MA in Sociology, MA in Political Sciences, MSc in Social Work, MA in Counselling, LLM Master of Laws, MA in Cultural Management.

Прыём дакумантаў на конкурс у Менску з 1 ліпеня да 18 жніўня 2003 году.

[illegible]

220030, Менск, вул. Маркса, д.31, пакой 69 (4 пав.)
тэлефон (017) 227-21-75. e-mail: msses@lut.by.
Тэлефоны ў Маскве: (10-7-095) 437-98-86, 434-72-82.
e-mail: applic@msses.ru. Інтэрнэт-сайт: www.msses.ru
[illegible] 21–22 жніўня 2003 году.


СУРОДЗІЧЫ

# Па Караляўцы з Пагоняй

**5 ліпеня ў Караляўцы адбыўся штогадовы Дзень гораду. А 12-й сьвяточныя стракатыя калёны запоўнілі цэнтральны праспэкт. За паўтары гадзіны людзкі паток апынуўся на востраве Кнайпгоф у цэнтральнай частцы гораду, пад мурамі велічнага Катэдральнага сабору, дзе імпрэза працягвалася на падворках і канцэртных пляцоўках.**

У фэсьце бралі ўдзел нацыянальныя дыяспары, у тым ліку і «Беларускае таварыства культуры». Сябры таварыства зь дзеткамі, апранутыя ў нацыянальныя строі, зь бел-чырвона-белымі сьцягамі і велічнай Пагоняй, віталі калінінградцаў. На канцэртнай пляцоўцы завадатарам быў ансамбль таварыства «Тутэйшыя музыкі». Пад віртуозна выкананую полечку альбо кадрылю цяжка было не пусьціцца у скокі і сівому дзядку, і маладусе, якая ў нязмушаных рухах спалучала фольк з досьведам начных дыскатэк. А на падворку ў беларускай гаспадыні для ўсіх знаходзілася «чарка і скварка», пад якія нетаропка цякла бяседа з суседзямі, сябрамі польскага таварыства, што лёгка знаходзяць з табой і супольную мову, і супольную радзіму, бо ўсе яны — нашыя землякі-каталікі, хто з Ваўкавыску, хто з Бабруйску, а хто зь Віцебску. І той прывезены з самой «Польскі» смалец, пад кілішак нашай «Белавескай», паціху вяртаў нас у мінуўшчыну, дзе сваімі былі і вялікі Міцкевіч, і мужны Касьцюшка. І забываецца, як на пачатку шэсьця да 14-гадовага сына кіраўнічкі нашага ансамблю, які трымаў самы вялікі сьцяг, кінуўся нейкі дзядзька ў цывільным: «Мы любим Белоруссию! Это фашистский флаг! Сколько вам заплатил Запад?» Малы не разгубіўся і спакойна прапанаваў: «Скажы што-небудзь па-беларуску». Правакатар схаваўся ў натоўпе.

Забываецца і тое, што ўпершыню ўлады нас наўмысна не «заўважылі» і двойчы падчас шэсьця «забыліся» павітаць беларусаў, хоць узгаднялі ўсіх, нават таджыкаў. Відаць, і Пагоня, і бел-чырвона-белы сьцяг паралізуюць язык нават расейскім чыноўнікам. Застаюцца сяброўскія сустрэчы і надзея на тое, што гэта сьвята ня стане для нас апошнім. У памяці ўсплываюць поўныя хваляваньня словы падзякі нашых землякоў зь «вялікай радзімы» за вольнае паветра, у якім вольна лунае наш сьцяг і наш герб. Дзеля гэтага варта жыць. Жыве Беларусь!

**Адам Каралявецкі**

# Я люблю цябе, Аксана!

**заміж рэцэнзіі на альбом: КРАСКИ. Я люблю тебя, Сергей! Iceberg music, 2003**

Слухаючы музычную прадукцыю поп-праектаў, народжаных у Беларусі, заўсёды ходаюся зь неадчэпнаю думкай: а на якой бы мове яны ўсе сьпявалі б, каб не 14 траўня 1995 г.? Сьпевакі кінуліся пад расейскі парасонік шукаць прыбытку й славы. А мы — каму хоць трошкі баліць за беларускае — як бы махнулі на іх рукою: «Набʼюць гузоў — вернуцца дамоў!»

Гурт «Краски», узьнікшы пару гадоў таму, вельмі шпарка заваяваў постсавецкія прасторы сваімі просьценькімі мэлядычнымі пясьнюлькамі, пад якія можна і паскакаць, і павольна патанчыць, наступаючы адно аднаму на ногі. Ашаламляльны посьпех мог бы ўвадначас закружыць голаў салістцы і аўтарцы песень Аксане Кавалеўскай. Яна б спросту магла кінуць «эту Беларусію» ды настала атабарыцца ў расейскім Бабілёне. Аж не! Вось яна, прыгожая-харошая, на сваёй Радзіме. Усьміхаецца і мовіць з крыўдаю на многіх з нас: «Мы — беларусы і прынцыпова не зьбіраемся зьяжджаць ні ў якую Маскву». Годная пазыцыя. Штаб-кватэра «Красак», аднайменная з гуртам студыя, знаходзіцца ў Менску. Адсюль і ажыцьцяўляецца іхняя поп-інвазія ў Расею. Сьмешна, але «Краски», здаецца, зрабілі тое, што шэсьць зь нечым стагодзьдзяў таму ня здолеў зрабіць вялікі князь Альгерд. Вось толькі мова ў сьпевах расейская. Можа, таму Лукашэнка ў сваім выступе па пытаньнях дзяржаўнай ідэалёгіі Беларусі назваў «Краски» ў шэрагу *истинно-русских* «Стрелок», «Блестящих», «Тату» etc. Чынавенства ледзь не на другі дзень завяло на некаторых удзельнікаў гурту крымінальныя справы. Нібыта за вымагальніцтва. Людзі спрабавалі абараніць свае аўтарскія правы, а ў выніку пацярпелі самі.

Між тым праблемы не перашкодзілі выдаць чарговы альбом пад гучнай назваю «Я люблю тебя, Сергей!». Аўдыторыя, на якую разьлічаныя песьні, — найперш падлеткі й моладзь. Прыкметныя новапіянерскія матывы (кампазыцыя «Летняя песня»), дваровым сюжэцікам надаецца рамантычнага лоску («Пацаны»). Выпускніцаў, абітурыентак і студэнтак Аксана Кавалеўская зь ледзь прыкметнай ironіяй заклікае крыху забыцца пра іспыты ды выйсьці пагуляць на вуліцу («Экзамены»). Але ж вуліца поўная небясьпек: можна закахацца, а потым прасіць прабачэньня ў матулі за тое, што зьнянацку стала «любовь взрослая знакома» («Мамочка моя»). Зрэшты, мама паплача разам з дачушкаю, якая «письмо большое написала папе», але ніхто ня хоча ёй даць яго дакладнага адрасу, а то й наагул цьвердзіць, што «папы нет» («Мне сегодня грустно»). Бясспрэчнай акрасай альбому стала танцавальная вэрсія NRM-аўскіх «Трох чарапахаў», якіх Аксана сьпявае зь нечаканай шчырасьцю. Тым самым яна



Салістка «Красок» Аксана Кавалеўская

дае добры прыклад многім нашым расейскасьпеўным, якія ў адказ на пытаньні пра беларускую мову ў сваёй творчасьці зазвычай лапочуць штосьць пра сваю «искренность». Застаецца спадзявацца, што і назва гурту ўсё ж некалі будзе пісацца па-беларуску «Краскі», бо слова наскае. У перакладзе на расейскую яно было б «цветы». Ня так прыгожа.

**Сяргей Балахонаў**

КАЛЯНДАР

# Прабацька блякбастэраў

**Сёлета ў ліпені самы непрадказальны і скандальны рэжысэр сусьветнага кінэматографу Стэнлі Кубрык адсьвяткаваў бы свой 75-ы дзень нараджэньня. Кожны ягоны фільм быў сапраўднай сусьветнай падзеяй, але разам з тым Кубрык здолеў ня стаць часткай вялікага мэханізму пад назвай «Кінаіндустрыя», увесь час застаючыся па-за межамі маскульту.**

Ужо яго першы фільм «Страх і жаданьне» ў 1953-м быў забаронены, а ў 1961 г. Кубрык наважыўся экранізаваць скандальны раман Уладзімера Набокава «Лаліта». Праз два гады, калі боязь атамнага апакаліпсісу была максымальнай, Кубрык здымае чорную камэдыю пра канец сьвету...

«Кінасьвет Кубрыка вусьцішны, ён замкнёны і адрэгуляваны, бы пякельная машынка», — так выказваўся на пачатку 70-х пра Кубрыка францускі пісьменьнік Франсуа Нурысье. У гэты час рэжысэр ужо стаўся клясыкам сусьветнага кіно і яго шанавалі, як Бэргмана ды Фэліні. Здабыў ён папулярнасьць не на «фабрыцы навау» — пасьля некалькіх зьнятых у ЗША стужак ён зьехаў у Англію. На Альбіёне Кубрык узяўся за стварэньне свайго змрочнага сьвету. Большасьць ягоных фільмаў ня маюць шчасьлівага фіналу і суцяшальных вынікаў: Сьлім Пікенс з «Доктара Стрэйнджлава» ляціць на вадароднай бомбе насустрач сьмерці, Алекс з «Мэханічнага апэльсыну» страчвае ўласную асобу, і г.д. Творчасьць Кубрыка — гэта пасьлядоўнае вывучэньне чалавечай сутнасьці. Нават узяўшы экранізаваць раман Стывэна Кінга «Зьзяньне», ён перамясьціў акцэнты: у кнізе асноўная ўвага скіраваная на містычны гатэль, Кубрыка ж хвалюе найперш чалавек, ён дасьледуе мяжу паміж творчасьцю і варʼяцтвам. Кінгу тая экранізацыя ня надта спадабалася.



Стэнлі Кубрык

Кубрык ладзіў з Часам. Нібыта існавала паміж імі нейкая дамоўленасьць. Кубрык нібыта ведаў, колькі яму дадзена часу на яго працу. Ён апярэджваў час, але пры гэтым не сьпяшаўся. Цяжка даць веры, што фантастычная эпапея «Касьмічная адысэя-2001» зь немагчымымі, падавалася б, на той час спэцэфэктамі, была зьнятая ў 1967 г., а той жа супэрактуальны цяпер «Мэханічны апэльсын», побач зь якім ніякі «Acid House» не стаяў, — у 1971 г.

Кожны ягоны фільм ахутвала аўра таямнічасьці, і цэлая чарада скандалаў вілася за ім. Шмат якія фільмы так і не дайшлі да большасьці гледачоў праз забароны розных дзялкоў, што бачылі ў карцінах зашмат жорсткасьці і гвалту. «У сваёй падсьвядомасьці кожны з нас забойца і гвалтаўнік», — так сьцьвярджаў Кубрык.

Апошні фільм кінамайстра — «Шырока заплюшчаныя вочы» — выйшаў пасьля дванаццацігадовага перапынку, у 1999 г. Перад гэтым Кубрык цягам чатырох гадоў муштраваў выканаўцаў галоўных роляў — сямейную пару Ніколь Кідман і Тома Круза, дабіваючыся ад іх максымальнай натуральнасьці дыялёгаў. Пры канцы здымкаў тыя ўжо не маглі трываць адно аднаго і разышліся. А Кубрык, зьняўшы ў абстаноўцы поўнай сакрэтнасьці гэтую трохгадзінную мэдытацыйную драму, не дачакаўся афіцыйнае прэмʼеры і памёр. Апошняе яго жаданьне было таксама неардынарным і тычылася якраз гэтай стужкі — ён папрасіў паказваць яе ў іншых краінах безь перакладу: «Толькі тытры! Голас перакладчыка не павінен псаваць дыялёгі актораў!»

Уплыў гэтага рэжысэра на кінэматограф XX і нават XXI ст. цяжка ацаніць. Хто ведае, ці існавалі б блякбастэры «Глядыятар» і «Адважнае сэрца», калі б Кубрык не запачаткаваў жанру гістарычнай эпапеі фільмам «Спартак» у 1960 г. А пабачылі б мы «Зоркавыя войны», калі б не «Касьмічная адысэя»? Ня кожны ведае, што кінахіт новага стагодзьдзя — «Штучны розум» па-сутнасьці таксама зьяўляецца фільмам Кубрыка, задуманым яшчэ ў 1969 г. Стывен Сьпілбэрг толькі давёў да завяршэньня задуму Вялікага Стэнлі.

**Сяргей Будкін**

## • НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ •

**Гілевіч Н. ...І плямы на табе няма:** Лірычны раман. — Менск: Тэхналёгія, 2003. — 226 с. 300 ас.

Творы, сабраныя ў гэтай кнізе, ахопліваюць паўстагодзьдзя: першы датуецца 1953 г., апошні — 2003 г. Але дзякуючы агульнай тэме ды прысьвячэньню — жанчыне, побач зь якою паэт быў цягам доўгіх гадоў і безь якой немагчымыя былі б многія ягоныя дасягненьні, — вершы зборніка ўтварылі своеасаблівы лірычны раман. Знайсьці выданьне можна ў «Акадэмкнізе».

**Кірвель А. Сумная кніга пра зьвяроў:** Амаль байкі. — Пецярбург, 2003. — 48 с.

Зборнічак уключае алегарычныя творы пецярбурскага беларуса. Наклад абмежаваны.

**Лескець С. Гасьцінец:** Зборнік першых эсэяў. — Заскевічы—Маладэчна—Менск: Выд. тав-ва «Мястэчка», 2003. — 48 с.: іл.

Гэтая брашура — спроба зусім маладога яшчэ дасьледчыка, гадаванца Беларускага калегіюму, аднавіць гісторыю роднага мястэчка Заскевічы і праз тое лепш зразумець уласныя карані. Успаміны местачкоўцаў, старыя фатаздымкі, факты, расшуканыя ў розных пісьмовых крыніцах, падсьвечваюцца ў кніжачцы шчыраю любоўю аўтара да сваёй малой радзімы, а таму выданьне чытаецца як лірычная аповесьць. Пытайцеся на выставе ТБМ. Наклад абмежаваны.

**Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Менская вобласьць:** Нармат. даведнік / Пад рэд. В.Лемцюговай. — Менск: Тэхналёгія, 2003. — 605 с.

Даведнік адлюстраваў усе наяўныя на 31 сьнежня 2002 г. назвы. Тапонімы падаюцца кірыліцай і лацінкай, а таксама па-расейску. Акрамя таго, прадстаўленыя варыянты рэестравых назваў і страчаныя на сёньня назовы. Цана блізу 23 тыс. руб.

**Скварэц Я. Тры крыніцы:** Аповесьці, апавяданьні. — Менск: Ковчег, 2003. — 96 с. 300 ас.

Кніга Яўгена Скварца — журналіста, настаўніка, мэталаапрацоўшчыка, геоляга — адлюстроўвае багаты жыцьцёвы досьвед аўтара.

**Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 года** / Т.Доўнар, У.Сатолін, Я.Юхо. — Менск: Тэсэй, 2003. — 352 с.: іл.



Тэкст найдасканалейшага ў Эўропе сярэдзіны XVI ст. збору законаў перадрукоўваецца паводле выданьня, ажыцьцёўленага ў 1855 г. «Імпэратарскім Маскоўскім таварыствам гісторыі і старажытнасьцяў Расейскіх». Акрамя ўласна Статуту, у кнізе маецца падрабязны гістарычны й навуковы камэнтар, а таксама тлумачальны слоўнік прававых тэрмінаў. Цана ў «Акадэмкнізе» — амаль 15000 руб.

**Ціханава Г. Фільтры сноў.** — Менск: Логвінаў, 2003. — 126 с. 200 ас.

Зборнік склалі тры разьдзелы: «Фільтры», «Сны Snow», «Сны аднаго дыялёгу» (пʼеса). У кнізе казка сынтэзуецца з будзённаю рэчаіснасьцю, а паэтычныя краявіды, створаныя аўтаркай-мастачкай, насычаныя фарбамі.

**Чыгрын І. Паміж былым і будучым: Проза М.Гарэцкага.** — 2-е выд., выпраўл. — Менск: Беларуская навука, 2003.

Дасьледаваньне празаічнай спадчыны клясыка беларускай літаратуры. Цана 1690 руб.

**Торба: Моладзевы часопіс.** — 2003. — № 1.

Тэма нумару ўкраінскага часопісу — гісторыя. «Торба» зьмяшчае палемічныя, багата ілюстраваныя матэрыялы да 60-х угодкаў украінска-польскага канфлікту на Валыні. Найбольш выбітным матэрыялам нумару зьяўляецца інтэрвію з апошнім камандзірам Украінскай паўстанцкай арміі Васілём Кукам, які знаходзіўся ў падпольлі з 1937-га да свайго арышту ў 1954 годзе. Расьсьледаваньне нумару прысьвечана графу Дракулу: аўтар спрабуе разабрацца, кім ён быў насамрэч — вампірам ці нацыянальным героем.

**Таццяна Вабішчэвіч**

СУБʼЕКТЫЎ

# «Тутэйшыя» ў Беластоку

У насычанай праграме беластоцкіх Дзён гораду знайшлося месца і беларускай старонцы. На спэктакль Гарадзенскага тэатру лялек, калі не лічыць пэрсанальна запрошаных, люду паспалітага сабралася небагата. А рэпрэзэнтавалі ж гарадзенцы «Тутэйшых». Дзея спадабалася. Адзначыў для сябе ня толькі файную гульню актораў, але й дэкарацыі, кожная зь якіх «стрэліла». Нягледзячы на арыгінальнасьць (напрыклад, Здольнік гарадзенцаў больш жывы, чым у Купалаўскім: ён яшчэ й юрлівец), на спэктаклі адчуваецца ўплыў вальнасцэнаўскай «Камэдыі». Ці гэта якая мода?



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У Беластоку Віктара Шалкевіча зразумелі ня ўсе

Публіка пастаноўку гарадзенцаў — з уступнай песьняй Шалкевіча, дзе палякі параўноўваюцца з сабакамі, — сустрэла прыхільна. Але неэмацыйна. Магчыма, прычынай стаўся моўны барʼер: адчувалася, што па-беларуску разумеюць ня ўсе і ня цалкам (праўда, гэты «прабел» часткова кампэнсавала кангеніяльная ігра актораў). Відаць было таксама, што для публікі кантэкст тутэйшасьці быў далёкі, большыня залі не разумела праблемы ў адэкватнай ступені. Прыкладам, калі бальшавік прасіўся прыхаваць яго ад ворагаў, бо, маўляў, «ад сваіх адстаў», да залі прагучала: «Тут паў-Беластоку ад сваіх адстала». Фраза завісла ў паветры, хоць была прызначаная пад гэту пастаноўку. Сапраўды, паў-Беластоку ад сваіх адстала, і далекавата, хоць сёньня палітыкі прымусовай палянізацыі і блізка няма.

**Анатоль Трафімчык**

ПАМЯЦІ БЫКАВА

# Быкаўскі праспэкт

**У адным зь мінулых нумароў «НН» напісала пра тое, што Васіль Быкаў пры жыцьці мог бы, але не зрабіў (не пасьпеў, не наважыўся ці не адужаў).** Лічу, што й пасьля сьмерці гэтага чалавека ягонае імя можа яшчэ шмат чаго зрабіць. Прапаную ў згодзе з сваякамі пісьменьніка ініцыяваць перайменаваньне сама мала праспэкту ці якойсьці магістральнае вуліцы ў Менску ў гонар Васіля Быкава. Маштаб фігуры Быкава мае на ўвазе, каб ягоным імем быў названы менавіта праспэкт, а не якаясь вулка ў новым раёне.

Першы варыянт — праспэкт Дзяржынскага. Варыянт другі — вуліца Прытыцкага. Гэта дастаткова вялікая вуліца, каб называцца вялікім для Беларусі імем. Адным пакетам можна было б і станцыю мэтро «Ракаўская/Спартыўная» назваць імем Быкава, даўшы Паўлаву годны шлях для кампрамісу. Вуліца Прытыцкага — гэта, да таго ж, дарога на Гарадню, дзе Быкаў пражыў шмат гадоў.

Не хацелася б палітызацыі народнае памяці пра Быкава ці абвастрэньня вакол яе грамадзкіх настрояў, таму тытульны й тэкставы фармат ініцыятывы пра перайменаваньне праспэкту ці вуліцы мусіць мець найкарэктнейшы характар.

**В.Карцаў, Менск**

* * *

**На Ваша імя пасылаю словы глыбокага, сардэчнага спачуваньня** з нагоды сьмерці вялікага беларускага празаіка і барца за вольную Беларусь — Васіля Быкава ўсім прыхільнікам яго пісьменства і творчай думкі, усяму беларускаму народу, зь якога вырас вялікі, мудры Васіль!

Як хутка бягуць падзеі! Папярэдні нумар «НН», які дайшоў да мяне ў Варшаву, прынёс радасную зьвестку: народны пісьменьнік Васіль Быкаў — «дома і назусім». Я абрадавалася. Не падумала, што «назусім» можа мець прарочае канчатковае вымярэньне!

А ўсё-такі гэта шчасьце, што пісьменьнік — гонар Беларусі — вярнуўся на Радзіму, што ўтуліць яго родная зямля! Як, на жаль, часта бывае з геніямі, толькі цяпер стане набываць большую папулярнасьць. Кінуцца людзі яго чытаць!

**Эльжбета Смулкова, Варшава**

* * *

**Неаднaзначныя пачуцьці наведалі мяне на сёлетні Дзень Рэспублікі.** Можа, тут уплывае тое, што дзяржаўная ідэалёгія непарыўна зьвязвае яго з днём вызваленьня Менску ад фашыстаў падчас апошняй вайны. Той вайны, пра якую маё пакаленьне ведае з кнігаў Быкава, Адамчыка, Адамовіча. А зь іх вынікае, што, адкуль ні глянь, была яна чужой для беларусаў. Вось і з «Днём Незалежнасьці» атрымліваецца падобна — не сваё сьвята, ня тая дата, ня тая нагода. І не ляжыць душа да гэтага дня, як напрыклад, да Дня Волі, дзе ўсё ў свой час і ў сваю пару.

Аж на цэнтральным праспэкце Рэвалюцыі ў Барысаве да Дня Рэспублікі зьмясьцілі выявы змагароў супраць фашызму. Тут вам і Рак, і Чалоўская, і Лапацін, і менш, а то й зусім невядомыя. Чаму б дзеля гістарычнай праўды не зьмясьціць выявы герояў іншых войнаў ці паўстаньняў? Хоцьбы таго паўстанца 1863 г. барысаўца Трусава. Аж не!

Дзяржаўныя СМІ ўпарта і настойліва называюць 3 ліпеня Днём вызваленьня Беларусі ад фашыстаў. Калі вызваляліся Берасьце, Гарадня, Навагрудак — ім, выглядае, невядома. А мо яно так робіцца сьвядома? Бо не заўсёды жыцьцё на захад ад Менску ўпісваецца ў рэаліі сёньняшняй РБ. Не пасьпелі Заходнюю Беларусь як след русіфікаваць, ня зьнішчылі пад корань прыватнай уласнасьці. З аповедаў сяброў, інтэрнэт-знаёмцаў з Заходняй Беларусі прыходжу да высновы, што яна — асаблівы сьвет, цывілізацыя, адрозная ад маёй.

Я не прыніжаю значнасьці вызваленьня Менску ад захопнікаў, як і значнасьці тых, хто гэта зьдзейсьніў, для гісторыі Беларусі, але аб'ектыўна гэта дата ня можа лічыцца Днём Незалежнасьці. Маштаб не дацягвае.

**Зьміцер Панкавец, Кастрыца (Барысаўскі раён)**

# Адпачывайце ў Беларусі, суайчыньнікі

**Заўсьміхалася ясным сонейкам і доўгачаканым водпускам лецейка яснае.** Закіпелі рознакаляровыя натоўпы ля дзьвярэй турагенцтваў, прывабна застракацелі безабліcнымі мноствам курортных казак. Турцыя, Баўгарыя, Кіпр… Эгіпэт, Крым, Канары…

Крыўда за нас, шаноўныя спадары беларусы! Дажджлівую восень, суровую, бясконцую зіму цярпліва і бясстрашна зьбірае ўмоўныя адзінкі руховая скарбонка-парсючок.

— Мама, хачу бананаў! — стогне на працінутай канапе смаркатае дзіцё.

— Пачакай, мой любы. Вось прыйдуць летнія дзянёчкі… Зьбяром грошы ды паедзем на мора! Убачыш бананы і нават ананасы. Паўднёвы край багаты садавінай ды гароднінай.

«Багаты, багаты…» — у думках уздыхаю я.

Стрэне цябе краіна цудаў, шаноўны беларусе, ня толькі залатымі гронкамі бананаў, але і сур'ёзнымі прастуднымі захворваньнямі, выклікаными рэзкай зьменай клімату. Хіба вялікая ўцеха — кіляграмамі глытаць лекі на паўднёвых берагах? А колькі асалодаў у штодзённым жыцьці губляе сярэднестатыстычная сям'я, зьбіраючы зялёныя паперкі ў кішэні летніх забаваў?

Спадары! Ці выпадала вам шчасьце павольна крочыць сярод замкавых сьцен Міру і Нясьвіжу, агортваючыся салодкай смугой гісторыі? Ці мелі вы ціхую радасьць нясьмела кранаць старадаўня камяні? Глухімі, сінявата-чорнымі начамі яны шапочуць казкі стагодзьдзяў, назаўсёды сьцёртыя з крохкіх старонак гісторыі няўмольнасьцю часу…

Роднае, настоенае водарам чэрвеньскага неба паветра. Дзясяткі кілямэтраў, бясстрашна пераадоленых аўтастопам. Букет сарамлівых васількоў замест пашпарта… Навагрудак. Заслаўе. Слонім. Полацак… Дзьвіна, Нёман, Прыпяць… Прывет табе, сінявокая Беларусь!!!

**Аліса Вольская, list.ru**

* * *

**Я веру. Веру, нягледзячы ні на што і ні на кога.** Нягледзячы на лжывую палітыку вэртыкалі. Нягледзячы на здрадніцкае бязьвер'е і пагарду нібыта-эліты, якая надзею бачыць дзе заўгодна, але толькі не ў Беларусі, толькі не ў беларусах. Але ня будзе Беларусі безь беларуса, ня можа быць.

Я не зьбіраюся выпраўляцца ў Эўропу. Бо я жыву ў Эўропе. Тут мой дом. Крыху разбураны. Што ж, трэба адрамантаваць. Камусьці не падабаецца гэтая краіна, гэты народ, гэты тэмп, стыль, законы жыцьця.

Мабыць, спадарства, гэта папросту ня ваша краіна, ня ваш народ. Вам нават не баліць за яго. Ці балюча вам, спадарства, так, як балюча было Янку, Максіму, Якубу? Кажаце, час ня той? Брахня.

Ня можа палітык крыўдаваць на народ і абвінавачваць яго ў нейкай здрадзе. Палітык можа не разумець сапраўдных жаданьняў народу. І справа тут не ў інтэграцыях з Захадам ці Ўсходам. Ёсьць у нас толькі адна сапраўдная праблема — усьведамленьне сябе як нацыі, якое па-сапраўднаму пачалося толькі ў 90-я. І ў гэтай справе няшмат было зроблена. Бо для ўлады было галоўным — утрымацца, а апазыцыя мела нейкі свой плян адраджэньня, нiяк не прыстасаваны да тагачаснага беларуса.

Яднаньне нацыі, стварэньне нацыі, усьведамленьне сябе беларусамі — на жаль, для палітыкаў гэта праблема другасная. Першаснай застаецца ўлада.

**Андрэй Ананьеў, Гомель**

ГОМЕЛЬСКІ ДЗЁНЬНІК

# Сызмор

**Папулярная лексэма «*маразм*» у слоўніку Ластоўскага перакладаецца гучным і экспрэсіўным слаўцом «*сызмор*».** Гаварыць пра сызмор выпадае часьцяком. Прыкра, калі ў яго абяртаюцца добрыя задумы й справы.

Цяперашні год у нашай дзяржаве ё годам добраўпарадкаваньня. Пра гэта нам нагадваюць ня толькі беларускамоўныя big board'ы, але і сама дзейнасьць адпаведных установаў і арганізацыяў. Вось у апошнім геній добраўпарадкаваньня дае збой, заступаючы месца сызмору. Мяркую па сваім родным Гомелі — рамантаваць дарогі ўначы пры сьвятле пражэктараў у нас яшчэ не навучыліся. Затое добра засвоілі, як неспадзеўкі перакрываць тыя рамантаваныя шляхі, а транспарт пушчаць у аб'езд, як гэта на тыдзень сталася з рознымі часткамі галоўнай вуліцы. На рэакцыю людзей увагі мала зьвяртаюць. А дарэмна, бо адвучаюць такім чынам бачыць патрэбу ў тым, каб уласны горад, як і цэлы край, быў насамрэч прыгожым. Цяпер у людзаў на рознага кшталту добраўпарадкаваньні адна рэакцыя: «Гэта Лукашэнка хутка прыедзе». І дуды вобзем! Глядзіш цяпер на той раўнюсенькі асфальт на Савецкай і дзівішся з калюгаў ды выцерабаў на сумежных малых вулках. А пераяжджаючы Палескі мост, можна пабачыць *падраўняныя* тапалі — гэткія абрубкі-куксы, узьнятыя да неба. А па трасе за Ўваравічамі тое відовішча, дзеля якой колькасьці абкрамсаных дрэваў, яшчэ больш жахлівае. Калі мне гэта здаецца наступствамі чыйгосьці сызморнага нядбальства, дык для некаторых спраў з дрэвамі маю зусім іншае сэнсавае напаўненьне.

Маю на ўвазе зусім не экалягаў, а тую групу гамельчукоў, якія летась спрабавалі папрасіць ва Ўкраіне палітычнага прытулку. Сёлета, па ад'езьдзе аднаго з паплечнікаў у паўночных абшары Расеі, шчыраваць на ніве «борьбы с лукашизмом» ім давודзіцца толькі ўдвох. Гэны дуэт выпрацаваў новую «канцэпцыю», патрабуючы сувора пакараць згубцаў «зеленых насаждений». Маўляў, зьнішчэньне дрэваў у сувэрэннай Беларусі адбываецца наўмысьля, бо ўлады… ствараюць умовы для правядзеньня вайсковых апэрацыяў амэрыканскае арміі, якая не прызвычаілася ваяваць у лясістай мясцовасьці!!! Сызмор натыкаецца на сызмор. І гэныя «новыя зялёныя» спадзяюцца данесьці сваю апінію да шырокіх народных гушчаў, спадзяюцца на цікавасьць да сябе з боку мэдыяў.

З мэдыямі, між тым, у Гомелі адбыўся чарговы «прарыў». Сваё вяшчаньне на наш сонечны горад пашырыла менскае радыё «Б**й». Ці штосьці новае пачула гамялецкае вуха з этэру гэтага FM? Канечне ж не. Калі б ня згадка менскае мікратапанімікі ў рэклямных пярэрвах, дык наагул цяжкавата было б зьлякалізаваць месца трансьляцыі. «Фсё палучится», — гаворыць. Вось і атрымліваецца — у дзень гадавіны нападу фашыстаў рэй вядуць на радыё «Б**й» анэкдоцікі пра Штырліца і партызанаў. Не выключаецца гэткі разбэшчана сызморны барзомэтар і ў дзень пахаваньня Быкава. Дыджэі вітаюць «прысаедзяніўшыйся» Гомель і зачытваюць пэйджынгавыя паведамленьні нібыта з Гомелю, якія нагадваюць прадукцыю бяздарных піяршчыкаў. Вось я думаю, як гэтыя дзядзечкі й цётачкі здолеюць вытрымліваць у сваіх плэй-аркушах квоту ў 50% для беларускае музычнае прадукцыі? Мабыць, будуць стаўляць расейскасьпеўнае «А я цібя выдумал і назвал Беларусьсія». Ці накшталт таго. Але ж і іхныя калегі-канкурэнты таксама ня могуць знайсьці слушнага тору.

Ва ўсім гэтым добрая таблетка патрэбная. Ды дзе ж яе знайсьці? Таму й застаецца, гледзячы на вакольныя праявы сызмору, усьміхацца і ціхенька прамаўляць: «Дай Бог здароўя!».

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

# І ў нас замест людзей вужакі

**Вельмі правільна напісаў Васіль Дубяга** зь Мядзелу пра тое, што апусьцелыя сёлы засяляюць зьмеі. Тое самае ў нас у Заказанцы: дзе гаспадары паўміралі, там заводзяцца вужы.

**А.Карнялюк, Заказанка (Берасьцейскі раён)**




IREX-PROMEDIA

# Як знал, так і напісалі

**Сталічны ўнівэрмаг «Беларусь». Напярэдадні 25-годзьдзя праводзіцца рамонт, інтэр'еру надаецца «нацыянальны» выгляд.** Прадаўцы сэкцыі мужчынскага абутку паказалі «выдатныя» веды матчынай мовы, калі ўзяліся афармляць цэтлікі па-беларуску… У выніку атрымалася: «краска для кожы», «крэм-краска», звычайны пакет перабеларусілі ў «мяшок». На маё пытаньне адказалі: «Как знали, так и написали».

Грамадзяне неаднаразова рабілі заўвагі адміністрацыі, каб выправіла ўсяго парутройку памылак. Вынікам двухтыднёвых «адносін» стала поўная зьмена ўсіх цэньнікаў на расейскамоўныя. Ну ніяк не адважыліся яны напісаць «крэм-фарба», «фарба для скуры».

Упэўнены, што адукаваныя, тыя, каму «ня ўсё адно», ёсьць сярод персаналу. Нехта ж надаў унівэрмагу сучасны выгляд! Тым, хто выконвае абавязкі адміністрацыі (пасады адміністратара ў магазіне няма), параю ў цяжкіх моўных выпадках зьвяртацца ў Таварыства беларускай мовы. І няхай дзяўчаты, якія праводзяць апытаньні пакупнікоў на ўваходах, спытаюць наконт беларускамоўнага афармленьня. Гэта ж усё-такі «Беларусь».

**Кастусь Мікалаевіч, Менск**

# Сеюць бездуш

**Наш горад будаваўся ў савецкія гады.** Цяпер падрасьлі дзеці дзяцей былых будаўнікоў. Вельмі многа моладзі. Работы няма, а ўлада слаба клапоціцца, чым заняць моладзь, і таму маладыя людзі гінуць у злачыннасьці, п'янстве, наркаманіі, разбэшчанасьці. Гарвыканкам не прыцягвае царкваў, партый, прафсаюзаў да працы па ўмацаваньні традыцыйнага хрысьціянскага ладу жыцьця. У горадзе дзеюць тры асноўныя хрысьціянскія канфэсіі — праваслаўная, каталіцкая і пратэстанцкая. Калі да пратэстантаў ходзяць некалькі дзясяткаў маладых людзей, дык у астатніх — адзінкі. Затое на гарадзкіх дыскатэках, у начных клюбах «Monvin», «Амэга» завозна нават у гадавыя хрысьціянскія сьвяты.

А раніцай прыбіральшчыцы выграбаюць горы бутэлек з-пад алькагольных напояў, рэшткі цыгарэтаў, шпрыцы і рэшткі чалавечага сораму дзеля аднаразовай патрэбы.

Аднойчы я падышоў да завуча Чарэйскай сярэдняй школы, дэпутаткі мясцовага савету, і папрасіў, каб яна падпісала ліст аб перарэгістрацыі царквы Хрысьціян Веры Эвангельскай у іх мястэчку. Яна адмовіла, адказаўшы, што ня можа падпісаць як дэпутатка, і ўвогуле беларуская мова паходзіць ад польскай, і гэта сорамна.

Якое манкуртцва, які бездуш сее сучасная ўлада ў галовы моладзі! Што яны будуць пажынаць, як моладзь падрасьце?

**Пятрусь Баравік, Новалукомʼе**

Сюрпрызы «Спадчыны»

# Лісты Сымона Буднага, дзе ўсё-такі каранаваўся Міндоўг і архіўная шпіёнка

**На пачатку 90-х вялікая колькасьць людзей, асабліва моладзі, навярнулася ў Беларушчыну праз якасную, добра ілюстраваную «Спадчыну». За дзесяцігодзьдзе часопіс перажыў некалькі трансфармацыяў — не заўжды сугучных трансфармацыям грамадзкім ды патрэбам часу. Пабыў колькі разоў на валаску ад гібелі. І вось паўстаў перад намі ў новай нечаканай іпастасі. Пра тое, якой мае быць «Спадчына» надалей, — гэтая гутарка з галоўным рэдактарам Аляксеем Хадыкам.**

**«НН»: Чаму часопіс зрабіўся больш «папсовым», чым раней?**

**Аляксей Хадыка:** Чаму папсовым? Папросту раней «Спадчына» рабіла не сваю работу: перадрукоўвала ўжо надрукаваныя архіўныя матэрыялы. Але чытаньне архіўных тэкстаў — занятак спэцыфічны: ён прыцягвае ня тысячу-дзьве чытачоў, а чалавек пяцьдзясят, якія такім чытаньнем павінны займацца.

**«НН»: Але згадзіцеся, канцэпцыя «Спадчыны» зьмянілася. Адбыўся пераход ад бунтаўніцка-рамантычнага духу да бюргерскага.**

**А.Х.:** Гэта вам падаўся такім чацьверты нумар за 2002 г., бо ён прысьвечаны спэцыфічнай тэматыцы — прыватнай уласнасьці. Але ў бліжэйшым нумары ў нас 4 ці 5 артыкулаў, дзе колькасьць спасылак перавышае 50 адзінак: працы расейскіх, польскіх, украінскіх аўтараў, якія актуалізуюць не заўсёды даступныя нам кніжкі. Гэткая колькасьць спасылак — узровень сур'ёзнага навуковага выданьня, а зусім ня «бюргерскага».

**«НН»: Дык чым «Спадчына» розьніцца ад іншых гістарычных выданьняў — «Беларускага гістарычнага часопісу», «Беларускага гістарычнага агляду»?**

**А.Х.:** У нас няма закрытых тэмаў. Да таго ж «Спадчына» заўсёды была часопісам дастаткова эсэістычным і папулярным.

**«НН»: Наколькі новая канцэпцыя «Спадчыны» арыентуецца на падачу матэрыялаў у заходніх традыцыях?**

**А.Х.:** Алесь Белы называе нашым арыенцірам «History Today». Але на савецкай прасторы былі публікацыі А.Гурэвіча, прысьвечаныя гісторыі Сярэднявечча. Яны, бэлетрыстычныя па стылі, былі вельмі зьмястоўнымі і добра афармленымі. Я б хутчэй зьвязаў сёньняшнюю «Спадчыну» з гэтай традыцыяй. Цяпер паводле такога прынцыпу (шмат ілюстрацыяў і небагата тэксту) пішуцца многія заходнія кнігі па гісторыі — тыя ж папулярныя выданьні «Dorling Kindersley». Паводле такога ж прынцыпу ўкладзеная «Краіна Беларусь».

**«НН»: А фармат часопісу чаму зьмянілі?**

**А.Х.:** Такім фарматам, як цяпер, ён выходзіў у сярэдзіне 90-х, калі ў ім было больш прыгожых ілюстрацыяў, спасылак, вынасак... Гэта настальгія па тых часах, калі ў нас быў вялікі наклад (да 10.000). Мы спадзяёмся, што больш якасная паліграфія дазволіць нам яго ўзьняць.

Каб «нагнаць» тэмп, мы будзем вымушаныя ў 2004 г. выходзіць як квартальнік. Фактычна гэта нічога ня зьменіць, бо з 2001 г. выходзілі падвойнымі нумарамі — і так быў квартальнік. Калі нам удасца знайсьці сродкі, каб утрымаць навуковы ўзровень часопісу, ягоную папулярнасьць і не падвысіць цаны, вернемся да 6-разовага выхаду.

Мы будзем пазьбягаць занадта доўгіх тэкстаў: «Спадчына» не літаратурны альманах. Праўда, Аляксандар Фядута прапанаваў нам выдаваць разам штогадовы альманах. Цалкам верагодна, што мы так і зробім.

**«НН»: Цяпер «Спадчына» будзе рабіць тэматычныя нумары?**

**А.Х.:** Калі чырвонай ніткай праз увесь нумар праходзіць пэўная тэматыка, гэта надае большую запатрабаванасьць выданьню, ставіць яго бліжэй да альманаху ці спэцыяльнага зборніка. Будзе нумар, прысьвечаны спадчыне ВКЛ, убачаннай з розных аспэктаў: украінскага, літоўскага, беларускага, польскага. Потым будзе нумар, прысьвечаны музэйнай справе, потым — старажытнай Літве (амаль археалягічнаму пэрыяду)...

**«НН»: А калі казаць пра канкрэтныя матэрыялы?**

**А.Х.:** Адам Мальдзіс абяцае надрукаваць ліст Сымона Буднага, вывезены з Оксфардзкай бібліятэкі. Напісаны артыкул Сяргея Кавалёва пра Андрэя Рымшу і вершаваныя аповесьці, прысьвечаныя ваеннай кампаніі супраць Івана Жахлівага. Прычым С.Кавалёў дадаў і перакладзеную на сучасную мову паэму Рымшы «Дзесяцігадовая вайна», прысьвечаную гэтай кампаніі. Украінскі дасьледчык Мыцык піша артыкул з сантымэнтамі ў бок казачыны, а мы адпаведнымі камэнтарамі аўтарскі тэкст «абсаджваем» з усіх бакоў. А заадно друкуем погляд «зь іншага боку» — лісты Януша Радзівіла.

Вельмі цікавага аўтара мы знайшлі ў амбасадзе Ўкраіны ў Беларусі — першы сакратар пасольства Харышчын. Ён прафэсійны гісторык і займаецца гісторыяй праваслаўнай царквы ва Ўкраіне. Вядома, ён піша зь дзяржаўніцкіх пазыцыяў (паганоў і сам — дыпляматычны работнік), але вывучае той аспэкт, які ў расейскіх і потым у савецкіх дасьледаваньнях замоўчваўся: аўтакефальнасьць украінскай царквы, ейную незалежнасьць ад Маскоўскай патрыярхіі.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ




Аляксей Хадыка абяцае, што ў «музэйным» нумары «Спадчыны» будзе шмат правакацыяў. Таму некаторыя матэрыялы ня ўсе ўстановы хацелі б бачыць надрукаванымі.

**«НН»: Ці будуць у «Спадчыне» друкавацца іншыя замежныя дасьледчыкі?**

**А.Х.:** У беларуска-польска-ўкраінскім нумары адных палякаў будзе трое. Анджэй Рахуба з артыкулам «Палітычныя партыі ў ВКЛ». Ён адзін з найбольш вядомых складальнікаў біяграмаў асобных славутых людзей і цэлых родаў. Гэта вельмі важны аспэкт гісторыі, які ад савецкіх часоў быў на другім пляне, — гісторыя элітаў. Побач — артыкул Анджэя Бараноўскага «Каранацыя абразоў Божай Маці ў ВКЛ». Гэтыя артыкулы адзін аднаго «падтрымліваюць»: адзін піша пра фармаваньне палітычных груповак, а другі — як у той самы час ішла прапаганда мастацкімі сродкамі. Артыкул Міхала Вардзінскага з Варшавы — пра касьцёл сьвятога Міхаіла ў Вільні, галоўную Сапегаўскую ўсыпальніцу, якая паўстала на месцы, дзе быў палац Лява Сапегі.

У «літоўскай» частцы будзе артыкул Томаса Баранаўскаса пра магчымую каранацыю Міндоўга на літоўскіх землях — не ў Наваградку, а глыбока ў Жмудзі. Я пацікавіўся ў літоўскіх гісторыкаў, як яны ставяцца да гэтай гіпотэзы. Ёсьць тыя, хто яе ўхваляе з пункту гледжаньня нацыянальнага патрыятызму: «Сапраўды, там паставілі спэцыяльна шацёр і ўкаранавалі, каб паказаць Ордэну». А некаторыя спэцыялісты казалі: «Надрукуйце — будзеце хоць ведаць, што адбываецца ў нашых дыскусіях».

**«НН»: Тэкст Баранаўскаса — інтэлектуальная правакацыя. «Спадчына» мяркуе зьмяшчаць яшчэ якія-кольвечы працы, «шокавыя» для беларускага чытача?**

**А.Х.:** Шмат правакацыяў будзе ў «музэйным» нумары: некаторыя матэрыялы ня ўсе ўстановы хацелі б бачыць надрукаванымі. «Пратэстанцкі» нумар сам як такі будзе правакацыяй пасьля таго, як дзяржава падпісала пагадненьне з Праваслаўнай царквой. Дастаткова правакацыйным будзе тэкст кіраўніка Міжнароднага культурнага цэнтру ў Кракаве Яцка Пурхлі. Ён дэкляруе канцэпцыю ўлучэньня помнікаў культуры ў плынь жыцьця. Помнік культуры павінен працягваць жыць, працаваць, выконваць свае функцыі.

**«НН»: Тое, што ў Дудутках робяць?**

**А.Х.:** У Дудутках «наватворы», а тут гаворка ідзе менавіта пра аўтэнтычныя помнікі. У нас канцэпцыя, выкладзеная Пурхлем, рэалізуецца ў Верхнім горадзе Менску: стары раён цалкам прыстасоўваецца пад офісы і стаянкі аўтамабіляў. Таму публікацыя можа быць успрынятая як падтрымка ААТ «Стары Менск», якое будуецца ў Верхнім горадзе. Але ў нас рэалізуецца прафанаваны ўзровень, а мусіць быць — сьвядомы!

**«НН»: Польшча, Украіна, Літва… А што наконт Расеі?**

**А.Х.:** У «музэйным» нумары зьмесьцім сэнсацыйны матэрыял Ларысы Тананаевай і Натальлі Мізарнюк пра мастацкі збор Сапегаў і Пацаў, што захоўваецца ў Смаленску. Гэтыя жывапісныя творы смаляне надта не хацелі паказваць, дарма што дырэктарка іх гісторыка-археалягічнага музэю — беларуска з Маладэчна. Яны вельмі баяцца публікацыі: маўляў, палякі ўчэпяцца. Нашыя аўтаркі праніклі туды, сфатаграфавалі — і мы надрукуем цяпер.

«Інтэрвэнцыі» ў тыя сховы рабіліся з 1960-х. Нават я ў студэнцкія гады спрабаваў: не пускалі, казалі, дзяржаўны сакрэт. У 1999 г. Н.Мізарнюк сфатаграфавала гэтыя карціны — з рукі, на каляровую стужку «мыльніцы». Мо зможам калісьці ўбачыць іх у выстаўным фармаце: абмяркоўвалі з дырэкцыяй Смаленскага музэю гэтую ідэю.

**«НН»: Якія яшчэ сюрпрызы рыхтуе «Спадчына»?**

**А.Х.:** У Варшаве ў мяне адбылося цікавае знаёмства з Патрыцыяй Кендзі Грымстэд. Гэта спэцыялістка па архівах, яе на пачатку 90-х у «Літаратурной газете» назвалі «знакамітай архіўнай шпіёнкай». У 1982 г. П.Грымстэд надрукавала «павадыр» па беларускіх архівах, дагэтуль не перакладзены: да апошняга дзесяцігодзьдзя ён быў толькі ў спэцсховах. Увосень зьбіраецца прыехаць у Беларусь: будзе вывучаць дакумэнты, перамешчаныя сюды ў часы вайны з Францыі праз Маскву. Тады да нас трапілі выданьні зь бібліятэкі Пятлюры і славутай Талстойскай бібліятэкі (сярод надта скрадзеных кніг у Нацыянальнай бібліятэцы былі кніжкі адтуль).

**«НН»: А пра што яна піша ў «Спадчыну»?**

**А.Х.:** Пра гісторыю ейных архіўных выведаў. Гэта будзе тэкст, які спалучыць археаграфічны аспэкт з аспэктамі антыкамуністычна-дэтэктыўнай гісторыі.

**Гутарыў Адам Воршыч**

Рыгор Барадулін

# З запазухі

**Працяг. Пачатак у «НН» № 19, 21, 23.**

## А далоні?..

На вушацкі «Прарыў» ня дужа каб густа, але пасыпаліся замежныя турысты. Райкамаўцам хапала клопату арганізаваць масавую сустрэчу гасьцей зь местачкоўцамі. Рэдка хто хацеў ісьці дэманстраваць гасьціннасьць, каб ня мець кантакту з прадстаўнікамі варожага сьвету. Асабліва не жадалі ўсьміхацца немцам, нават з ГДР.

І аднойчы дэлегацыя з Афрыкі. У партыйных кіраўнікоў і селязёнка ёкнула. Правал. Ды нечакана як ня ўся Вушача выйшла й вяла перазагарэлых гасьцей аж да «Прарыву» ўсе шэсьць кілямэтраў. Выявілася, што ўсіх цікавіла: а далоні ў нябачаных у нашых мясьцінах прыяжджанцаў ці чорныя?

## У Нітаву

Вёска Кавалеўшчына да калгасаў стаяла ў лесе. Пад бокам возера Вечальле. Ставала грыбоў і ягадаў, хапала й рыбы. Але трэба была капейка. І кавалеўцы гналі лес сем'ямі. На ўсё лета йшлі ў Нітаву. Так ім чулася Мітава — горад у Курляндыі (палатыску Курземе). Між іншым, дзед Васіля Быкава быў упраўляючым цагельнага заводу ў Мітаве.

Хадзілі ў Нітаву на ўсё лета і шчыруны, і лежуны. Шчырун заробіць нешта, а гультай адасыпіць зь вясны да восені, бакі адлежыць.

І распавядалі кавалеўцы, як гультай вяртаецца зь Нітавы, як яго сустракаюць:

сьвіньня: «Ох, які!»,
варона: «Бурлак»,
верабей: «Чый такі, чый такі?»,
бык: «На булках быў»,
певень, узьляцеўшы на плот: «А х.. пры-ннё-сс!»

## Ня ведаюць...

Кавалеўцы сабіраліся ў Грышчыхі — у маёй бабулі, бо ў яе «лянпа» гарэла, ёй сыны прысылалі грошы. Грышчаняты, як звалі бацькавых братоў і сясьцёр, працавалі ў асноўным у Піцеры.

І паехаў кавалеўскі Дамэнта ў Піцер. Стаў на вуліцы й пытаецца ў пахаджан, ці ня ведаюць яны, дзе Грышчаняты жывуць? Не атрымаўшы ні ад кога адказу, уголас абураўся:

— Ну як гэта ня ведаюць Грышчанятаў з Кавалеўшчыны? У нас іх усе ведаюць.

На шчасьце, невядома якім дзівамналучыўся дзядзькі кавалевец і завёў азяблага, галоднага, пакрыўджанага да Грышчанятаў.

## Зьеў...

Рэйсавы аўтобус Вушача—Менск. Колькі адкалыхаў ён і радасьць, і смутак мой. Вясёла ехаць было да мамы, сумна ад'яжджаць.

Дарога ў нейкія дзьвесьце кілямэтраў. А спыняўся рэйсавы ў Лепелі, у Бегамлі, у Плешчаніцах, у Лагойску.

Асабліва цёплы быў мне прыпынак у Бегамлі — 45 хвілін (як школьны ўрок). За гэты час можна было і закусіць, і выпіць, на колькі грошай ставала. Грэцца налучалася ня толькі акавітай, але й сілай, выцягваючы аўтобус з гурбаў усім гуртам.

Аднойчы ехалі з Вушачы з Іванам Бурсавым. Прыпынак у Бегамлі скараціў. Адно, што засталося нам, — купіць у аптэцы шкляначку, якімі хворым ставяць банькі, і піць зь нязручнага посуду.

Шоферы былі знаёмыя. Білета не бярэш, а плаціш вадзіўцу перад Менскам. Здаралася, калі наляталі кантралёры, выходзіць, ісьці пешкі ўперад, каб цябе потым дагнаў аўтобус.

Шмат вясёлых гісторый бывала.

Па дарозе ўзяў вадзівец цэлую цыганскую сям'ю. Неўзабаве кантроль. Цыганка пачынае тузаць малога, як бы кухталёў даваць:

— Нашто зьеў білеты!

І такі лямант ушчаўся, такі вэрхал, што ўсе пасажыры ўзмаліліся не чапаць цыганкі.

Вядома ж, ніякога білета малы ня еў. Ды цыганская кемлівасьць і грошы пераўзышла.

## Сонейка

Дзяўчына сяброўцы кажа:
— Пайду да свайго соўнейка.
— Чаму соўнейка?
— Лысы ён у мяне.

## Люстэрка

Любіла сьпяваць пра свайго заляцанца закаханая:

Мой каханы лысы, лысы.
Я й ня знаю, дзе падзець.
Як ня буду мець люстэрка,
Буду ў лысіну глядзець.

І лысіну можна скарыстаць, абы кавалер быў.

## Шкляны бацька

Калі нехта засьціў працаваць, у яго пыталіся:

— Ці твой бацька шкляны?

Значыць, і сын шкляны й лічыць, што праз яго праходзіць сьвятло.

## На Дзяды

Наесьціся як на Дзяды — значыць, удосыць.

І выйшла так, што яўрэй абначаваў у сялянскай хаце якраз на Дзяды. Пасьля са страхам распавядаў:

«Толькі я пачаў драмаць, як гаспадар гукнуў:

— Жыд, гу!

А старая, дай Бог ей здароўіка, пачала суцішаць:

— Ці-шшшы.

Ды тут здаравіла сын іхны як гікне:

— Дзяр-ржы!

Я за хатуль ды адтуль».

Пасьля клёцак гаварылі чэравы.

## На сон

Дзеўка, як спаць кладзецца, прыгаворвае:

— Панядзелак з аўторкам, серада з чацьвяргом, пятніца із суботай, а сьвятая нядзелька, а я маладзенька. Сасьніся мне той, хто будзіць мой.

## Ці?..

Вушацкі хлопец млеў па дзяўчыне. А яна ані блізка. Ані на хрыбт да сябе не падпускала. Разжыўся на грошы, купіў дарагіх цукерак. Пайшоў да шаптухі, каб загаварыла цукеркі, прысушыла сэрца непрыступніцы. Усё як трэба зрабіў.

Настала часіна спатканьня. Шчодра частуе дзяўчыну, вымаючы з кішэні заговораныя цукеркі. А тая есьць са смакам.

Чакае, калі ж пачнуць дзейнічаць чары. Ды зь няўцерпу пытаецца:

— Ці чуствуеш ты?
— Чуствую.

Сэрца так і ёкнула, як селязёнка ў жарабка.

— А што ты чуствуеш?
— За вугол хачу.

## Як хто...

Запрасілі адну двойцу на пагасьціны. А жылі і беднавата, і галечавата. Мужык болей піў, чым рабіў. І ў жонкі няма чаго цэлага надзець. А на людзі выйсьці карціць.

Мужык і прапанаваў жонцы выйсьце:

— Я цябе кулём саломы ахіну й пастаўлю ў парозе. Піць і есьці не давядзецца, але ўсё пачуеш і ўбачыш. Адным словам, зь людзьмі пабудзеш.

Так і ўчынілі. Накінуў на жонку вялізны куль саломы, як шалом які. Ідзе гулянка да сіняга дыму. Ды выпітае ж і выліць трэба. Ня ўсім хапае цярпеньня ў двор бегаць. Аблюбавалі куль, ну й паліваюць яго. А мужык скача разам з усімі дый напявае:

Ой лю-лі, ой лю-лі,
Мая жонка ў кулі.
Як гайцалі ды гайцалі —
Усю жонку са..алі.
Хто скача, хто плача…

## Вэтэрынарная дапамога

Марушка ўзгадвала. Пасьля вайны беленькай кабылцы, якую прыгналі зь Нямеччыны, прывязалі венік, каб аваднёў адганяла, а то толькі кукса ў няшчаснай засталася ад хваста. На ёй аралі і ўздзень, і ўначы, хвост адкруцілі, калі падганялі зьнямоглую. Прычэплены венік звальваўся. Тады рукаятку лёну прывязалі, а ўсё ж бакі абабіць.

Самі лечылі, самі калечылі. А калгас то тух, то гас.

## Бо дадому...

Прыйшоў раённы майстар рамантаваць тэлевізар. Доўга порхаўся, пакуль па экране не пабеглі нейкія палосіны. Сяк-так нешта зрабіў. Пытаюся:

— П'еш?
— Толькі на рабоце, бо дадому я мушу прыйсьці цьвярозы...

## Апраўданьне

Калі трапляўся які чарвячок у грыбах, выкідалі, а грыбы елі. Пры гэтым дадавалі:

— Ня той чарвяк, што мы ядзім, а той, што нас зьесь.

## Ня цяжкая...

Трапіў цыган на вячэру пасьля ўбоінаў. Ну й налягае на ласейшае мяса. Гаспадар падсоўвае яму, як вушацкія кажуць, печаньнё-леганьнё дый прапануе:

— Еж, цыган, лёгкае.

А цыган, як не аберуч вывалакшы ладны кавалак, адказвае:

— Дзякуй, мне й кумпячына ня цяжкая.

## Рушаная зямелька дожджыку просіць...

У вушацкую лякарню прывезьлі старога зь вёскі Краснае. На «хуткай». Ляжаў, маўчаў, пакуль трохі не ачуняў. Уколамі й пігулкамі адкачалі чалавека. Павесялеў, бо, відаць, калі быў пры сіле, любіў жыцьцё на ўсю моц.

Успамінаў, прыгадваў, а болей бедаваў, як там старая безь яго па гаспадарцы ўправіцца. А калі хвароба ізноў сьмялела, толькі й казаў:

— Памёр бы, каб ня мучыцца, толькі шкада тых ягнятак...

Унукі ў яго гадаваліся бяз бацькі. А сам хапіў гора як зачарэпнуць. Дый у самыя чорныя гадзіны Бог пасылае ўцеху для душы, каб не адзічэла душа, каб не ўздзiравела.

На пачатку вайны ўзгадваецца, як разбамбілі нямецкія самалёты эшалён. Эвакуяваўся заапарк. І разам з фабзайцамі ўцякаў мядзьведзь, які пасьпеў адвыкнуць ад лесу. Хлопцы сядуць перадыхнуць, а мядзьведзь глядзіць у неба, ці няма самалётаў... Ці далека ўцёк мядзьведзь, дзе тыя сябры-фабзайцы? Здаецца, два вякі мінула. Ня слухаюцца ногі, сэрца пра сябе нагадвае часьцей і часьцей.

— Сэрца як пойдзіць у адпачынак, тады кепска. Як закурыш, усю нуду разаб'еш, час перавядзеш па-добраму... Усё жыцьцё ня так спрытна жылося селяніну...

Гаворыць стары і сам з сабой, і з намі, не клапоцячыся, слухаем яго ці не.

— Калі сячэш дрэва, трэскі далёка не лятуць... Адзін з агнём, другі з вадой — так трэба жыць...

Баліць сэрца ў спаконнага земляроба за зямлю, зьнявечаную й пакінутую.

— Зарасло, занясло ўсё, скора ў хату самі дровы прыйдуць...

Ды і ў сум лякарні да былога веселуна й гулякі заляталі юрлівыя папеўкі. І стомленым голасам сьпяваў, як прамаўляў:

Ой, дзяўчаткі-прыгажуні,
Я вам болі не слуга.
Прытупіўся мой сьвярдзёлак
І сагнуўся, як дуга.

А праз нейкі час, як бы спахапіўшыся, казаў:

— Не да весялосьці, а трэба слухаць, што болька гаворыць, ты ёй падчынаешся...

І так мне ўрадне́ў стары, так вярнуў ён мяне ў даўнія гады, калі яшчэ вольна пачувалася нашая мова сакавітая ды іскрыстая, самавітая ды чыстая, ажно пашкадаваў, што мяне выпісвалі зь лякарні.

Дасюль чуецца мне:

— Рушаная зямелька дожджыку просіць.

Васілю Быкаву ў Фінляндыю напісаў гэтую акрылінку, каб і на яго дыхнула былой нашай Вушаччынай.



**Працяг будзе.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ


### КАНТАКТЫ

**Раісу Жук-Грышкевіч**, Рагнеду Аляхновіч запрашаем «на каву» для карыснай бяседы. Фаіна і Эдуард Тобіны

**Шукаю кантактаў** з патрыятычнымі суполкамі. E-mail: extrim78@tut.by

**ZBSB.org** — сайт Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына». Т.: 289-31-94

**Olsa.by.ru** — сайт беларускай сярэднявечнай музыкі

**СБА «Нашчадкі»** сьвяткуе свой 20-гадовы юбілей. Урачыстае спатканьне — 9 жніўня. Кантактны тэл.: 8-029-753-56-95.

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Паштоўкі зь Менскам** і іншымі гарадамі Беларусі 1900—1930 г. (30 шт.) памяняю на аналягічныя з Гомелем і гарадамі Гомельскай вобласьці альбо прыму ў падарунак (для дасьледаваньня). Т.: (0232) 48-38-91. Аўген

**Куплю Беларускую энцыкляпэдыю** (т.6), Этымалягічны слоўнік беларускай мовы (т.7). Т.: 230-91-53

### ПАКОЙ

**Здыму пакой.** Парадак і аплату (15—25$) гарантую. Т.: 508-83-13 (пасьля 19.00). Андрэй

### ПРАДАМ

**Сокавыціскалку-шаткоўку** «Садовая» (РБ), танна. Т.: 220-25-77

**Нацыянальны атляс** Беларусі. Т.: 230-91-53

### ПРАЦА

**Два вопытныя** журналісты, якія добра ведаюць беларускую мову, шукаюць працу. Т.: (8-01645) 33-4-29

**Пераклад** зь нямецкай мовы на расейскую/беларускую альбо праца, з гэтым зьвязаная (студэнт МДЛУ). Т.: 8-029-758-35-25 (Мікалай)

! Толькі да жніўня ЗЬНІЖКА на відэакасэты **«Пан Тадэвуш»** на 1000 рублёў. А/с 150, 220107, Менск. Пэйдж.: 211-85-85, аб.25402. E-mail: belvidea@hotmail.com



«Дык мы... за Хрыста просім: «Пагадзіцеся з Богам!» — 2 Кар 5:20.

Беларускамоўнае богаслужэньне ў царкве «Ласка Божая» — кожны аўторак а 19 гадзіне. Гурскага, 48

ЗБМ «Беларускі Шлях» запрашае на падарожжа Тураў—Пінск—Клецак—Нясьвіж 26 ліпеня (субота).
Тэл. 232-54-58, 8-029-622-57-20 (Зьміцер).


## КРЫЖАВАНКА



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 4.** Кампазытар, аўтар песень «Родны мой горад», «Карнавал», «Красуй, Беларусь!». **7.** Другі па велічыні горад Эстоніі, дзе загінуў князь Вячка. **8.** Малако, зь якога сэпаратарам «выдаілі» сьмятанку. **9.** Сапраўднае прозьвішча рэпрэсаванага «маладнякоўца» Анатоля Вольнага. **11.** У нас — добрае надвор’е, у расейцаў — любое. **14.** Эратычны францускі танец альжырскага паходжаньня, разнавіднасьць кантрадансу. **17.** Папярэдняя згода ўраду краіны на прызначэньне якогась іншаземца замежным паслом у гэтую краіну. **18.** Лёд у вадкім стане. **19.** Установа, у якой людзі расьпісваюцца. **20.** Працэс ператварэньня чаго-небудзь у прадмет пакланеньня. **21.** Вёска, у якой Кутузаў вырашыў здаць Маскву Напалеону. **22.** Грубая рабочая адзежына. **23.** Прыгожы, у меру ўкормлены мужчына ў поўным росквіце сілаў. З маторам. **25.** Аматар біцьця бібікаў. **27.** Другі пэрыяд кайназойскай эры, у адкладах якога знаходзяцца Жыткавіцкае ды Брынёўскае радовішчы бурага вугалю. **29.** Тэкст, які звычайна гавораць з трыбуны ці перад тэлекамэрай. **32.** Зь яе складзены Мірскі замак. **33.** Даўнейшая назва Верхнядзьвінску. **34.** Буйная сельскагаспадарчая жывёла або вельмі дрэнны чалавек.

**ПА ВЭРТЫКАЛІ: 1.** Другі прэм’ер-міністар за Лукашэнкам. **2.** У некаторых беларускіх дыялектах — пацук. **3.** Горад на поўдні Іраку, за які доўга змагаліся брытанцы. **4.** Маленькая краіна ва Ўсходняй Афрыцы ля вытокаў Нілу, дзе ідзе бясконцая вайна між тутсі й хуту. **5.** Амэрыканскі кракадзіл. **6.** Горад, які мае дачыненьне да Дня беларускай вайсковай славы. **10.** Паводле Маркса — найвышэйшая стадыя разьвіцьця капіталізму. **11.** Адным словам: правыя партыі ды рухі. **12.** Від насьценнай творчасьці, упадабаны незарэгістраваным рухам «Зубр». **13.** Ад сьвечкі — агарак, ад яблыка — ... **14.** Доўгая чарада караблёў або вэрблюдаў. **15.** Задыякальнае сузор’е. **16.** Расейскі пісьменьнік, аўтар зборнікаў «Востраў любові», «Рака Геракліта», «Устань і ідзі». **23.** Пад яго кладуць сякеру, калі хочуць загубіць пятнаццацігадовага капітана. **24.** Штат на захадзе ЗША. **26.** Тое самае, што і «шкляныя пэрлы». **28.** Горад на самым поўдні Гомельшчыны, які раней зваўся Каралін. **30.** Дошка для арытмэтычных вылічэньняў у Старажытнай Грэцыі, Рыме і ў Заходняй Эўропе. **31.** Наркотык, які вырабляюць з маку.

**Склаў Сяргей Петрыкевіч**

### Адказы на крыжаванку з №25

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 5. Наваполацак. 8. «Голад». 9. Лясун. 11. Вакса. 14. Вадарод. 15. Аэробус. 19. Ганімэд. 21. Цьвет. 22. Лінза. 23. Раман. 24. «Зэніт». 25. Сечка. 27. Аклад. 28. Ледавік. 33. Біяпсія. 34. Гаворка. 35. Звада. 38. Аргон. 39. Каран. 40. Пітэкантрап.

ПА ВЭРТЫКАЛІ: 1. Радавод. 2. Спора. 3. Эліпс. 4. Палянэз. 6. Корак. 7. Мурог. 10. Падсьнежнік. 12. Кефір. 13. Нумізматыка. 16. Кавалер. 17. Бэнэфіс. 18. Атрад. 20. Алтар. 26. Варта. 29. Апорт. 30. Гіпофіз. 31. Сабатаж. 32. Золак. 36. Вёска. 37. Домна.

САБАЧЫЯ ГІСТОРЫІ

# Граждан і Сабака на Славянскім базары

**Сабака ішоў** па лужынах і сьпяваў: «Я іду па лужам, мне ніхто ня нужан!» За гэта яго накіравалі на «Славянскі базар». А Граждан усё хацеў яго накіраваць на Эўрабачаньне. Як Тату. Каб ведалі нашых.

**Сабака з Гражданом будавалі** сцэну для «Славянскага базару». Але не хапіла дошак і яны селі абмяркоўваць культурную праграму.

**Увесь год Сабака зьбіраў** грошы, каб паехаць на фэст у Віцебск. А Граждан кожны дзень фэстываліў дома. І хто яго ведае, каму зь іх лепей?

**Граждан і Сабака паехалі** ў заработкі. У летнік. Празь месяц Сабака вярнуўся піянерам. Затое Граждан закахаўся ў дзяцей па-сапраўднаму. Наеў морду, ды яшчэ грошай прывёз.

**Аднойчы Граждан пасадзіў** Сабаку на ланцуг. А на будцы напісаў: «Бяз стуку не ўваходзіць!» Так Сабака стаў Начальнікам.



**Аднойчы Сабака падумаў**, што хвост ім круціць. Пажаліўся Граждану. А той — за хвост ды аб вугал.

**ВВ, Маладэчна**


**«Наша Ніва» запрашае ўсіх ахвотных прадаваць газэту на вуліцах** Менску і ў электрычках. Зьвяртацца на тэлефон 284-73-29; e-mail: nn@promedia.by

**«Наша Ніва» запрашае на працу** фотарэдактара/макетавальніка — чалавека беларускага і настроенага на доўгатэрміновую супрацу. Зьвесткі пра сябе падаваць на электронны адрас nn@promedia.by


## З рэдакцыйнага партфэлю

**Для кланаваньня** вучоныя выкарысталі плод мула, а вынасіла яго кабыла. Паводле іх слоў, вынік экспэрымэнту практычна ўнікальны, паколькі мулы (гібрыды асла і каня) практычна заўсёды бясплодныя.

**Нядаўна** мне трапіла ў вочы рэкляма.

**Антыбеларускі рэжым** працягвае будаўніцтва дарогі і сатанінскага комплексу катэджаў для «новых русских».

**У выніку аварыі** аўтобус перакуліўся дагары нагамі.

## Наша Ніва 1911



**Выйшла факсымільнае выданьне «Наша Ніва: Першая беларуская газэта з рысункамі. 1911 г.».** Цяпер «Наша Ніва» пачатку стагодзьдзя даступная ня толькі ў бібліятэчных падшыўках, але і ў факсыміле. Чытаецца як захапляльны раман выхаваньня. Пытайцеся ў кнігарнях.

## КОНКУРС «НН»

**Ф**арбы **С**онца **Б**оска **З**ьзялі, **Ж**ыцьцёву **А**ўру **Ч**арпалі.

**Аўгіньня Ніна Багінская, Менск**

**Ч**ыж **А**ддаў **Ж**уку **З**агад: **Б**рат, **С**хавай **Ф**отаапарат!

**Андрэй Мельнікаў, tut.by**

**Ч**ым **А**дметна/**П**рыкметна **Ж**ыцьцё **З**накамітага **Б**еларуса **С**карыны **Ф**ранцішка?

**Ч**аму **А**рляняці/**П**арсючку **Ж**ывецца **З**дарава? — **Б**о **С**ябры **Ф**айныя.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Мазырскаму студэнту.** Ваш ліст, на жаль, спазьніўся. Але пішэце нам яшчэ пра тое, што Вас турбуе.

**Вікторыі Б. зь Берасьця.** Вашую прапанову друкаваць больш прозы ўлічым. Што да канкрэтных імёнаў, дык У.Ягоўдзік ды Я.Сіпакоў нам сваіх твораў пакуль не прапаноўвалі.

**Алесю Г. з Барані.** Маеце добры ясны стыль. Пісалі б Вы ў «НН» стала. Але ў сваіх разважаньнях зьвяртайцеся да актуаліяў, да канкрэтных падзеяў, што адбываюцца ў краіне сёньня.

**Дзянісу С. з Магілёва.** Усё адно падпіскаю газэта абыходзіцца таньней. Што да адпачынкаў, дык бязь іх Рэдакцыя працаваць ня можа.


Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ______________________________

Імя і прозьвішча ______________________________

Адрас, тэлефон ______________________________



Наша Ніва
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Сяргей Ёрш |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**.

Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.

Наклад 3473.

Нумар падпісаны ў друк 16.07.2003.

Замова № 3638.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а